WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 ЛІСТАПАДА 2009 г.
СУБОТА
№ 221
(26579)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА АДОБРЫЎ ПРАПАНОВЫ ПА КАРЭКТУРЫ ГЕНПЛАНА МІНСКА

ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка адобрыў падыходы па карэктуры генеральнага плана Мінска і пагадзіўся з прапанаванымі планамі будаўніцтва новага шматфункцыянальнага комплексу з гасцініцай у рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі. Аб гэтым ішла размова ў час даклада кіраўніку дзяржавы аб перспектывах развіцця беларускай сталіцы.

У ходзе даклада адзначалася, што ў генплане Мінска ўлічаны пажаданні мінчан, якія ўдзельнічалі ў абмеркаванні гэтага дакумента.

Што датычыцца падрыхтоўкі да маючага адбыцца ў 2014 годзе чэмпіянату свету, то да гэтага часу ў беларускай сталіцы павінна адбыцца нямала пазітыўных змен, каб дастойна прыняць немалую колькасць гасцей. У прыватнасці, адным з такіх аб'ектаў, які павінен упрыгожыць беларускую сталіцу, павінен стаць шматфункцыянальны комплекс з гасцініцай, яго плануецца пабудаваць ужо ў 2013 годзе. Ён размесціцца на ўчастку ў межах праспекта Незалежнасці — вуліцы Янкі Купалы — ракі Свіслач, непадалёк ад цырка.

Паводле слоў прадстаўнікоў групы кампаній «Кемпінскі», якія будуць займацца ўзвядзеннем комплексу, новыя будынкі прадоўжаць забудову праспекта Незалежнасці, пры гэтым фарміруючы цікавую пешаходную прастору паміж вуліцай і дамамі. Фасады будуць выкананы ў традыцыйным стылі цэнтральных праспектаў горада з асаблівым акцэнтам на дэталі з натуральнага каменю, што створыць унікальную архітэктурную кампазіцыю. Асаблівая ўвага будзе нададзена арганізацыі набярэжнай для адпачынку гараджан.

Прэзідэнт запатрабаваў, каб будаўніцтва вялося якасна, з выкарыстаннем самых сучасных экалагічна чыстых матэрыялаў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што пачынаючы са студзеня наступнага года да якасці будаўніцтва будуць прад'яўляцца асаблівыя патрабаванні — яно павінна весціся ў адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі.

Вакол Мінска плануецца пабудаваць другую кальцавую аўтадарогу, якая злучыць магістральныя напрамкі Масква — Берлін і Вільнюс — Кіеў. Адпаведная прапанова была адобрана Прэзідэнтам Беларусі ў час даклада. «Другое кальцо абавязкова патрэбна, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, — але гэты праект неабходна дэталёва пралічыць, каб гэта была вельмі перспектыўная, сучасная аўтадарога, якая адпавядае самым высокім стандартам. Нешта накшталт аўтабана».

Паводле слоў Прэзідэнта, будаўніцтва новай дарогі істотна дапаможа разгрупаваць нагрузку транзітных грузавых патокаў, вынесці лагістычныя цэнтры за межы горада, а таксама пазбавіць горад ад празмернай загазаванасці.

Галоўны архітэктар Мінска Віктар Нікіцін далажыў кіраўніку дзяржавы, што на першым этапе плануецца будаўніцтва паўкальца даўжынёй 50 км, якое злучыць абодва магістральныя напрамкі.

У перспектыве ўезд іншагародняга транспарту ў Мінск можа быць абмежаваны з тым, каб разгрузіць насычаны аўтамабільны рух у сталіцы, сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як паведаміў галоўны архітэктар горада Віктар Нікіцін, імклівае павелічэнне ў Мінску аўтатранспарту прыводзіць да праблем на вуліцы як з транспартнымі пробкамі, так і забруджваннем паветра.

Вопыт развіцця мегаполісаў у свеце сведчыць аб тым, што транспартная праблема павінна вырашацца своечасова. Як адзін з магчымых варыянтаў вырашэння гэтага пытання ў Мінску на перспектыву — некаторыя абмежаванні ўезду іншагародняга транспарту.

У выпадку прыняцця такога рашэння трэба будзе стварыць адпаведную інфраструктуру на ўездзе ў горад. У прыватнасці, размова ідзе аб стварэнні аўтамабільных стаянак, а таксама аб забеспячэнні добра наладжанага руху гарадскога транспарту.

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што пры гэтым усё павінна быць зроблена з максімальнымі выгодамі для людзей: «Для чалавека гэта павінна быць зручна — прыехаў, пакінуў аўтамабіль на стаянцы, прычым за невялікія грошы, і без праблем паехаў у горад на грамадскім транспарце».

Разам з тым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што будаўніцтва аўтамабільных развязак у горадзе ўсё роўна не пазбегнуць, іх давядзецца будаваць. У ходзе даклада размова ішла таксама аб пытаннях вынасу за межы горада прамысловых прадпрыемстваў. Не павінна адбыцца так, каб вынесеныя за межы Мінска прампрадпрыемствы праз некалькі гадоў зноў апынуліся ў межах горада. Размова ішла аб тым, каб распрацаваць дакумент, у якім будзе дакладна вызначана, як разгрупаваны па краіне прадпрыемствы.

Насельніцтва Мінска павінна прырастаць пераважна за кошт гарадоў-спадарожнікаў, падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі. «Сталіца патроху, зразумела, будзе ўшчыльняцца, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Але Мінск асабліва не ўшчыльніш, гэта 2-3 тыс. чалавек — не больш».

Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што недапушчальна аддаваць пад забудову ўрадлівыя worныя землі. «Такія землі могуць быць задзейнічаны пад будаўніцтва ў самых выключных мэтах, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Зямля — гэта наша галоўнае багацце. Прадукцыя, якая будзе вырашчана на тэрыторыях унутры Мінска, будзе вельмі запатрабавана, гэта вельмі выгадна». Аляксандр Лукашэнка дадаў, што на такіх землях можна стварыць прадпрыемствы сельскагаспадарчага прызначэння, якія забяспечаць мноства рабочых месцаў. Ён запатрабаваў, каб гарадскія ўлады распрацавалі алгарытм выкарыстання высакаякасных worных зямель, які быў бы ўнесены ў Генеральны план горада Мінска.

Прэзідэнт таксама мае намер даручыць Савету Міністраў прапрацаваць пытанне аб фарміраванні плана эфектыўнага размяшчэння прамысловых прадпрыемстваў, якія будуць вынесены за мяжу горада. Згодна з карэктурай Генеральнага плана Мінска (зацверджаны ўказам Прэзідэнта ў 2003 годзе), запланаваная колькасць насельніцтва беларускай сталіцы складае 1 млн 900 тыс. чалавек пры тэрміне да 2030 года. У бліжэйшы час чакаецца стварэнне новых жылых мікрараёнаў у гарадах-спадарожніках. У тым ліку плануецца ўвесці ў 2011 годзе жылы раён у Смалявічах, прапрацоўваецца аналагічны праект для Заслаўя.

Новы высакакласны футбольны стадыён на месцы цяперашняга стадыёна «Трактар» (каля Партызанскага праспекта) павінен быць пабудаваны ў Мінску да канца 2013 года, заявіў Прэзідэнт Беларусі. «Гэта павінен быць стадыён на 45 тыс. месцаў. І ён павінен адпавядаць сусветным стандартам», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Плануецца, што кошт праекта складзе каля 100—120 млн еўра. На стадыёне будуць трыбуны крытага тыпу, што адпавядае прынятым еўрапейскім нормам. Што датычыцца стадыёна «Дынама», то яго пакінуць адкрытым, пры гэтым правядуць рэканструкцыю, ачысцяць тэрыторыю стадыёна ад гандлёвых аб'ектаў і створаць аб'екты грамадскага харчавання. Акрамя таго, па перыферыі стадыёна плануецца пабудаваць залы для некаторых відаў спорту. Таксама будзе абноўлена сістэма асвятлення стадыёна «Дынама». Вакол «Дынама» да 2014 года запланавана будаўніцтва некалькіх высакакласных гасцініц.

Прэзідэнт запрашае шведскіх бізнэсменаў да актыўнага супрацоўніцтва

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы сказаў на сустрэчы са старшынёй Міжнароднага савета шведскай прамысловасці Эрыкам Белфраге.

«Нам патрэбны пэўныя праекты, дзелавыя кантакты паміж кампаніямі, асобнымі бізнэсменамі, а калі будзе жаданне, то і на ўзроўні дзяржаў па любых тэмах», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да шведскага боку з прапановай рэкамендаваць дзесятак ці паўтара бізнэсменаў, якія былі б зацікаўлены ў рабоце ў Беларусі. «Мы маглі б арганізаваць дзелавы савет і пачаць працаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што ў Беларусі ёсць такія формы супрацоўніцтва з бізнэсменамі іншых краін. Да таго ж шведскаму бізнэсу даўно вядома наша краіна.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў Беларусі ёсць вялікі інтарэс да Швецыі, і не толькі ў сацыяльнай сферы. «Мы шмат чаму вучыліся ў вас і многае перанялі. Хоць вы нас і крытыкуеце за асобныя пытанні, але вучыліся мы ў вас», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу на падабенства эканомік дзвюх краін і каласальны вопыт шведаў, асабліва ў інвестыцыйнай сферы.

«У нас ёсць перспектывы супрацоўніцтва са Швецыяй. Мы гатовы да абмеркавання любых пытанняў з вашай краінай, — сказаў Прэзідэнт. — Швецыя не прад'яўляе дадатковых патрабаванняў, гэта вельмі важна для нас».

У сваю чаргу Эрык Белфраге адзначыў добрыя традыцыі Беларусі ў галіне арганізацыі прамысловай вытворчасці. На яго думку, у Беларусі і Швецыі ёсць шэраг магчымасцяў, якія варта выкарыстоўваць і развіваць у адносінах паміж краінамі і бізнэсменамі. «Лічу, што бізнэс з'яўляецца тым аспектам супрацоўніцтва, які выгадны абодвум бакам. Гэта той шлях, які дае магчымасць асвойваць новыя рынкі, арганізоўваць доўгатэрміновае супрацоўніцтва паміж бізнэсменамі», — сказаў Эрык Белфраге.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ПЕРШАЯ ЗОРКА СТАЛІЦЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Электраманцёры ўнітарнага прадпрыемства «Спецгарсвятло Спецраён №1» Андрэй Бражаловіч і Вадзім Кірыенка зманціравалі першую святлодыёдную зорку на навагодняй ёлцы, усталяванай на сталічнай плошчы Незалежнасці.

Беларускім малочным прадуктам адкрыта акно ў Еўропу

«Верхнядзвінскі масласырзавод» першым у краіне атрымаў сертыфікат адпаведнасці патрабаванням Еўрасаюза па якасці і бяспечнасці прадукцыі — цвёрдых і паўцвёрдых сыроў. Як адзначылі ў размове з карэспандэнтам «Звязды» прадстаўнікі арганізацыі, якія праводзілі спецыяльнае даследаванне стану прадпрыемства, верхнядзвінскі завод прайшоў сур'ёзную праверку. У прыватнасці, былі зробленыя розныя заўвагі, каб палепшыць арганізацыю вытворчасці, санітарны стан і г.д. Эксперты з Літвы адзначылі, што такую ж працэдуру праходзяць усе вытворчыя прадпрыемствы, якія хочуць прадаваць прадукты харчавання ў Еўрасаюзе. Як адзначыў **дырэктар арганізацыі «LST Sert» Стасіс БРЭНЦЮС**, даследаванні праводзіліся на працягу некалькіх месяцаў «у вельмі насычаным рэжыме».

Цяпер атрыманы сертыфікат будзе дзейнічаць на працягу трох гадоў, штогод будуць праводзіцца пацвярджальныя аўдыты. Як адзначыў **міністр сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусі Сямён ШАПІРА**, верхнядзвінскае прадпрыемства — гэта «першая ластаўка». На падыходзе — атрыманне аналагічнага сертыфіката і іншымі беларускімі прадпрыемствамі. У прыватнасці, на ўваход на еўрапейскі рынак прэтэндуюць гандлёвыя маркі «Савушкін прадукт», «Бабулін гладыш» і іншыя. Міністр падкрэсліў, што цяпер беларускім вытворцам яшчэ трэба будзе атрымаць спецыяльныя ветэрынарныя нумары, як гэта прынята ў Еўропе для ўсіх вытворцаў прадуктаў харчавання. Можна адзначыць, што менавіта верхнядзвінскае прадпрыемства стала першым у рэспубліцы, якое хутка можа заваяваць рынак Еўропы, дзякуючы таму, што з дзяржаўнага бюджэту было выкарыстана на мадэрнізацыю і тэхнічнае пераўзбраенне прадпрыемства больш за 28 млрд рублёў.

Паводле слоў **генеральнага дырэктара Віцебскага канцэрна «Мяса-малочныя прадукты» Віктара СЛАВЕЦКАГА**, пашыраецца рынак збыту прадукцыі. Цяпер яна адпраўляецца ў 25 краін (на дзесяць больш, чым раней). Сярод «навічкоў» — Кітай, Сірыя, Венесуэла. Прапрацоўваюцца пытанні збыту ў Польшчу і Латвію. Падчас цырымоніі ўручэння сертыфіката адзначалася, што выхад на еўрапейскі рынак зусім не азначае, што ад гэтага пацерпяць расійскія спажыўцы. Усе абяцаныя пастаўкі будуць працягвацца.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота БЕЛТА.

Стасіс БРЭНЦЮС (справа) уручае сертыфікаты дырэктару завода Пятру ЛАЎРЫНАВУ.

Антыкрызісная эканоміка

У два разы можа быць зменшаны падатковы ціск для экспарцёраў, што прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання

Міністэрства эканомікі падрыхтавала прапановы па змяненні ўмоў спрошчанай сістэмы падаткаабкладання, заявіў учора на брыфінгу **Дзмітрый КІЙКО, намеснік начальніка ўпраўлення бюджэтна-падатковай палітыкі Міністэрства эканомікі**. Па яго словах, сёння спрошчаная сістэма падаткаабкладання запатрабаваная — ёй карыстаюцца больш за 70 тыс суб'ектаў малога і сярэдняга бізнэсу. Але каб падключыць бізнэс яшчэ і да нарошчвання экспарту, былі падрыхтаваныя змяненні ва Указ Прэзідэнта ад 9 сакавіка 2007 года № 119:

— Прапануецца знізіць стаўку падатку для арганізацый і ІП, якія прымяняюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання ў частцы экспарту тавараў, — сказаў Дзмітрый Кійко. — Яе памер складзе 3 % ад выручкі рэалізуемых на экспарт тавараў, то бок падатковы ціск знізіцца больш чым у 2 разы.

Па словах Дзмітрыя Мікалаевіча, праект змяненняў ва ўказ прайшоў усе неабходныя ўзгадненні і накіраваны на разгляд кіраўніку дзяржавы. Таксама запланаваныя змены і па наёмных працаўніках:

— У рамках гэтага ж праекта прапануецца даць права арганізацыям наймаць да 15 чалавек наёмных працаўнікоў у сферы рознічнага гандлю і грамадскага харчавання. Гэтая лічба павялічыцца з 5 наёмных працаўнікоў і дазволіць арганізацыям выплачваць падатак з валавога даходу, а не з аб'ёму валавой выручкі.

Таксама Дзмітрый Кійко нагадаў, што з 1 студзеня 2010 года плануецца ўвесці ў дзеянне Асаблівую частку Падатковага кодэкса:

— У яго рамках будзе рэалізаваны такі важны напрамак, як адмена абаротных падаткаў, што дазволіць павысіць канкурэнтаздольнасць беларускіх тавараў на ўнутраным і знешнім рынках, прадпрыемствам — праводзіць больш гнуткую палітыку, бо будзе меншы ціск на цэны, — паведаміў журналістам Дзмітрый Кійко. — Таксама мяркуецца змяніць прынцып уліку затрат пры падаткаабкладанні прыбытку. Калі сёння мы жорстка рэгламентуем тыя затраты, што адносяцца на сабекошт, то ў рамках Асаблівай часткі Падатковага кодэкса прынцып ад зваротнага: дазволена ўсё, што не забаронена. Будзе вызначаны пералік затрат, якія не ўлічваюцца пры падаткаабкладанні, а адпаведна ўсе астатнія затраты будуць памяншаць падатковую базу па прыбытку.

Акрамя гэтага, мусіць быць адменена нармаванне затрат на рэкламу, маркетынгавыя даследаванні і кансультацыйныя паслугі, а таксама запланавана зніжэнне стаўкі падатку на прыбытак у адносінах да дывідэндаў з 24 % да 12 % (для фізічных асобаў — з 15 % да 12 %).

Што датычыцца падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ), то пытанне пра яго павышэнне з 18 % да 20 % яшчэ не вырашанае.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЗНОЎ БУДЗЕ ЦЁПЛА І ДАЖДЖЛІВА

У выхадныя Беларусь застанецца пад уплывам вільготных паветраных мас, якія паступаюць з Антлантыкі, таму будзе пераважаць воблачнае надвор'е, паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

У нядзелю, з ростам атмасфернага ціску, ападкаў не чакаецца. Толькі ноччу па паўночным усходзе пройдуць невялікія дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі згусціцца туман. Удзень тэмпература будзе ад 3 градусаў цяпла па паўночным усходзе да 10 градусаў цяпла па паўднёвым захадзе.

У пачатку наступнага тыдня атлантычныя цыклоны, якія перамяшчаюцца праз скандынаўскія краіны на ўсход, будуць падтрымліваць у нашай краіне цёплае, але дажджлівае надвор'е. Начная тэмпература паветра ў асноўным будзе складаць нуль — плюс 7 градусаў, а ў дзённыя гадзіны — ад 3 да 8 градусаў цяпла.

БЕЛТА.

ЧАРГОВЫ ТРАНШ — $700 МІЛЬЁНАЎ

Рэалізацыя Беларуссю эканамічнай праграмы, у аснове якой ляжыць пагадненне аб крэдыце «стэнд-бай», з'яўляецца станоўчай, паведамляе дэпартамент знешніх сувязяў Міжнароднага валютнага фонду. Таму місія МВФ, якая знаходзілася ў рэспубліцы, дасягнула пагаднення з беларускімі ўладамі аб прадастаўленні чарговага транша крэдыту «стэнд-бай».

У снежні выканаўчы савет дырэктараў МВФ будзе прымаць канчатковае рашэнне аб выдзяленні нашай краіне ў рамках праграмы каля 700 мільёнаў долараў ЗША. Што датычыцца дасягнутай дамоўленасці бакоў у адносінах макраэканамічных паказчыкаў налета, то прадугледжваецца, што асцярожная падаткова-бюджэтная і грашова-крэдытная палітыка дазволяць скараціць дэфіцыт рахунку бягучых аперацый і знізіць узровень інфляцыі да адназначных велічынь. Грашова-крэдытная палітыка будзе па-ранейшаму накіраваная на падтрыманне даверу да рэжыму абменнага курсу.

Ігар ГРЫШЫН.

АДКРЫВАЕЦЦА ГАРНАЛЫЖНЫ ЦЭНТР «СОНЕЧНАЯ ДАЛІНА»

Каб пракаціцца па лядовым жолабе на надзьмутых санках — цюбінгах і пераадолець разнастайныя віражы на санях «Табган», альбо спусціцца са схілаў на горных лыжах ці сноўбордзе, цяпер не трэба выязджаць за межы Мінска. 22 лістапада ў парку «Курасоўшчына», па вуліцы Казінца 81-1 адкрываецца гарналыжны цэнтр «Сонечная даліна». Урачыстасці распачнуцца а 14-й гадзіне. Арганізатары мерапрыемстваў абяцаюць яскравыя забавы і цікавую святочную праграму.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ВЯЛЯЦІЦКАЯ СВЕЧКА

Шануй сваё!

Сёння ў праваслаўных вернікаў Міхайлаў дзень. У вёсцы Вяляцічы Барысаўскага раёна «Святы Міхайла» лічыцца апекуном, і менавіта ў гэты дзень адбываецца абрад пераносу свечкі. Абрад старажытны, пражыўшы нават самыя неспрыяльныя для рэлігіі часы (тады свечку пераносілі па начах). Цэлы год свечка знаходзілася ў доме Валянціны Вайтовіч, і сёння яе па традыцыі ўрачыста перанясуць у дом 49-гадовай Наталлі Шляхоўскай. Але спачатку зладзяць праводзіны з багатым сталом, пранясуць па вуліцы з крыжам і іконаю, сустрэнуць з хлебам-соллю. «Абрад патрабуе захавання, як гісторыка-культурная каштоўнасць», — кажа **дырэктар вясковага СДК Людміла СТАЛЬНІКОВІЧ**. На фотаздымку адзін з момантаў леташняй «Міхайлаўскай свечкі». Ікону і свечку нясуць Юлія ЧАРНЯЎЧЫК і яе брат Павел пры ўдзеле мясцовага святара протаіерэя Фёдара ЧАРЦЯКОВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У БЕЛАРУСІ ДАЗВОЛЯЦЬ ТАНІРОЎКУ ЗАДНЯГА ШКЛА ТРАНСПАРТУ

У Беларусі ў бліжэйшы час дазволяць таніроўку задняга і задняга бакавога шкла транспарту ў адпаведнасці з міжнародным стандартам. Такое рашэнне прыняў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.

На імя кіраўніка дзяржавы паступалі шматлікія звароты з просьбай зняць абмежаванні на таніроўку задняга і задняга бакавога шкла транспартных сродкаў. Прэзідэнт Беларусі даў даручэнне дасканала вывучыць гэта пытанне з улікам міжнародных дакументаў і інтарэсаў грамадства.

Дэталёва прааналізаваўшы меркаванне зацікаўленых дзяржорганаў і пажаданні грамадзян нашай краіны, кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб тым, што ўжо ў самы бліжэйшы час будзе дазволена ўдзельнічаць у дарожным руху транспартным сродкам з заводскай таніроўкай задняга і задняга бакавога шкла ў адпаведнасці з міжнародным стандартам.

Прэзідэнт 20 лістапада даў даручэнне ўраду ў месячны тэрмін прадставіць яму на падпісанне праект адпаведнага ўказа.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнікі ўрадаў краін СНД прынялі Канцэпцыю супрацоўніцтва ў сферы энергетыкі

Яна зацверджана 20 лістапада на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў дзяржаў СНД у Ялце.

У прыватнасці былі падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД у сферы эксплуатацыі міждзяржаўных ліній электрапередачы нацыянальных электраэнергетычных сістэм, аб узгодненым развіцці міжнародных транспартных калідораў, якія праходзяць па тэрыторыях дзяржаў Садружнасці.

Падпісаны рашэнні аб асноўных напрамках доўгатэрміновага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у інавацыйнай сферы. Разгледжана пытанне аб Правілах вызначэння краіны паходжання тавараў. Па выніках абмеркавання падпісаны пагадненне і рашэнне аб Правілах вызначэння краіны паходжання тавараў у СНД.

Кіраўнікі ўрадаў і дэлегацыі ў цэлым абмеркавалі пытанні ўзаемадзеяння ў сферы фінансавых расследаванняў, міграцыйнай палітыкі. Падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне расследавання авіяцыйных здарэнняў з дзяржаўнымі паветранымі суднамі краін СНД.

Таксама падпісаны рашэнні аб фінансаванні ў 2010 годзе Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Канцэпцыі развіцця сацыяльных і медыцынскіх асноў паляпшэння якасці жыцця і прафілактыкі страты працаздольнасці ветэранаў вайны, удзельнікаў лакальных канфліктаў, міратворчых аперацый і ахвяраў тэрарызму ў дзяржавах СНД на 2006—2010 гады, аб выдзяленні асігнаванняў на стварэнне і развіццё аб'яднаной сістэмы проціпаветранай абароны ў СНД у 2010 годзе.

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НАЗВАНА ІМЯ ПЕРШАГА ПРЭЗІДЭНТА ЕЎРАСАЮЗА

Прэм'ер-міністр Бельгіі Херман Ван Ромпей, аднагалосна падтрыманы лідарамі Еўрасаюза, стаў прэзідэнтам Еўрасаюза. На гэтай пасадзе ён прабудзе 2,5 года.

Новым высокім прадстаўніком ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі абраная еўракамісар па пытаннях гандлю брытанская баранеса Кэтрын Эштан. Між іншым, на ўтрыманне «першага прэзідэнта» ў праекце бюджэту ЕС на 2010 год прадугледжана ў агульнай колькасці 25 мільёнаў еўра. З названай сумы 1,5 мільёна еўра прызначаныя на зарплату першай службовай асобе ЕС, а таксама на аплату рознага кшталту прадстаўніцкіх выдаткаў. Яшчэ 4,5 мільёна еўра вылучаюцца на ўтрыманне кабінета прэзідэнта ЕС і забеспячэнне яго асабістай бяспекі. Зарплата «галоўнага еўрапейца» складзе 24 тысячы еўра ў месяц «чыстымі».

ЦАНА НА ТРАНЗІТ РАСІЙСКАГА ГАЗУ ПРАЗ УКРАІНУ ЎЗРАСЦЕ

Плата за транзіт газу праз Украіну павялічыцца для Расіі ў 2010 годзе прыкладна на 60 працэнтаў. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін на прэс-канферэнцыі па выніках перамоваў са сваёй украінскай калегай Юліяй Цімашэнкай у Ялце.

«Плата за транзіт павялічыцца больш, чым плата Украінай за расійскі газ — прыкладна на 60 працэнтаў. Мы да гэтага гатовыя, у гэтым няма нічога асаблівага», — сказаў Пуцін. Расійскі прэм'ер падкрэсліў, што ў наступным годзе перастане дзейнічаць 20-працэнтная зніжка на газ для Украіны, і адпаведна ўзрасце плата за транзіт.

У адказ Юлія Цімашэнка заўважыла, што з 1 студзеня 2010 года Украіна ўпершыню атрымае рынкавы кошт за транзіт газу, прыбытак ад якога для краіны складзе мільёны долараў. Па выніках перамоваў бакі таксама дамовіліся скарэктаваць расійска-ўкраінскія пагадненні ў газавай галіне. Уладзімір Пуцін заўважыў, што пасля афармлення гэтых дамоўленасцяў «ні ў каго ніякіх праблемаў не павінна ўзнікнуць» і «мы сустрэнем Новы год без праблемаў». Акрамя таго, ён заявіў, што «Газпраму» дадзена прамое ўказанне не прымяняць санкцыі да Украіны, маючы на ўвазе штрафы за нявыбарку аб'ёмаў газу. Для таго, каб гэта праблема не ўзнікала і надалей, бакі дамовіліся знізіць кантрактныя аб'ёмы паставак газу на 2010 год, дадаў Пуцін.

У МАСКВЕ ЗАБІЛІ НАСТАЯЦЕЛЯ ХРАМА

На поўдні Масквы ўвечары 19 лістапада адбылося гучнае забойства: злачынец у марлевай павязцы расстраляў настаяцеля храма святога Фамы святара Данііла Сысоева і цяжка параніў рэгента Уладзіміра Стральбіцкага. Пры жыцці святар, вядомы сваёй місіянерскай дзейнасцю, атрымліваў ад невядомых пагрозы, што ён прысуджаны.

Сысоеў быў вядомы актыўнай місіянерскай дзейнасцю, у прыватнасці, дапамагаў пацярпелым ад сектантаў і акультыстаў. «Паводле асноўнай версіі, забойства святара Данііла Сысоева здзейснена на рэлігійнай глебе», — паведаміў кіраўнік следчага ўпраўлення СКП Расіі па Маскве Анатоль Багмет.

Прамая лінія

ВУХА, ГОРЛА, НОС

Пра тое, якія захворванні пагражаюць нашаму ЛОР-апарату і як з імі змагацца мы пагаворым на чарговай «прамой лініі». У ёй возьмуць удзел **загадчыца дарослага сурдалагічнага аддзялення РНПЦ «Отарыналарынгалогія» Ніна Юр'еўна КАСЦЮК** і **загадчыца фаніятрычнага аддзялення гэтага ж цэнтра Наталля Сяргееўна КАНОЙКА**. «Прамая лінія» адбудзецца **25 лістапада з 14.00 да 15.30** у сераду, па нумарах **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.**

Папярэдняе пытанні можна задаваць па тэлефонах **8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.**

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.11.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 732,00
▲ 1 еўра	4 073,41
1 латвійскі лат	5 747,34
1 літоўскі літ	1 178,98
1 чэшская крона	158,51
1 польскі злоты	984,65
▼ 1 расійскі рубель	94,68
1 украінская грыўня	335,83

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	28,8554
UAH	35,2110
1000 BYR	10,5581
EUR	43,0407

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

по продаже имущества ОАО «Белторгстрой», находящегося по адресу: г. Минск, ул. Инженерная, 24.

Лот № 1 — Здание административно-бытового корпуса с инвентарным номером 500/С-27442, общей площадью 655 кв. м, 1980 года постройки, количество этажей — 3, расположенное в г. Минске по ул. Инженерная, 24, окончательной стоимостью с учетом НДС 1 873 427 000 (Один миллиард восемьсот семьдесят три миллиона четыреста двадцать семь тысяч) белорусских рублей. Шаг торгов — 5 процентов стоимости имущества в размере 93 671 350 рублей. Лицо, желающее принять участие в торгах, обязано, не позднее чем за 24 часа до начала торгов, внести на соответствующий счет хозяйственного суда сумму в размере 10 процентов от стоимости продаваемого лота, подать заявку на участие в торгах и дать подписку о том, что нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by.

Торги состоятся 09.12.09 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться к судебному исполнителю тел.: 294 93 65, ф. 294 93 86.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ»

ПРИГЛАШАЕТ ВАС К СОТРУДНИЧЕСТВУ

Располагая аттестованными высококвалифицированными специалистами и государственными лицензиями на соответствующие виды работ:

1. Проекты раздела (вычленения) нежилого капитального строения на отдельные капитальные строения; раздел земельного участка.

2. Проекты раздела коммуникаций (водопровод, канализация, электрические сети и т.д.) по зонам ответственности для организаций, садоводческих товариществ, частных лиц.

3. Установление порядка пользования (владения) земельным участком и домом.

4. Расчет долей, перерасчет долей в связи с изменением капитального строения.

5. Вычленение жилых (нежилых) помещений из капитального строения.

6. Строительно-техническая экспертиза под проводимые перепланировки в квартирах и домах для подготовки проектов по перепланировке.

КОНСУЛЬТАЦИИ БЕСПЛАТНО

ПРОЕКТЫ И ЗАКЛЮЧЕНИЯ соответствуют всем нормативно-правовым требованиям действующего законодательства, отличаются высоким качеством и короткими сроками исполнения.

Адрес: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34 «а» (район Центрального рынка).

Номера контактных телефонов: **(80232) 77 52 78, 77 52 87, 77 48 39.**

Самыя папулярныя пытанні прамой лініі Зянона Ломаця — жыллё і добраўпарадкаванне

З 35 пытанняў, зададзеных старшыні Камітэта Дзяржкантролю жыхарамі Мінска і Мінскай вобласці, больш за палову датычылася будаўніцтва і якасці жылля, дрэнных дарог, нявыкарыстаных будынкаў і г.д.

Зінаіда Мікалаеўна з Мінска ўступіла ў долевае будаўніцтва. Фірма развалілася, а грошы ёй ніхто не вярнуў. Анатоль Пятровіч з вёскі Іканы Барысаўскага раёна скардзіўся, што пасля закрыцця школы карыстацца спартзалай іх дзецям не дазваляюць. Наталля Міхайлаўна расказала, што ў вёсцы Замасточча адсутнічаюць абяцаныя дарожныя знакі і «ляжачыя» паліцэйскія.

Акрамя жыццёвых праблем, былі пытанні і больш глабальнага плана. Бухгалтар Наталля Леанідаўна з Мінска пацікавілася, чаму праграмнае забеспячэнне, якое ўсталёўвае падатковая інспекцыя, для перадачы справаздач па падатках каштуе 320 тысяч рублёў у год. У той час як аналагічная праграма для цэнтра сацыяльнай абароны ўсталёўваецца бясплатна.

Дзмітрый Міхайлавіч з Мінска сцвярджае, што ў ЖКГ горада няма ўмоваў для арганізацыі грамадскіх прац часова беспрацоўных. Па словах Дзмітрыя Міхайлавіча, у ЖКГ няма працы, якую можна выканаць ва ўласным адзенні. Спецыяльнае адзенне не выдаецца, а грошы на яго выдзяляюцца.

На «прамую лінію» паступіла інфармацыя аб магчымых хаўрусніках былога кіраўніка Кастрычніцкага раёна Мінска Міхаіла Цыгана, які прыцягнуты да крымінальнай адказнасці за хабар.

Пытанняў наконт грыпу і эпідэміі, а таксама па забяспечанасці лекамі не ўзнікла. Напярэдадні спецыялісты КДК праверылі 88 аптэк Мінска, а таксама паліклінікі. Па словах Зянона Ломаця, у некаторых з іх лекаў не хапае, але і чэргаў ужо няма, у паліклініках таксама.

Усяго на «прамую лінію» дазванілася 35 чалавек, спробаў «прабіцца» было каля 15 тысяч.

— Пытанні жыццёвыя, але якую выснову можна зрабіць? У шэрагу выпадкаў нашы мясцовыя органы недапрацоўваюць, — каментуе «прамую лінію» Зянон Ломаць. — Гэтыя пытанні не ўзніклі б, калі б старшыні сельскіх выканаўчых камітэтаў, працаўнікі райвыканкамаў, адміністрацый раёнаў гарадоў часцей сустракаліся з насельніцтвам, праводзілі сустрэчы і такія ж «прамыя лініі». Мы перапраўляем. Я ж для чаго пазначаю тэлефон? Пасля, калі выдаецца вольны час, набіраю нумар і пытаюся, як вырашылася пытанне? Не вырашылася? Тады меры будуць больш жорсткімі. Ні адзін зварот без увагі не застанецца. Акрамя таго, што я паразмаўляў з 36 абанентамі, частка зваротаў запісана апаратарамі. Іх звароты мы таксама возьмем на кантроль.

Па словах спадара Ломаця, сёлета не было ні адной праверкі КДК, якая б не выявіла парушэнняў.

— Па выніках 10 месяцаў мы на трэць знізілі колькасць праверак прадпрыемстваў, — кажа старшыня КДК. — Выніковасць — 100 працэнтаў. У бюджэт вернута 177 млрд. Гэта 115 працэнтаў да ўзроўню мінулага года.

За другое паўгоддзе Зянон Ломаць правёў 6 прамых ліній, задаць пытанне змаглі 207 чалавек.

Настасся ЗАНЬКО.

Хто што сказаў учора...

Мікалай КОМ,
начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама — пра тое, што **«шэрыя» схемы пастаноўкі на ўлік грамадзян, якія маюць патрэбу ў жыллі, цяпер выключаны**:

— Дакумент *(маецца на ўвазе Указ Прэзідэнта № 543)* удасканаліў правілы прыняцця на ўлік людзей з патрэбай у жыллі, і прадастаўленне жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду. Галоўная мэта — даць насельніцтву, якое сапраўды мае ў гэтым патрэбу, дадатковыя гарантыі і выключыць магчымасць камерцыйнай нажывы за кошт жылля, якое ўзводзіцца з падтрымкай дзяржавы.

Андрэй ЕЎДАЧЭНКА,
намеснік міністра замежных спраў — пра тое, што **ўвядзенне Адзінага мытнага тарыфу не выкліча істотнага павышэння пошлін у Беларусі:**

— Мытны тарыф Беларусі і Расіі ўжо сёння ўніфікаваны на 95 працэнтаў. Праект Адзінага мытнага тарыфу, які ўжо падрыхтаваны, не мяркуе значнага павышэння пошлін у Беларусі. Фактычна тарыфная абарона ў нашай краіне застанецца на тым жа ўзроўні, на якім яна была ўсе гэтыя гады. У Расіі адбудзецца неістотнае зніжэнне тарыфнай абароны, у Казахстане тарыфная абарона павялічыцца.

Максім МІРНЫ,
беларускі тэнісіст — **аб будаўніцтве Тэніснага цэнтра ў сталічным мікрараёне «Малінаўка»:**

— Будаўніцтва ўжо пачалося — закладваецца падмурак. А да канца наступнага года ўзвядзенне тэніснага цэнтра будзе завершана, і ў жыхароў Малінаўкі і іншых мінчан з'явіцца магчымасць гуляць у тэніс на трох адкрытых і трох закрытых кортах. Варыянты ажыццяўлення такога праекта ў іншых краінах я нават не разглядаў. Толькі ў родным Мінску я адчуваю сябе па-сапраўднаму дома і буду дапамагаць развіццю тэніса, ды і наогул спорту, менавіта на Радзіме.

Сіндзі НОГЛ,
жыхарка Фларыды (ЗША) — пра тое, **як яна атрымала кампенсацыю ад тытунёвай кампаніі ў 300 млн долараў:**

— Я стала курыць ва ўзросце 20 гадоў. Прычына была самая банальная: з цыгарэтай выглядала больш дарослай. Калі б я ведала, якую залежнасць выклікае нікацін, ніколі не скурыла б тую першую цыгарэту. Аднак у тыя гады тытунёвыя кампаніі хавалі гэты факт. За многія гады маім лёгкім была нанесена непапраўная шкода: я пакутую ад цяжкай формы эмфізэмы лёгкіх і змушана 24 гадзіны дыхаць праз кіслародную маску. Цяпер вось суд прызнаў мае прэтэнзіі справядлівымі і абавязаў кампанію Philip Morris выдзеліць 56,6 млн долараў на лячэнне і ў якасці кампенсацыі за фізічныя і маральныя пакуты — яшчэ 244 млн.

Антон БЕЛЯКОЎ,
член фракцыі «Справядлівая Расія» Дзярждумы РФ — **аб прычынах пройгрышу футбольнай зборнай Расіі:**

— Пройгрыш расійскіх футбалістаў славенцам *(маецца на ўвазе стыкавы матч Расія—Славенія за права ўдзелу ў чэмпіянаце свету-2012)* мог быць выкліканы іх зацікаўленасцю ў атрыманні сур'ёзнага прыбытку ад выйгрышаў у таталізатар.

Прамая лінія

ПА ШЛЯХАХ ДЫХАЛЬНЫХ ВІРУСАЎ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ВЯДОМА звыш дзясятка вострых рэспіраторных вірусных інфекцый. Плюс — шэраг сератыпаў грыпу. Навука развіваецца, а значыць, адкрываюцца новыя ўзбуджальнікі. Сёлетні пандэмічны вірус грыпу — гэта спалучэнне часткі генетычнага матэрыялу чалавечага сезоннага, птушынага і свінога грыпаў, вынік вялікай колькасці мутацый, характэрных для грыпу. На завяршэнні шырокай імунізацыі насельніцтва пандэмія свінога грыпу спыніцца. Гэта будзе яшчэ адзін вірус, у дачыненні да якога частка насельніцтва ўжо мае імунітэт. Спецыялісты кажуць, што з пэўнай перыядычнасцю будуць узнікаць і іншыя прыродна-ачаговыя інфекцыі, будуць працягвацца якасныя мутацыі. А значыць, застануцца актуальнымі прышчэпкі, імунамадулятары і шэраг іншых, такіх простых, але надзвычай эфектыўных мераў, прымяняць якія часам перашкаджае наша ўласная лянота і завышаная вера ў нейкую супер-пупер таблетку.

Вялікае значэнне пры любой захваральнасці, у тым ліку і сезоннай віруснай, мае псіхалагічны стан чалавека. Стрэсы, трывожнасць, фізічныя і псіхалагічныя перагрузкі спрыяюць хваробам. Калі мы будзем настроены на дрэнны выхад, то можам яго атрымаць, паколькі галаўны мозг кантралюе ў тым ліку і імунітэт. А карысныя парады ў кожным асобна ўзятым выпадку даваў дацэнт кафедры інфекцыйных хваробаў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Святаслаў ВЕЛЬГІН.

☎ ***— Клічаў, Галіна Ільінічна. Якія медыкаменты можна ўжываць цяжарным для прафілактыкі? Інтэрферон, напрыклад, паказаны толькі з 14 тыдняў... А дома яшчэ хворае дзіця...***

— Цяжарных, якія захварэлі, часова шпіталізуюць. Ім патрабуецца пастаяннае назіранне ўрача. У вашым жа выпадку цяжарнай трэба прымаць меры прафілактыкі. Лепш за ўсё, безумоўна, каб хворае дзіця знаходзілася ў асобным пакоі. Яшчэ лепш, калі яно будзе насіць маску. Калі не яно, дык астатнія члены сям'і. Безумоўна, усім варта памятаць пра асабістую гігіену і часцей мыць рукі.

— А што можна ўсё ж такі прымаць?

— Полівітаміны. Што да індуктараў інтэрферону, то трэба глядзець інструкцыю, ці няма супрацьпаказанняў.

— У інструкцыі да рэмантадзіну, арпетолу напісана, што пры цяжарнасці яны супрацьпаказаныя. Значыць, акрамя маскі, цяжарным больш нічога нельга? Прышчэпкі ім таксама не робяць?

— Звычайна не. Цяжарнасць — гэта стан фізіялагічнага імунадэфіцыту. Гэта ўразлівая група. І адзіны метад — ізаляцыя.

— Але ж гэта не рэальна... Значыць, жывеш на страх і рызыку..

— Можна мазаць нос аксалінавай маззю.

— На жаль, яе няма нават у Магілёве.

— Можна выкарыстоўваць і іншыя мазі — банафтонавую, бараментол ці нават вазелін, ён таксама будзе затрымліваць вірус. Можна набыць у аптэцы фізіялагічны раствор для штодзённага прамывання насавых хадоў. Раскладзіце ў кватэры часнок, цыбулю, каб у паветры былі фітанцыды — рэчывы, якія забіваюць вірусы. Вельмі добра спраўляецца з гэтай задачай кварцавая лямпа. Хоць бы двойчы на дзень неабходна рабіць вільготную ўборку памяшкання, паколькі вірусы любяць пыл. Можна дадаваць у раствор дэзынфектанты накшталт «Даместасу», з хлорам. Часцей праветрывайце памяшканне.

— Я чытала інструкцыю да нямецкай вакцыны, якая ўводзіцца ін'екцыйна. Напісана, што быцам бы і пры цяжарнасці яе можна прымяняць...

— Я не маю вопыту работы з цяжарнай, але калі ў інструкцыі дакладна напісана, што цяжарным можна, значыць, можна. Пазваніце, калі ласка, у паліклініку і папытайцеся, ці ёсць у іх такая вакцына і ці можна вам прышчапіцца.

☎ ***— Клічаў, Ларыса. Ці дапаможа прышчэпка ад грыпу засцерагчыся ад іншых інфекцый, асабліва ад такіх, што выклікаюць вострыя, рэзкі кашаль?***

— Вакцынацыя спрыяе выпрацоўцы антыцелаў і клетак памяці супраць антыгену, які ўтрымліваецца ў вакцыне. Адпаведна, абароны ад іншых інфекцый не будзе. Здараецца, што розныя вірусы маюць падобныя структуры. Прышчэпка можа абараніць ад падобных тыпаў віруса, але гэта, хутчэй, выключэнне, чым правіла. Прышчэпка абараняе ад канкрэтнай назалогіі.

— А які вірус можа выклікаць востры кашаль?

— Цэлы шэраг вірусаў грыпу, парагрыпу, адэнавірусы і некаторыя іншыя. Узбуджальнікаў шмат. Акрамя вірусаў, гэта бактэрыі — хламідыі, мікаплазмы.

— Ці можна за сезон двойчы перахварэць на грып? Кажуць, у сезон ходзіць адразу некалькі вірусаў грыпу, а значыць, можна прыйсці ў паліклініку для закрыцця бальнічнага ліста і падхапіць яшчэ адзін від?

— Існуе некалькі сератыпаў грыпу А, В і новы пандэмічны вірус. Адначасова цыркулююць, як мінімум, тры-чатыры вірусы. Грыпу падвержаныя ўсе групы насельніцтва, што абумоўлена яго высокай кантагіёзнасцю.

☎ ***— Гомельская вобласць, Мікалай. Прышчапілі дзіця французскай вакцынай, але некаторыя бацькі кажуць, што яна не падыходзіць беларусам, маўляў, у нас і клімат, і «кроў» іншая. Што вы на гэта скажаце?***

— Гэта не адпавядае сапраўднасці. Французская вакцына — адна з нямногіх, якую дазволена прымяняць непасрэдна падчас эпідэміі. Яна не выклікае пабочных эфектаў.

— А колькі ўсяго вакцын прымяняецца ў свеце?

— Краіны вызначаюцца па суадносінах кошт — якасць. Развітыя краіны могуць набываць больш дарагія вакцыны, але нямецкія і французскія, якія мы набываем, таксама нятанныя.

— Чамусьці многія бацькі апасаюцца вакцынаваць сваіх дзяцей жывой вакцынай...

— Жывыя вакцыны, напрыклад, добрыя тым, што імунітэт выпрацоўваецца больш стойкі і працяглы. Гэта іх перавага, а недахоп у тым, што ў імунадэфіцытных асобаў можа назірацца лёгкая форма грыпу.

☎ ***— Нясвіж, Кацярына Іосіфаўна. Пнеўманія не заўсёды праслухоўваецца. Урачы на звычайным прыёме не могуць яе выявіць, дапамагае толькі рэнтгенаўскі здымак. Як вызначыць, калі чалавека трэба весці на рэнтген?***

— Важна назіраць за станам хворага. Пры нармальным цячэнні грыпу ці ВРВІ на пяты дзень захворвання тэмпература зніжаецца. Калі ж гэтага не адбываецца або ўзнікае другая хваля ўздыму тэмпературы, значыць, далучылася новая інфекцыя або развіліся ўскладненні. Напрыклад, сінусіт, вірусна-бактэрыяльная пнеўманія, якая праяўляецца тым, што дзіця становіцца кволым, бледным, з'яўляецца задышка, пражылкі крыві ў макроце. І высокая тэмпература не збіваецца звычайнымі метадамі ці збіваецца ненадоўга. Вось тады трэба рабіць здымак.

— Пнеўманія можа ўзнікнуць раптоўна, на другі дзень?

— Для вірусна-бактэрыяльных пнеўманій, выкліканых сезонным грыпам ці ВРВІ, гэта не характэрна. Як правіла, размова ідзе пра 4-7-ы дзень. Хоць з'яўляюцца звесткі, што пандэмічны грып выклікае больш ранніе пнеўманіі. Таму так важна сачыць за дынамікай стану хворага.

— А якім чынам праяўляецца бранхіт?

— Ён працякае больш лёгка, чым пнеўманія. Хоць бранхіты бываюць розныя. Ёсць хранічныя абструктыўныя захворванні лёгкіх, ёсць бранхіты з астматычным кампанентам. Пры бранхіце будзе задышка, прычым цяжка менавіта выдыхаць. А пры пнеўманіі нарастае агульная слабасць, патлівасць, задышка пры нязначных фізічных нагрузках, ліхаманка, боль у грудзях, які сведчыць аб плеўрыце. Дарэчы, болем у грудзях можа праяўляцца і бранхіт, паколькі ў бронхах таксама ёсць болевыя рэцэптары. А вось лёгкае не баліць.

— Бранхіт можа перайсці ў пнеўманію?

— Можа. Гэта і тыпова. Спачатку ідзе запаленне верхніх дыхальных шляхоў, а потым ніжніх. Пры гэтым нярэдка далучаецца другасная інфекцыя, паколькі парушаецца дрэнаж макроты, тая застойваецца і служыць пажыўным асяроддзем для мікраарганізмаў. Гэта ўжо бактэрыяльнае ўскладненне.

Святлана БАРЫСЕНКА,
Вольга ШАЎКО.
(Працяг будзе.)

Абзац

◢ Праваслаўная царква сёння святкуе Сабор Архістратыга Міхаіла. Гэты дзень прысвечаны анёльскім нябесным сілам. У вернікаў прынята ў гэты дзень звяртацца да сваіх анёлаў з малітвай і падзякай, каб нябесны ахоўнік і далей абараняў ад бедаў.

◢ Беларуская чыгунка з 20 лістапада знізіла цэны на асобныя цягнікі ва ўнутрырэспубліканскіх пасажырскіх зносінах. У прыватнасці, цэны зніжаныя ў цягніках № 683/684 Віцебск — Гродна, № 95/96 Гомель — Мінск і № 103/104 Мінск — Варшава (толькі па тэрыторыі краіны). Цэны знізяцца ў сярэднім на 17 % у залежнасці ад катэгорыі вагона.

◢ Грузавы цягнік Мінск — Орша сутыкнуўся з трактарам «Беларус» на неахоўным чыгуначным пераездзе 544-га кіламетра перагону Орша — Коханава. У выніку здарэння ніхто не пацярпеў. Аднак лакаматыў і прычэп трактара атрымалі механічныя пашкоджанні. Трактарам кіраваў 61-гадовы трактарыст сельгаспрадпрыемства «Забалацце». Прычынай інцыдэнту стала тое, што кіроўца выехаў на забараняльны сігнал святлафора. Пасля сутыкнення затрымкі руху цягнікоў не было.

◢ У Гомелі арыштаваны ўладальнік прыватнай ювелірнай майстэрні «Плаціна» па абвінавачванні ў незаконных здзелках з каштоўнымі металамі, прысваенні каштоўнасцяў і махлярстве. На працягу года падазроны прымаў ювелірныя вырабы для рамонту і вырабу новых упрыгажэнняў, аднак вяртаў іх не ўсім. Цяпер у якасці пацярпелых фігуруюць 48 жыхароў Гомеля і іншых гарадоў Беларусі, а таксама грамадзянаў Расіі і Ізраіля. Паводле папярэдніх ацэнак, сума ўрону, прычыненага заказчыкам, склала Br55 млн.

◢ У Днепрапятроўскай вобласці (Украіна) звязаны праваднікамі пасажыр выпаў з цягніка «Сімферопаль—Львоў» і атрымаў смяротныя траўмы. На адной невялікай станцыі ў цягнік сеў новы пасажыр і пачаў шчодра ўжываць спіртное — «на дарожку». Дайшоўшы да кандыцыі, ён стаў чапляцца да пасажыраў і нават біцца. Угаворы на яго не дзейнічалі, і тады праваднік паклікаў калегу з суседняга вагона, і разам яны звязалі дэбашыра і вынеслі ў тамбур «ахаладзіцца». У вагоне стала спакойна, аднак звязаны чалавек умудрыўся адчыніць дзверы вагона і, згубіўшы раўнавагу, выпаў на палатно. Па правілах праваднік павінен быў выклікаць міліцыю, але чамусьці гэты цягнік не ахоўваўся. Зараз 29-гадовы праваднік Віктар знаходзіцца ў следчым ізалятары, яму пагражае да 12 гадоў пазбаўлення волі.

Поўны абзац

◢ 74 кажаны былі выяўленыя ў кватэры жыхаркі Чарнаўцоў (Украіна) на галоўнай вуліцы горада. Жывыя істоты трапілі ў кватэру ноччу праз адчыненую фортку. Жанчына прыйшла ў шок, калі ўбачыла ў пакоі цэлую калонію кажаноў, якія знайшлі сабе прыстанішча за шафай і паміж рамамі вокнаў. Яна тэрмінова выклікала выратавальнікаў. Байцы МНС у пажарным рыштунку сабралі рукакрылых у мех. Іх налічылі 74 штукі. Кажаноў вывезлі за горад і выпусцілі ў лесе.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ТРАПІЎ ПАД ВОЗ

У Рубельскую ўчастковую бальніцу (Столінскі раён) звярнуўся 59-гадовы мясцовы жыхар, у якога былі паламаныя косці грудзей і траўмаваны жывот.

Пацярпелы растлумачыў, што ён трапіў пад воз. Праз нейкую гадзіну пасля прыходу ў бальніцу мужчына памёр. Што здарылася насамрэч, вызначае пракуратура.

ПЕРАСТАРАЛІСЯ?

Баранавіцкія ЖЭСы правялі эксперымент, які заблытаў многіх жыхароў горада.

Квітанцыю на аплату камунальных паслуг надрукавалі разам з рэкламнай інфармацыяй. Гаспадары кватэр падумалі, што ў іх паштовыя скрынкі кінулі чарговыя рэкламныя буклеты і пачалі выкідаць іх. Такіх рэклам-квіткоў было надрукавана 35 тысяч, а заказчыкам такой формы інфармацыі жыхароў горада выступіў адзін з індывідуальных прадпрымальнікаў.

КАПУСТУ ВОСЕННЮ КРАДУЦЬ

Жыхарка в. Відзібор Столінскага раёна не паверыла сваім вачам: з яе ўчастка, які знаходзіўся побач з вёскай, знікла ўся капуста.

А злодзея знайшлі ў в. Плотніца. 18-гадовы беспрацоўны здолеў вывезці 3,5 тоны капусты.

РУХАВЫЯ БРАТЫ

Аграном з в. Любачын Лунінецкага раёна звярнуўся ў міліцыю: яго абакралі.

Нехта разабраў дах гаража, які стаіць у двары дома, і выкраў усё, што можна было выцягнуць: 4 мяхі мукі, камбікорм, 80 літраў саляркі, 40 — бензіну... А абакралі агранома мясцовыя жыхары — два браты. Старэйшы ўзяў у памагатыя малодшага — вучня мясцовай школы... і навучыў, «як трэба жыць».

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

САЛЯРЫІ ПРАЦАВАЛІ НЕЗАКОННА

У дзвюх магілёўскіх камерцыйных арганізацыях без ліцэнзіі працавалі салярыі. Даход ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці на працягу гэтага і мінулага гадоў склаў 62 мільёны рублёў.

Праверку прыватных фірмаў па выкананні заканадаўства ў сферы медыцынскай дзейнасці зрабілі работнікі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Магілёўскай вобласці. Пад іх увагу трапілі салярыі. Паводле закона, на апаратуры, дзеянне якой заснавана на выкарыстанні ультрафіялетавага выпраменьвання, павінны працаваць урачы-фізіятэрапеўты ці сёстры па фізіятэрапіі. Тут трэба ўлічваць стан здароўя чалавека і супрацьпаказанні, таму ў салярыі сапраўды варта працаваць менавіта медыку.

Такіх работнікаў не было ў штатах, салярыі працавалі незаконна. Кіраўнікі фірмаў не звярталіся па ліцэнзіі ў Міністэрства аховы здароўя, і цяпер у дачыненні да іх расследуюцца крымінальныя справы.

Ілона ІВАНОВА.

Знаходка

ТАКІМ СТАНКОМ ВЫКРУЧВАЛІ БЯЛІЗНУ СТО ГАДОЎ ТАМУ

Слонімец Сяргей Сыч нядаўна знайшоў не што іншае, як станок для выціскання вады з мытай уручную бялізны. Людзі ў мінулым і пазамінулым стагоддзях яго называлі выціскальнік, па-польску — выжымачка.

Пасля таго, як бялізна была вымыта ў балеі, яе клалі між драўляных валікаў і круцілі за ручку. Вада выціскалася, і бялізна з другога боку выжымачкі выходзіла амаль сухой. Пасля яе бралі і развешвалі на вяроўку дасушвацца.

Не кожны меў падобны станок у сваёй хатняй гаспадарцы, бо ён дорага каштаваў. Асабліва такі, які знайшоў слонімец. На ім стаіць фірмовы знак і дата: Anchor Brand 1896. Як трапіў выціскальнік на Слонімшчыну і хто быў яго гаспадаром — застанецца загадкай. Уладальнік старой знаходкі плануе перадаць яе ў мясцовы музей альбо прадаць.

Сяргей ЧЫГРЫН.
Фота аўтара.

ЧОРНЫ ВЕЧАР НА БЕЛЫМ ЛЁДЗЕ

Хакей. КХЛ

ВЕЧАР 19 лістапада быў напоўнены сінонімамі і антытэзамі. Сінонімы ўсё больш стылістычна адмоўнай афарбоўкі. Антытэзы яскравыя, як вынесеная ў загаловак. Мінскае «Дынама», распачаўшы самую вялікую хатнюю серыю гульняў (іх будзе 5), пацярпела самае гучнае паражэнне ў гэтым сезоне.

У сталічным Палацы спорту, які ў каторы раз шчыльна запоўнілі гледачы, «бела-блакітныя» саступілі ХК «МВД» 1:5. За суцяшэнне можна прыняць толькі той факт, што вядучую ролю ў падмаскоўнай камандзе выконвае форвард зборнай Беларусі Аляксей Угараў. А ў гаспадароў, у тым ліку і шматлікіх легіянераў, не атрымлівалася амаль нічога. Сапраўды, не лічыць жа за плюс тое, што за гульню дынамаўцы выдаліліся толькі чатыры разы? Напрапускалі і ў роўных складах. Ужо на 34-й хвіліне галоўны трэнер мінчан Аляксандр Андрыеўскі вымушаны быў замяніць галкіпера: замест Коваля, «пусціўшага» 5 шайбаў, на пляцоўку выйшаў Мезін. Андрэй гульнявы снарад лавіў старанна і беспамылкова, часам, змагаючыся з супернікамі сам-насам, але адыграць такое вялікае адставанне шанцаў было няшмат. Пад дахам Палаца спорту ў адной з паўзаў арганізатары ўключылі чайфаўскую кампазіцыю «Аргенціна—Ямайка 5:0». Актуальна. Як і крыкі «Ганьба!» з трыбун. Яшчэ больш

Фота БЕЛТА.

актуальна. Толькі на апошняй секундзе гульні Юнас Андэрсан падарыў беларускім заўзятарам адзіны прыемны момант, забіўшы шайбу, якая, на жаль, ужо нічога не вырашала. Пасля паядынку Андрыеўскі на прэс-канферэнцыі папрасіў у гледачоў прабачэння. Абяцаў выправіцца. Магчыма, адбудуцца чарговыя «ўліванні свежай крыві» з Салігорска. Але часу застаецца не так шмат, ужо сёння перад вачыма сталічнай публікі з'явіцца маскоўскі «Спартак». І настроены ён будзе, адназначна, на перамогу. Што з гэтага атрымаецца, хутка пабачым.

Яўген ВАРАКСА.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ»

❖ **Оценка оборудования и транспортных средств**
❖ **Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности**
❖ **Проектирование вариантов раздела домов и земельных участков**

Для всех форм собственности. Для любых целей

Извещает о проведении аукциона по продаже собственности 8 декабря 2009 г.

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Производственное помещение, общей площадью 89,5 м²	35 789 085	3 500 000
2	Помещение многофункциональное, общей площадью 339,5 м²	135 758 597	13 500 000
3	Производственное помещение, общей площадью 134,9 м²	53 943 548	5 400 000
4	Производственное помещение, общей площадью 146,8 м²	58 702 097	5 800 000
5	Складское помещение, общей площадью 206,8 м²	82 694 780	8 200 000
6	Производственное помещение, общей площадью 66,4 м²	26 551 902	2 600 000

Помещения расположены в одноэтажном кирпичном здании.
Адрес объектов: г. Гомель, ул. Добрушская, 51. **Продавец имущества:** Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Новобелицкого района. Цены указаны без НДС

Срок подачи заявления	**До 17.00 7 декабря 2009 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**7 декабря 2009 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления залога	Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий. Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 %
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Дополнительная информация по тел.: (0232) 77 52 78, 77 52 87 (факс)

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) 18 ДЕКАБРЯ 2009 ГОДА

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже принадлежащего ОАО «Крион» (продавец) здания специализированного животноводства (здание коровника) с инв. номером 620/С-24926, общей площадью 1847,1 кв. м, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская обл., Дзержинский р-н, Негорельский п/с, около дер. Павловщина.

Начальная цена – 224 905 500 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 20 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за объект продажи. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта продажи осуществляется в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **18 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 23.11.2009 по 16.12.2009** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(017)275 22 81 – ОАО «Крион».

Сайт в интернете: www.mgcn.by

Утерянные представительством № 1 по г. Минску Белгосстраха страховые полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу, **формы 2 РН, серии БЛ, № 0644193 и № 0717630 считать недействительными**.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Наименование предмета аукциона	**Два капитальных строения и право заключения договора аренды земельного участка**
Местонахождение недвижимого имущества	г. Брест, ул. Строительная, д. 56
Продавец недвижимого имущества	Министерство промышленности Республики Беларусь (в лице ОАО «БЭМЗ») тел. 8 (0162) 42 25 64
Сведения о предмете аукциона	Капитальное строение (здание мазутонасосной станции), общая площадь 232,8 кв.м (1 эт. 1990 г.п., стены – кирпич, ж/б панели), с очистными сооружениями и двумя резервуарами для мазута. Капитальное строение (здание котельной), общая площадь 582,5 кв.м (1 эт. 1990 г.п., стены – кирпич, ж/б панели), с дымовой трубой, забором, асфальтобетонным покрытием, кабельными сетями, сетями связи, сигнализацией, сетями водопровода, сетями дождевой канализации, тепловыми сетями. Земельный участок площадью 0,9717 га, срок аренды – 5 лет. Использовать для реконструкции объекта в соответствии с проектом детальной планировки г. Бреста.
Начальная цена единого предмета аукциона, руб.	692 796 762
Сумма задатка, руб.	69 279 600
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11, тел. (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 12 63, 23 44 78 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by**

Аукцион состоится **23 декабря 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524.

Для участия в аукционе представляются:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – 22.12.09 г. включительно;

3. Юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования.

4. Иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

5. Иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский (русский) язык.

6. Представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Аукцион проводится в порядке, определенным Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

***Заявления на участие в аукционе с прилагаем

Распрацавана ідэя і абрана месца для самага буйнога і арыгінальнага тэматычнага парка забаў у Беларусі. Цяпер справа за інвестарамі

НА ТРАМВАІ Ў КРАІНУ РАЙСКАЙ ПТУШКІ

Эскіз-ідэя парка забаў на Дуброўскім вадасховішчы.
Аўтары: Валерый МУСІЕНКА, Яўгенія БЕЛЬСКАЯ, Ігар РАКОВІЧ (БЕЛНІДП Горадабудаўніцтва).

1. Уваходная плошча. Вакзал «Чароўнага экспрэса»
2. Плошча Грэцыі (Зеўса)
3. Плошча Старажытнага Рыма (Спартака)
4. Плошча эпохі Адраджэння (Леанарда)
5. Павільён «Свет будучага»
6. Павільён «Галактыка»
7. Галоўная плошча
8. Набярэжная «Народы і краіны»
9. Аквапарк
10. Амерыканскія горкі
11. Водныя атракцыёны
12. Кола агляду
13. Аўтадром
14. Замак жахаў
15. Востраў Буян
16. «Чароўны экспрэс»
17. Дзінапарк
18. Востраў Дракона
19. Востраў скарбаў
20. Пячора Цыклопа
21. Замак Кашчэя
22. Кветкавы горад
23. Чароўнае каралеўства крывых люстэркаў
24. Гарадок Крылова
25. Гасцінічны комплекс
26. Комплекс для дарослых «Кірмаш забаў»

БЛІЗКА-блізка ад Мінска, за 20 кіламетраў на поўнач, ляжыць вялікая Краіна забаў. Яна мае форму няправільнага круга. Камусьці яна можа нагадаць кроплю вады, а камусьці — паветраны шар. Альбо — яскравую і вясёлую мыльную бурбалку. Кожнае дзіця, калі выдзьмувае з пластыкавай альбо папяровай трубачкі мыльную бурбалку, міжволі зачароўваецца дзіўным рухавым малюнкам на яе паверхні і марыць апынуцца ўнутры. Цяпер падобная вандроўка стала рэальнасцю. І дзеці, і дарослыя могуць патрапіць у чароўны свет дзіцячых мараў...

У БОК ЛАГОЙСКА

Прыкладна так можна будзе расказаць пра тэматычны парк забаў, які калі-небудзь абавязкова з'явіцца пад Мінскам. Сёння ўжо распрацаваны яго планіровачны сцэнарый, знойдзена месца і нават падлічана, колькі спатрэбіцца грошай на яго будаўніцтва. Пра падрабязнасці мы распыталі **аўтара ідэі Валерыя МУСІЕНКУ, галоўнага архітэктара праектаў архітэктурна-планіровачнай майстэрні Беларускага навукова-даследчага праектнага інстытута горадабудаўніцтва**.

— Адразу быў абраны Лагойскі напрамак, бо ў раённай планіроўцы і ў схеме развіцця горада Мінска — гэта рэкрэацыйны напрамак, а сам Лагойск — турыстычны цэнтр, — расказаў «Звяздзе» Валерый Пятровіч. — Побач — спарткомплекс «Раўбічы», гарналыжны цэнтр «Сілічы», лыжна-біятлонная база «Заечая паляна». І сёння ўжо ў стадыі распрацоўкі рашэнне звязаць Мінск з Лагойскам трасай хуткаснага трамвая. Гэта — таксама важна. Калі з'явіцца трамвай, да Парка забаў можна будзе даехаць з Мінска за 17 хвілін.

Валерый Мусіенка расказаў, што калі выбіралі месца для размяшчэння парка, то разглядалі пяць пляцовак. Спыніліся на дзвюх: адна — на поўдзень ад Сілічаў, другая — на Дубровенскім вадасховішчы. Зрабілі паўнацэнныя эскізы і схемы абодвух варыянтаў. Пралічылі затраты і нават склалі планіровачныя сцэнарыі для двух мяркуемых паркаў. Потым быў абраны Дубровенскі. З-за ўнікальнасці месцазнаходжання, якое дазваляе выкарыстоўваць даволі вялікую водную акваторыю.

— Думаю, гэты варыянт сапраўды лепшы, — пагаджаецца архітэктар. — Па-першае, ён бліжэй да Мінска — усяго 20 кіламетраў. Па-другое, Дубровенскае вадасховішча з абсталяванымі пляжамі дазволіць спалучаць наведванне парка з адпачынкам на прыродзе. Да таго ж, водная акваторыя дазволіць арганізаваць водныя атракцыёны, якія зробяць знаходжанне ў парку больш цікавым і разнастайным, і яшчэ на некалькі гадзін затрымаюць наведвальнікаў. Але, бадай, самая галоўная перавага тут у тым, што ўнікальны прыродны ландшафт дае магчымасць стварыць уласны стыль, які запомніцца і будзе адрознівацца ад вядомых аналагаў. Звычайна паркі забаў размешчаны цалкам на мацерыку і на раўнінным участку. Наш захоплівае вялікую частку возера, астравы, розныя берагі вадасховішча. Рэльеф дазваляе размясціць буйны парк па прынцыпе амфітэатра на існых прыродных тэрасах. Усё гэта створыць непаўторны вобраз беларускай Краіны забаў.

АДПАЧЫВАЦЬ І ДАЗНАВАЦЦА

Сёння ў свеце налічваецца больш за 700 падобных паркаў. Тэматычныя паркі прынцыпова адрозніваюцца ад тых, да якіх мы прывыкліся з дзяцінства. Па-першае, яны прысвечаны нейкай тэме. Напрыклад, у парку Міні-Еўропа (Брусель) прадстаўлены рэпрадукцыі самых прыгожых манументаў краін Еўрапейскага саюза ў маштабе 1/25. А паркі Легаленд амаль цалкам пабудаваныя з канструктара LEGO. Некаторыя паркі, у тым ліку і Дыснэйлэнды, аб'ядноўваюць на сваёй тэрыторыі некалькі тэматычных паркаў.

Другая асаблівасць падобных паркаў у тым, што яны даюць не толькі асалоду ад блізкасці да прыроды, прадстаўляюць розныя забавы, забяспечваюць актыўны адпачынак, але і даюць магчымасць культурнага развіцця і навучэння вялікай колькасці самых розных людзей. Тут дзеці і дарослыя лёгка засвойваюць новую інфармацыю аб навакольным свеце і гісторыі цывілізацыі за кошт таго, што працэс гэты адбываецца на фоне гульні.

Тэматычныя паркі карыстаюцца вялікай папулярнасцю, іх даходнасць значна перавышае даходнасць звычайных паркаў атракцыёнаў. Дзесяць самых буйных тэматычных паркаў у свеце штогод наведвае больш за 40 млн чалавек. Самы буйны Дыснэйлэнд знаходзіцца ў Арланда (ЗША), ён займае тэрыторыю звыш 10 тысяч гектараў, і мае пяць тэматычных паркаў. Парыжскі Дыснэйлэнд займае 2000 гектараў. Плошча беларускага парка забаў будзе 175 га.

КАЛІ З'ЯВІЦЦА ТРАМВАЙ, ДА ПАРКА ЗАБАЎ МОЖНА БУДЗЕ ДАЕХАЦЬ З МІНСКА ЗА 17 ХВІЛІН.

— Але ад колькасці гектараў кошт парка сёння амаль не залежыць, — кажа Валерый Мусіенка. — Цяпер кітайцы робяць парк на 120 гектарах, аднак кошт яго будзе не нашмат меншы за кошт самага буйнога амерыканскага. Уся сутнасць у тэхналогіях. 70 працэнтаў кошту парка залежыць ад яго тэхналагічнай насычанасці. Сучасны парк забаў камбінуе ў сябе перадавыя камп'ютарныя тэхналогіі, якія дазваляюць наведвальніку атрымаць адчуванне прысутнасці ў цэнтры прадстаўленых падзей.

АД ПІРАМІДАЎ ДА КАСМІЧНАГА КАРАБЛЯ

Канцэпцыя будучага беларускага парка забаў мае на ўвазе падзел на тры галоўныя зоны: зону сямейнага адпачынку (галоўная вуліца, цэнтральная зона), зону актыўнага адпачынку з экстрэмальнымі атракцыёнамі, разлічаную для падлеткаў, і зону для зусім маленькіх дзяцей.

— Я абапіраўся на тэмы і вобразы, якія больш блізкія еўрапейскаму менталітэту, — падзяліўся задумамі аўтар. — Умоўная назва галоўнай вуліцы — Шлях Цывілізацый. Гэта спалучэнне плошчаў, якія будуць знаходзіцца на розных узроўнях і перацякаць адна ў адну. Уздоўж іх будуць размешчаны павільёны і будынкі ў стылі асноўных культур, якія аказалі пэўны ўплыў на развіццё чалавецтва. Будуць рэпрадуктаваны архітэктурныя помнікі Егіпта, Старажытнай Грэцыі, Старажытнага Рыма, сярэдневяковай Еўропы. У адпаведным стылі будзе выканана і тэматыка забаў. На тэмы старажытнагрэчаскай міфалогіі, вынаходніцтваў Піфагора, Леанарда Да Вінчы, боек гладыятараў... Тут будуць сцэны часоў Рамэа і Джульеты, можна будзе на свае вочы ўбачыць, што такое алхімія, як развіваліся рамёствы, гандаль, стаць удзельнікам рыцарскіх турніраў, гістарычных падзей, тэатралізаваных відовішчаў. А на Галоўнай плошчы ў павільёне «Свет будучыні» ў даступнай забаўляльнай форме будуць прадстаўлены найноўшыя навуковыя ідэі і тэхналогіі. Чалавек, які апынецца тут, патрапіць у горадмару! Сярод атракцыёнаў будучыні: Касмічны карабель «Зямля», Сродкі сувязі, Энергетычны Сусвет, Свет Руху, Вандроўкі ў свет уяўлення, Гарызонты, Цуды жыцця, Жывыя моры... У цэнтры галоўнай плошчы размесціцца павільён «Галактыка», які створыць ілюзію міжпланетных вандровак і пазазямных цывілізацый.

Уздоўж набярэжнай архітэктар размясціў экспазіцыю, якая прысвечана культурнай спадчыне краін Еўропы, Азіі, Афрыкі і Амерыкі. Тут будуць размешчаны павільёны розных краін, якія капіруюць архітэктурныя помнікі, нацыянальныя рэстараны. А ўвечары — захапляльнае святломузычнае шоу з салютамі і танцуючымі фантанамі.

Галоўная вуліца і набярэжная прызначаны таксама для карнавалаў, шэсцяў і парадаў.

КВАРТАЛЫ КАЗАЧНЫ І ПРЫГОДНІЦКІ

Галоўная задача зоны дзіцячага адпачынку, лічыць Валерый Мусіенка, — пабудаваць такі парк, у якім кожнае дзіця магло б адчуць сябе нібы ў казцы.

— Думаю, мы маглі б абысціся без герояў дыснэеўскіх мультфільмаў, — кажа ён.— Упэўнены, што Дзядзька Чарнамор, Кашчэй Бессмяротны, Змей Гарыныч, Ілья Мурамец, цар Салтан, Дзюймовачка, Нязнайка, героі беларускіх, еўрапейскіх міфаў і казак больш цікавыя за Мікі Маўса.

У зоне актыўнага адпачынку, акрамя амерыканскіх горак, гоначнай трасы, дома з прывідамі, вежы жахаў будзе, безумоўна, і крыты аквапарк.

Комплекс забаў для дарослых і гасцініцы будуць размешчаны на супрацьлеглым беразе. Тут рэстараны, кавярні, бары, клубы, казіно, танцзалы, крамы, выставачныя галерэі. Адсюль адкрыецца шыкоўная панарама казачнага амфітэатра.

Усе зоны парка па задуме будзе звязваць кальцавая чыгунка, якая сама па сабе — атракцыён. Яна пройдзе праз пячору Дракона, Востраў Скарбаў, Юрасік-парк...

Набярэжная абсталюецца прычалам з прагулачнымі ветразямі, галерамі, колавымі параходзікамі.

— Калі гэты парк узнікне, то ён будзе, напэўна, самы паўночны ў свеце, — заўважае Валерый Мусіенка. — А каб ён быў прывабным у любы сезон, значную частку зонаў — працэнтаў 30, трэба зрабіць павільённымі. А астатнія арганізаваць так, каб зімой яны былі перыарыентаваны на зімовыя гульні і забавы.

І КОЛЬКІ Ж УСЁ ГЭТА БУДЗЕ КАШТАВАЦЬ?

Падлікі тут зроблены, зразумела, арыенціровачныя. Архітэктар зыходзіў з таго, што кошт рэалізаваных і праектуемых паркаў падобнага тыпу складае ў сярэднім ад 4 да 5 млн долараў на адзін гектар. Гэта значыць, што кошт беларускай Краіны райскай птушкі будзе блізкі да 740 млн долараў. Аднак архітэктар лічыць, што зусім не абавязкова будаваць адразу ўвесь парк. Больш выгадна было б ствараць яго паступова, па зонах. Дарэчы, так робяць і іншыя краіны. Напрыклад, на дзіцячы гарадок патрэбна каля 103 млн долараў — сума больш рэальная, аднак найбольш хутка верне грошы, магчыма, зона забаў для дарослых, яе кошт — 94 млн долараў.

Аўтар праектнага сцэнарыя мяркуе, што такі парк штодня будуць наведваць не менш за 5 тысяч чалавек, або каля 2 млн у год. Гэта дазволіць інвестарам пачаць атрымліваць даход ужо праз 9 гадоў.

Напрыканцы нашай размовы я спытала Валерыя Пятровіча, які далейшы лёс абмаляванай ім ідэі парка.

— Не ведаю, — адказаў ён. — Заказчыкам быў Мінаблвыканкам. Напэўна, цяпер усё залежыць ад таго, як хутка знойдзецца інвестар.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Галоўны архітэктар Мінскай вобласці Аляксандр ВАЛОВІЧ: «Гэты парк стане новым крокам у індустрыі забаў, і разам з тым ён будзе непаўторным»

«Месца для парка абрана вельмі ўдала. Гэта — адно з найпрыгажэйшых мясцінаў Беларусі, да таго ж, блізка ад Мінска. У атачэнні курортных зонаў. Менавіта ў гэтым напрамку плануецца развіццё турыстычнай зоны пад Мінскам.

Парк вельмі цікава задуманы. Такога віду забаў на постсавецкай прасторы няма. Калі ён будзе пабудаваны, то стане адной з «іскрынак» нашай краіны. Уся штука тут у тым, што парк разлічаны для ўсіх і канцэнтруе ўсе гульнявыя віды. Гэта будзе цалкам новы крок у сферы забаў. І разам з тым — нешта асаблівае, наша, беларускае. Там можна будзе праводзіць абсалютна любыя святы, любога ўзроўню, маштабу і для любой аўдыторыі.

Цяпер, калі ёсць ідэя, мы расказваем пра яе патэнцыйным інвестарам. Знаёмілі на абласным форуме, на рэспубліканскім, распавядалі турэцкім прадстаўнікам бізнэсу, французам. Французы, дарэчы, выказалі цікавасць да будаўніцтва монарэльсавай дарогі «Мінск — Лагойск». Дагавораў пакуль ніякіх няма, але цікавасць ёсць. Я не сумняваюся, што інвестар знойдзецца.

КІТАЙСКАЯ АЗБУКА

Адкрыцці «дзікуноў»-еўрапейцаў у Паднябеснай

ЧЫПА-ЧЫПА! ГУДА ПРАЙСА ФО Ю!

СПОРТ у кітайцаў, здаецца, у крыві: гімнастыка, танцы, катанне на роліках, адмысловы бадмінтон і сокс у неабсяжных кітайскіх парках — гэта па-іхняму. Магчыма, таму большасць прадстаўнікоў нацыі — сухарлявыя, атлетычнага целасклада, атлусценне там можна пабачыць ну зусім рэдка. Дарэчы, пра знешнасць: прыкінуўшы на вока, скажу, што 8 з 10 кітаянак — прыгажуні. А вось знешне прывабных мужчын значна менш (калі не сказаць больш — практычна няма), але ж хіба для мужчыны гэта важна? Зусім няважна! Абы характар быў...

Смела можна прыпісаць да кітайскага спорту і запуск паветраных змей, і маджонг (назва, як ні дзіўна, цалкам еўрапейская — кітайцам яна незразумелая) ды кітайскімі шашкамі. Але ўсіх іх «пераплёўвае» кітайскі торг — спорт, бясспрэчна, самы займальны. Інвентар нескладаны: час, усмешка, крыху юаняў, гатоўнасць з імі расстацца і калькулятар! Менавіта калькулятар, бо лічбы на пальцах кітайцы паказваюць... па-кітайску! Вось як вы паказалі б шэсць? Відаць, гэтак жа, як і я: адну далонь і адзін адтапыраны палец другой далоні. Іншая рэч — шэсць па-кітайску:

Капеечны кошт на бірулькі — і рукі самі цягнуцца да іх.

адстаўленыя пад прамым вуглом мезенец і вялікі палец адной рукі. Відаць, такое размяшчэнне пальцаў падобнае да адведанага іерогліфа...

Гандляры зазываюць турыстаў шматабяцальным «чыпа-чыпа» (ад англ. cheap — танны, трэба меркаваць), што асабіста ў нас асацыявалася выключна з бабуліным гуканнем куранят (і было недалёкае ад праўды, бо мы для гэтых дзялкоў — самыя сапраўдныя кураняты), і заломваюць паднябесныя цэны. Пры належнай настойлівасці, цярплівасці і спрытнасці можна нашмат збавіць кошт. Сцэнар заўжды прыблізна аднолькавы — з рознымі варыяцыямі на тэму — прадавец набірае на калькулятары нейкія міфічныя лічбы, вы ў сваю чаргу пішаце настолькі ж міфічныя, толькі ў адваротны бок. Ён залівіста рагоча і пачынае дэманстраваць вам якасць тавару: калі гэта «скураны» партманет, пакажа яго навыварат і некалькі разоў ткне ў самы шоўчык — глядзі, кажа, усё натуральнае, калі «шаўковы» шалік — абавязкова яго пажмякае і ледзь не да твару табе прыкладзе, прыгаворваючы «сілк», «сілк» (ад англ. silk — шоўк). Пасля гэтага рытуалу зноў возьмецца за калькулятар і са словамі «Гуда прайса фо ю» (ад англ. good price for u — добрая цана, маўляў, толькі для цябе) або «Эта халасо» напіша там цану, меншую за першапачатковую, аднак усё яшчэ далёкую ад вашай. Вы актыўна надзьмуваеце шчокі і крэхчаце: вой-вой-вой, дзе ж такое бачылі, як дорага — сваю інтэрмедыю суправаджаеце жвавай мімікай і жэстыкуляцыяй, не забываецеся пры гэтым пакінуць на калькулятары ўласную ацэнку тавару. Прадавец закатвае вочы, хапаецца за сэрца і часам нават карцінна хныкае, аднак усё ж збаўляе цану...

Так можа працягвацца бясконца, ажно пакуль не вычарпаецца ваш запас цярпення. За гэты час ваш партнёр па гэтым тэатры двух акцёраў можа некалькі разоў паказаць на калькулятары розныя спалучэнні лічбаў са словамі «максімум прайса» (маючы на ўвазе, відаць, што гэта максімальная цана, на якую ён згодны), а вы можаце накінуць нейкую колькасць юаняў на сваю «мінімум прайса». Апошні нумар вашага выступлення — зніканне са сцэны. І першыя ж крокі вы зробіце, хутчэй за ўсё, пад крыкі «акэй», «акэй», якія сімвалізуюць згоду на выстаўленую вамі цану. Асабіста для мяне індыкатарамі добрага торгу з'яўляецца яго працягласць і настрой прадаўца ў фінале. Калі на маю цану пагадзіліся хутка і прадавец у выдатным настроі, з шырачэзнай усмешкай, — Ала, ты пралічылася, кажу сабе. А калі сціснуўшы зубы, ледзь не кідаюць у цябе каробкай ад толькі што набытага — тады, відаць, разлік быў больш-менш слушны. А тое, што ўсіх нас усё роўна разводзяць — гэта як піць даць, толькі схітраюцца зрабіць гэта так, каб мы засталіся задаволеныя. Гэта сапраўднае майстэрства, і ў мяне яно выклікала выключна пазітыўны настрой. Настолькі, што не адпускала на працягу ўсяго падарожжа. Праходзячы міма дарагога японскага пазадарожніка, мы пырскалі ад смеху — ну што, маўляў, пачынаем таргавацца з 10 юаняў (4 тысячы на нашыя). Так і карцела пачаць таргавацца ў гарадскім аўтобусе (кошт паездкі ў асноўным адзін юань — рублёў чатырыста па-нашаму, за рэдкім выключэннем — два юані) або ў аптэцы, дзе я, між іншым, правяла не адну гадзіну ў спробе набыць замоўленыя знаёмымі мудрагелістыя лекі для бабулі. Набыла, дарэчы, — спадзяюся, тыя, што былі патрэбныя... Гэта вам таксама для занатоўкі: калі вы спагадлівы чалавек, перад паездкай у Кітай у вас знойдзецца дзясятак знаёмых вашых знаёмых, якім вы вельмі дапамаглі б, калі прывезлі б нешта гэтакае... Так што калі сумленне дазваляе і за перавагу плаціць не хочацца, мая вам парада, утаймоўвайце свой ад'езд у Кітай да апошняга.

Паднябесныя прадаўцы, мне падаецца, найлепшыя ў свеце — яны настолькі зацікаўленыя ў продажы, што, здаецца, могуць стварыць патрэбны вам тавар нават з паветра. Калі я шукала ў падарунак партманет з выявай Мао Цзэдуна (а кітайскі лідар літаральна разышоўся на сувеніры — ад рэменяў да запальніцы), прадавец, у якой такога не аказалася, так старалася яго знайсці — і стагнала, і плакала, — што мне падалося, лік камуністычнага правадыра зараз там праступіць. Перакачуе туды з маіх юаняў (выявай лідара адзначаная кожная купюра, незалежна ад наміналу)... Пры гэтым кітайскія гандляры не настолькі навязлівыя і не выклікаюць такую агіду як, прабачце, турэцкія. Хоць былі і такія рынкі, дзе хапалі за руку, а я гэтага страх як не люблю, таму адтуль проста сыходзіла...

Сказаць, чаго нельга набыць у Кітаі, вельмі цяжка, прынамсі ў мяне ідэй на гэту тэму няма. Тут ёсць пацешныя падробкі, лэйбачкі на якіх часам нагадваюць анаграмы з назваў знакамітых брэндаў (SRAHP, напрыклад). Ёсць крыху менш смешныя, дзе арфаграфія арыгінала цалкам захаваная — так што пасажыры гарадскога аўтобуса скрозь у «Armani» ды «Gucci», з пластыкавымі «Louis Vuitton» наперавес. Ёсць і такія, дзе «выпала» толькі адна літарка. Так з лёгкай рукі кітайскіх умельцаў мара паловы свету — i-phone — ператвараецца ў «phone» і ідзе з прылаўка па стартавай цане 50 долараў (а калі яшчэ і патаргавацца!..). Пры найбліжэйшым разглядзе ў русіфікаванай версіі вышукваюцца словы накшталт «Калькульдтр», а англамоўная версія неўпрыкмет пераходзіць у французскую... За жартоўны падарунак 20 долараў — дарагавата, вырашаю я і крочу далей, у незлічоныя рады з флэшкамі, вэб-камерамі і клавіятурамі, што скручваюцца ў трубачку. Іх набыццё чамусьці падалося мне менш рызыкоўным. А для жартоўных падарункаў ходкі кошт — 5 юаняў (каля дзвюх тысяч на нашыя), балазе, крам, крамачак і крамусечак, дзе можна набыць якіх-небудзь дробязяў на гэту астранамічную суму, — заваліся. І як жартавалі мае спадарожнікі, усё што каштуе менш за 5 юаняў, трапляе ў катэгорыю «Набыць абавязкова». У Еўропе, нягледзячы на больш высокія цэны, грошай траціцца менш, таму што расставацца з вялікімі сумамі значна цяжэй.

Сапраўдным аксесуарам стаў для многіх кітайцаў рэспіратар — там гэта нешта большае, чым проста засцярога ад H1/N1: розных колераў і фасонаў, яны прадаюцца ў крамах побач з касметыкай і ўпрыгажэннямі.

Адзінае месца, дзе дазволена фатаграфаваць выявы Будды, — сувенірная лаўка (у храмах гэта строга-настрага забаронена).

Адзенне і абутак з маім нечалавечым па кітайскіх мерках ростам і памерам нагі падабраць цяжкавата, але ж мы схітраліся. Ну і што з таго, што рукавы ледзь не да локцяў, пацягне на тры чвэрці — вельмі актуальная даўжыня... Жартую! Часам удавалася напасці на нешта, што сапраўды «сядзела». Так што цяпер на кожную абноўку знаёмыя рэагуюць адназначна: «З Кітая прывезла?», відаць, гэты ярлык пратрымаецца на мне да пенсіі... Затое прымяраць бялізну было суцэльным задавальненнем. Дзяўчаты мяне зразумеюць: наколькі вялікі памер не вазьмі... усё малое! Так, памеры кітайцы лепяць вельмі арыенціровачна — вось гэта вялікае, а гэта ну ўжо проста гіганцкае, такіх людзей і не бывае, — здаецца, разважалі яны, налепліваючы XXL на вопратку, якая у нас сышла б за S.

Аповед пра кітайскі гандаль быў бы няпоўны без згадвання буйных гандлёвых цэнтраў, дзе пакупнікам прапануюць італьянскія, а не кітайскія ўзоры Dolce Gabbana. І цэны на «фірму» там яшчэ вышэйшыя, чым у нас, хоць падаецца, што даражэй ужо няма куды. На гэта, відаць, уплываюць выдаткі на транспарціроўку...

Апошні вечар у Паднябеснай мы правялі літаральна вярхом на чамаданах і сумках, спрабуючы ўціснуць у іх абмежаваныя рамкі безліч набытай лухты. Ад даплаты за перавагу выратавала толькі тое, што мы былі ўпяцёх і ў аэрапорце дазволілі палічыць агульную вагу, так у сярэднім мы і ў кляліся ў норму — 20 кг на брата. Аднак калі пабачылі на рэгістрацыі «чаўнакоў» з іх валізкамі, адчулі сябе школьнікамі — тыя, здаецца, вывезлі паў-Кітая.

Адзіная рэч, якую я заўжды хацела, але так і не набыла ў краіне ўсяго таннага — гэта мудрасць... Ва ўсякім разе адпаведны амулет прадаваўся ў ламаісцкім храме. Аднак па досыць высокай, паводле кітайскіх мерак, цане. Мудрасць не ў бірульках, — вырашыла я і рушыла далей...

Далей крочым і мы ў сваёй кітайскай азбуцы: да аднаго з самых дарагіх задавальненняў у Паднябеснай (нароўні з шоўкам, жэмчугам і гарбатай) — наведванне турыстычных славутасцяў. Пра іх наступным разам.

Ала МАЧАЛАВА.

Каб не «дужэ прэсно»

Было гэта напярэдадні 8 Сакавіка 1991 года. Рэспублікі колішняга Савецкага Саюза толькі што атрымалі суверэнітэт і цяпер вучыліся жыць самастойна, будаваць свае адносіны з суседзямі. Прынамсі ў Чарнігаў на падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве прыехалі міністр унутраных спраў Украіны спадар Васілішын і яго калега з Беларусі спадар Ягораў. Дакументы рыхтаваліся на рускай мове, перамовы вяліся таксама. Але ж вось справа зроблена: усе паперы падпісаны. Гаспадар сустрэчы — высокі мажны мужчына з залатымі пагонамі — бярэ так званае заключнае слова і на роднай яму (ды абсалютнай большасці люду ў зале) украінскай мове пачынае гаварыць пра неабходнасць супрацоўніцтва, пра тое, што злачыннасць нацыянальнасці не мае...

Пасля яго павінен гаварыць і міністр-госць.

— Калі ласка, па-беларуску! — папрасіў яго жаночы голас з паўнюткай залы, хоць спадар Ягораў, магчыма, і сам разумеў, што вось тут і зараз можа паказаць, што мы таксама не нямкі, што і ў нас ёсць прыгожая мілагучная мова.

— Шаноўны Андрэй Уладзіміравіч, — звярнуўся ён да калегі, — шаноўныя сябры і сяброўкі. Мы рады быць на вашай гасціннай і прыветнай зямлі...

Потым ён гаварыў пра важнасць гэтай сустрэчы, пра неабходнасць супрацоўніцтва і нарэшце (справа, паўтаруся, была напярэдадні 8 Сакавіка) шчыра павіншаваў усіх жанчын са святам, сказаў, што міліцэйская форма заўсёды пасавала нам, заўсёды была да твару.

І тут жа ў прыціхлай зале загучаў голас-пошапак: «Дывісь, Мыкола, він шо нашых жінок тварямі обзывае?» Павісла напружаная цішыня, але ж пытанне, на шчасце, пачуў і прамоўца. Ён шырока ўсміхнуўся, сказаў, што па-беларуску твар гэта лицо, а пасуе да твару гэта па-украінску лычыць.

Карацей, сваю прамову беларускі міністр закончыў пад бурныя воплескі.

...Да выхаду з канферэнц-залы першым рушыў начальнік Упраўлення ўнутраных спраў Чарнігаўскай вобласці, следам — абодва міністры, прадстаўнікі мясцовай улады. Хораша, па-ваеннаму ўсе ішлі ды спыніліся (па аднаго з апошніх радоў), бо спыніўся спадар Ягораў. Ён працягнуў руку той самай жанчыне — капітану міліцыі, якая папрасіла яго гаварыць па-беларуску, сказаў: «Дзякуй за маральную падтрымку, зямлячка!.. А форма вам і сапраўды да твару». «Молодець! — пахваліў жанчыну і спадар Васілішын. — Вы дуже вчасно втрутылися ў хід справы, а то ж дуже прэсно було... Буты вам генералом!»

Не згадаў міністр — стала яна ўсяго падпалкоўнікам, якому — па словах калег-украінцаў, форма дужа да твару.

Раіса ВАСІЛЬЕВА, *г. Гомель*

Ганаровы эскорт

Дзядзька мой, як кажуць, акадэмій не канчаў, але ж і дурнем не быў. Прынамсі, дочак сваіх трымаў у строгасці, прымушаў вучыцца, настойваў, каб паступалі, калі не ў інстытуты, то хоць у тэхнікумы. І каб сужэнцаў сабе знаходзілі пажадана сярод адукаваных людзей, бо (гэта даслоўна) шафёр ён і заўтра шафёр і праслязаўтра. А калі дыплом у чалавека ёсць, то ён жа расці можа — ну хоць да міністра.

Трэба сказаць, што гэта дзядзькава тэорыя шмат пацярпела крытыкі. Бо сярод яго аднавяскоўцаў быў абібок і горкі п'яніца з дыпломам і цудоўныя гаспадары без яго (у тым ліку і сярод шафёраў). А потым старэйшая з дзядзькавых дачок на чацвёртым курсе педагагічнага выйшла замуж за выпускніка політэхнічнага, і таму дыпламаванаму спецыялісту сталі плаціць усяго 105 савецкіх рублёў. Не грошы — слёзы. Асабліва, калі ў сям'і малое...

Але зяця цесць не папракаў — чым мог дапамагаў і чакаў. У тым ліку — кар'ернага росту.

Адбыўся ён не так хутка, як сям'і хацелася, але ж затое, з помпай, як кажуць: узгаданы зяць стаў намеснікам дырэктара досыць буйнога прадпрыемства, кабінет свой займеў ды яшчэ з сакратаркаю, машыну з вадзіцелем.

Вось з гэтым, апошнім, згаджацца ён ніяк не хацеў. Казаў, што не зломак, каб яго нехта некуды вазіў, калі трэба, і сам, маўляў, за руль сяду — правы ёсць, досвед таксама...

Ну дык вось. Ці не на трэці дзень пасля таго павышэння выклікалі наваспечанага начальніка ў міністэрства. Прычым тэрмінова. Сеў ён за руль службовай «Волгі». Завёў машыну, паехаў. Думак — рой: чаго выклікаюць, як там лепей трымацца, ці ўся патрэбная інфармацыя ў галаве, ці ўсе паперы ў папцы, як не спазніцца нарэшце!

Але ж абышлося, удала з'ездзіў, — вяртаецца назад. Надвор'е, каб лепш, дык нахалеру, настрой таксама, бо едзе ж з добрымі навінамі, па галоўным сталічным праспекце, на сваёй новай службовай «Волзе»... І тут яна...

Сярод белага дня, на тым самым галоўным сталічным праспекце (у трэцім радзе), ля ГУМа, разоў колькі чыхае і... спыняецца, колам — бензін скончыўся.

Што рабіць, падумаць не паспеў. Лічы тут жа, як з-пад зямлі выраслі два даішнікі, спыталі, што такое і — рабіць няма чаго (не будзе ж гэта «Волга» пасярод праспекта стаяць) — сталі (кіроўца, як пан за рулём...) спіхваць яе на бакавую вуліцу...

Адтуль (мабільнікаў яшчэ не было) незадачлівы кіроўца пазваніў на працу, і бензіну яму прывезлі. А заадно спыталі, ці кіраваць усё ж трэба нечым адным — альбо прадпрыемствам, альбо машынай? Аднак — не пераканалі, бо ён і цяпер, на пасадзе дырэктара, па-ранейшаму абыходзіцца неяк сам. Дзядзька расказваў.

А. КЛІМОВІЧ, *г. Мінск*

Сварыся — за тэлефон не бярыся

...Прыяцелька прыбегла да нас пад вечар, з плачам. Было ад чаго! Усё, капец, — кажа, — заўтра мяне з работы выганяць.

Як у нашым гарадочку іншую знайсці, ды яшчэ жанчыне з дзецьмі, я ведаю. Таму хапаю кубак, набіраю вады, натрасаю валяр'янкі, пытаюся, што ж зрабілася, бо дагэтуль жа ніводнага дрэннага слоўца ад яе не чула — ні пра начальства, ні пра калектыў. Хутчэй, наадварот: ганарылася яна, што ўстанова салідная, што людзі акуратныя, прывет-лівыя, што начальнік неблагі, выхвалялася, што і яе, прыбіральшчыцу, са святамі віншуюць, на дзень народзінаў букеты дораць...

Дык што ж там зрабілася, за што ж цяпер будуць выганяць?..

Глынуўшы валяр'янкі, жанчына і расказвае:

— Сёння, як звычайна, пайшла на працу. Прыбрала ўсе кабінеты, падсобныя памяшканні, калідор. Застаўся кабінет начальніка. Падышла. За дзвярыма, чую, гамана. Ціхенька пастукала. Гаспадар выйшаў. Кажа, нарада ў мяне. То вы ж недалёка жывяце, можаце пайсці дадому, штось зрабіць. А недзе праз паўгадзінкі пазваніце, — я скажу, калі можна прыбрацца.

Ну мне ж і на руку. Пабегла дадому, наабразала бульбы, паставіла на вячэру варыць. Праз тае паўгадзінкі набіраю нумар начальніка. Чую, што слухаўку ён узяў, але голасу пакуль не падае. А тут з пакоя дачка: мама, хутчэй сюды! Я на голас. Бачу — на чыстым жоўтым дыване вялізная брудная пляміна. Ды яшчэ і разгрэбеная... Кот пастараўся... «Ах жа ты паскуда, — крычу, — ах мярзотнік! — Што ж ты, гад, нарабіў, га?..». Кінула тэлефон, сталі мы з дачкой таго неахайніка з-пад канапы выганяць, — званок. Начальнік «на провадзе». Кажа: «Прабачце, Тамара Пятроўна, я не мог вам адразу адказаць — людзі ў кабінеце былі... Вы заўтра тут прыбярэце. А заадно і скажаце, чаму гэта я... паскуда, гад і мярзотнік? Дамовіліся? Бывайце».

Тут мне і млосна стала. Выходзіць, што набрахала я не толькі на ката, а на свайго ж начальніка. Выганіць цяпер... Як піць даць...

Жанчына плакала. Я, як магла, суцяшала, казала, што яна ж не сумысля, што няма ў КЗаПе такога артыкула, што трэба змагацца з непрыемнасцямі па меры іх паступлення — можа яшчэ і пранясе... Аднак разумела, што па сённяшнім часе *не* пранесці таксама можа.

Назаўтра прыяцелька — ведама ж, з якім настроем — пайшла на працу. Толькі прылады свае падаставала, чуе: Пятроўна, зайдзіце да начальніка. Швабра з рук... Душа ў пяткі. Але ж пайшла. Запрасілі сесці, — села. Нават вочы падняла. Бачыць твар у начальніка, як быццам заўсёдны — нязлосны: нават нейкія смяшынкі ў вачах. Во, думае, як ён бядзе маёй радуецца. Слёзы ад крыўды раўчуком, голас дрыжыць, але ж нідзе не дзенешся — расказвае кабета, як напярэдадні дома чысціла дыван, як два дні яго цягала — на дварэ сушыла. І як кот, яго Лёнік завуць — на ўсю гэту працу... Мала таго, што «дабра» свайго налажыў, дык яшчэ і разгроб! «Я, божыцца жанчына, на яго сварылася, забылася, што тэлефон у руках і вы трубку ўжо знялі»...

Што далей было?

«Ніколі не бачыла, — расказвала кабета назаўтра, — каб мужчына, а тым больш начальнік, так шчыра смяяўся — з майго ката, з маіх непрыемнасцяў!»

Карацей, у той установе яна па-ранейшаму працуе.

І. ГАНАНАЙКА, *

ЛЕПШАЕ — ЗА КАДРАМ

Насамрэч было б вельмі несправядліва, калі б на «Лістападзе» не прыдумалі зрабіць конкурс неігравога кіно. Бо калі мы хочам не толькі глядзець фільмы сусветнага ўзроўню, але пры гэтым адчуваць гонар за айчынную прадукцыю, то ўсё гэта якраз-такі спалучаецца ў гэтым конкурсе. Даўно не трэба даказваць, што Беларусь — кінематаграфічная краіна менавіта дзякуючы нашай кінадакументалістыцы, і тут мы маем рэжысёраў сапраўды з сусветна вядомымі імёнамі. Нашы дакументалісты атрымліваюць прызы на прэстыжных конкурсах, якіх даволі шмат у гэтым відзе кіно. Так, бо дакументальнае кіно, напрыклад, у Еўропе, даволі запатрабаванае і мае свайго гледача. А ў нас?..

Пытанне ў нейкім сэнсе рытарычнае. І дзеля таго, каб свая родная дакументалістыка хоць якім-небудзь чынам прыходзіла да айчыннага гледача, патрэбны гэты конкурс, які дае магчымасць у Мінску глядзець неігравыя фільмы і думаць пра тое, што і як іх аўтары падглядзелі ў рэальным жыцці.

Сёлета ў конкурсе неігравога кіно ў Мінску былі прадстаўлены больш за 20 фільмаў, сярод якіх ужо адзначаныя прэстыжнымі прызамі. Сярод іх было дзве беларускія кінастужкі.

Міхаіл Жданоўскі, мастацкі кіраўнік студыі «Летапіс» (якая была створана на «Беларусьфільме» больш за 40 гадоў таму) прадставіў свой фільм «Вечнае вяртанне». А з ім і саму нашу краіну праз адзін з яе духоўных сімвалаў — Сынкавіцкую царкву. Яна і ёсць сімвал вечнага жыцця, якое рушыць па коле і заўсёды вяртаецца і звяртаецца да існасці. А ці ўсе беларусы ведаюць, у чым яе ўнікальнасць?

Другі наш удзельнік — Сяргей Кацьер са стужкай «Брыгада, ці з лёгкай парай!» І гэта ўжо зусім іншае кіно. Калектыўны партрэт пакалення, да якога належыць аўтар. Галоўнымі героямі сталі сябры, з якімі ён 15 гадоў парыцца ў лазні кожную пятніцу. Але для іх гэта своеасаблівы мужчынскі клуб... Па прызнанні аўтара ён узяўся за фільм па наводцы былога адборшчыка Берлінскага фестывалю, які гаварыў пра тое, што кіно з былых савецкіх краін вельмі дэпрэсіўнае, а за гэтым не бачна саміх людзей, таго, чым яны жывуць.

Цяпер бачна — жывуць розным, парознаму. І па-рознаму аўтары распавядаюць пра наша жыццё. Але дзе мы яго можам бачыць?

«Дзеля чаго робяцца фестывалі? Дзеля гледача, якому гэта патрэбна і дзеля аўтара, якому таксама патрэбны глядач, — адзначыў расійскі ўдзельнік конкурснай праграмы Валерый Цімошчанка. — Гэта зваротная сувязь. Я зараз знаходжуся на цудоўным фестывалі, які аб'яднаў лепшыя стужкі, паказаныя ўжо на іншых фестывалях. Таму планка паднятая вельмі высока. А глядач мае права пабачыць увесь зрэз таго, што зроблена лепшае... Але адна рэч — фестывалі. Калі кіно ёсць, то яго трэба паказваць па тэлебачанні. Насамрэч па тэлеканалах круцяць безліч прадукцыі жудаснай якасці. Дакументальнага кіно мала, але яно высокай якасці. І пры гэтым яго амаль што не паказваюць. Гэта праблема».

Рэжысёр Сяргей КАЦЬЕР:

— Як чалавек, які працуе на тэлебачанні, я разумею, што праблема ў тым, што тэлебачанне прад'яўляе свой фармат, які вельмі абмяжоўвае магчымасці мастака ў плане рэалізацыі нейкіх ідэй. Тэлебачанне дае аўдыторыю пэўнага дыяпазону, трэба арыентавацца ў асноўным на сярэдні густ. Ад гэтага губляюцца твае магчымасці як рэжысёра. Я сам па сабе, напрыклад, не люблю кліпавы мантаж. Я чалавек спакойны, у іншым рытме жыву. Мне складана бывае здаваць фільмы кіраўніцтву на ТБ. Але паколькі ёсць нейкі ўнутраны рэдактар, то я знаходжу кампрамісы з кіраўніцтвам. І ўдзячны за тое, што ёсць магчымасць здымаць кіно, цікавае не толькі тэлеканалам, але і фестывальнае кіно. Я не разумею, чаму дакументалістыку лічаць «нефарматам», я глядзеў бы і днём і ноччу! Здаецца, адна з прычын, чаму ў Беларусі мала дакументальнага кіно на ТБ, у тым, што мала тэлеканалаў. Ігравое кіно яны бяруць ўсялякае, любой якасці, каб толькі новае і новае было — тэлебачанне як млын пераварвае вялізную колькасць інфармпрадукцыі. А дакументальнае кіно — прадукт складаны, яму патрэбны глядач падрыхтаваны, зацікаўлены. Яшчэ адзін момант: раней у Мінску можна было глядзець дакументальнае кіно ў спецыяльнай зале, няхай яна была і маленькая. Прывозілі нават добрыя замежныя фільмы, можна было пабачыць, што здымаюць айчынныя дакументалісты. Але вялікае пытанне ў тым, чаму ў мегаполісе, такім, як Мінск (усё-такі мільённик), дакументальнага кіно няма ў пракаце, як няма цяпер ніводнай залы, дзе можна было б глядзець дакументальнае кіно. Сёння нам кажуць, што гэта нерэнтабельна. Але пры гэтым у нас будуюць шматзальныя кінатэатры, дзе сядзяць 15 чалавек і глядзяць дарагі ігравы фільм. І гэта чамусьці нармальна...

Разумею людзей, якія правамерна гонарацца вынікамі сваёй працы. І шчыра хацелі б падзяліцца імі з іншымі. З краінай, якая дае магчымасць знаходзіць у нашым штодзённым жыцці абсалютна ўнікальныя непаўторныя моманты і фіксаваць іх на камеру. І, можа, да наступнага конкурсу нешта зменіцца, і перш чым пісаць пра нашых удзельнікаў, мы загадзя зможам пазнаёміцца з іх фільмамі ўсёй грамадой, каб дакладна ведаць — тут мы лепшыя!

А пакуль паверым журы на чале з Аляксеем Пагрpreбным (членам расійскай Нацыянальнай акадэміі мастацтваў «Ніка»), якое адзначыла лепшы фільм.

У ім лепшым дакументальным фільмам сёлетняй праграмы, названы фільм «Кармэн сустракае Борат», створаны Мерседэс Сталенхоф з Галандыі. Яна распавяла пра мары цыганскай дзяўчыны Кармэн з румынскай вёскі, але зрабіла гэта ў бліскучым стылі, так, што паводле слоў старшыні журы, фільм глядзіцца, нібыта гэта... ігравое кіно. У той час «за лепшую рэжысуру дакументальнага кіно» адзначана Алёна Палуніна і яе эстонска-фінскі праект «Рэвалюцыя, якой не было» пра... расійскія падзеі, якія здарыліся падчас прэзідэнцкіх выбараў. І гэта ўжо зусім іншае кіно.

Нашы дакументалісты сёлета без узнагароду. Што ж, бывае і так. Год на год не прыходзіцца. Зрэшты, няхай жа і нашы госці трошкі павыграюць... І ўсё-такі нейкія высновы з гэтага зрабіць можна. Напрыклад, такую: у аўтараў быў бы стымул працаваць з большым імпэтам тады, калі б яны дакладна ведалі, што іх фільмы змогуць пабачыць у роднай краіне не толькі падчас фестываляў.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Сёння ў Палацы Рэспублікі на цырымоніі закрыцця Мінскага кінафестывалю назавуць лепшыя фільмы праграмы, а іх стваральнікі атрымаюць «лістападаўскія» прызы. У Доме кіно пакажуць фільм — пераможцу конкурсу іграва кіно.

«УСЕ ЖАНРЫ ДОБРЫЯ, АКРАМЯ СУМНАГА»

«Спадзяюся, што дзякуючы маім парадам вы дапусціце ў жыцці менш памылак».

Акцёр, які напрыканцы 70-х паказаў усім «кураня табака», правёў майстар-клас ва Універсітэце культуры

У пачатку сустрэчы са студэнтамі знакаміты расійскі артыст і прадзюсар Леанід Ярмольнік шчыра прызнаўся, што ніколі ў жыцці майстар-класаў не даваў. «Я такой назвы насамрэч баюся. Прыйсці і паказаць «кураня табака» — гэта не майстар-клас. Я назваў бы гэта ўсё ж такі размовай па інтарэсах. Я адкрыты для любой тэмы, але тон павінны задаваць вы».

«ФЕСТЫВАЛЬ АТРЫМЛІВАЕЦЦА»

— Быць запрошаным на «Лістапад» — вялікі гонар для любога акцёра. Хачу аддаць даніну павагі чалавеку, які ўжо 16 гадоў непакоіцца аб кінафестывалі. Я ведаю, як Расціслаў Іванавіч перажывае, каб фестываль атрымаўся. І ён атрымліваецца. Арыгінальнасць і своеасаблівасць беларускага кінафестывалю заключаецца ў тым, што ў яго рамках праводзяцца сустрэчы накшталт нашай з вамі. Звычайна фестываль гэта, выключна, паказ фільмаў, тусоўкі, п'янкі, новыя знаёмствы, сувязі і ўсё... За тры дні стамляешся, бо і выпіць столькі нельга, і знаёміцца столькі немагчыма.

«АЛА ПУГАЧОВА ДЗЯЛІЛА СА МНОЙ ПЕРШАЕ МЕСЦА»

— Сучасную моладзь адрознівае, як мне здаецца, дрэннае паглыбленне ў гісторыю. Маё пакаленне неяк больш звяртала ўвагу на старое кіно, на класіку. Сёння вельмі шмат маладых артыстаў, імёны якіх запомніць немагчыма. Яны ўсе здымаюцца з раніцы да вечара. У 38 серыялах, у 150-серыйных фільмах. Яны ўсё ўмеюць рабіць — і плакаць і думаць, але я чамусьці іх не адрозніваю. Мяне ў свой час запомнілі, як «кураня табака». Пантаміма запала тэлегледачам у душу. Але насамрэч гэта была секундная імправізацыя, якую мы прыдумалі з Сашкам Абдулавым у мяне дома. Я ў адзін момант стаў знакамітым. Ала Пугачова дзяліла са мной першае месца. Яна гэта сама гаварыла. Ведаеце, я ніколі не будаваў на гэтым кар'еру. Але заробкі па 110 рублёў... Але гэта сацыялізм у горшым варыянце. Вось кітайцы таксама лічаць, што ў іх сацыялізм, але ён лепшы за амерыканскі капіталізм. Кітайцы зараз зробяць усю планету. Ва ўсіх крызіс, а яны ў шакаладзе. Ва ўсіх ўсё ўпала, у іх усё ўс... *(смяецца)*.

«Я ДЗІКІ ПРАЦІЎНІК ТАГО, ШТО ЗДЫМАЮЦЦА ФІЛЬМЫ ПРА ЧАЧЭНСКУЮ ВАЙНУ»

— Я праціўнік таго, што цяпер здымаюць фільмы аб нядаўніх падзеях. Перакананы, каб паказаць усё правільна і дакладна, павінна прайсці жыццёвая мітусня і застацца толькі асноўнае. Прынамсі, фільмы пра чачэнскую вайну — гэта заўсёды хлусня. Што могуць пацвердзіць яшчэ жывыя сведкі. Усе гэтыя фільмы, на мой густ, амаральныя. Вас цікавіць, як я стаўлюся да фільма Мікіты Міхалкова «12»? Гэта крадзеж, гэта кіно было ў амерыканцаў. Ён узяў проста і адаптаваў яго да нашай сітуацыі. У канцы фільма Міхалкоў кажа вам — пойдзем і я пакажу, як правільна жыць. Дайце толькі руку. Ён практычна Бог *(смяецца)*. Мікіта, несумненна, прафесіянал найвышэйшага класа, але... Я не вялікі прыхільнік гэтай карціны. Яе канцэпцыя мне не падабаецца. Мікіта апошні час гуляе ў нейкія гульні, і такое адчуванне, што некаму хоча дагадзіць. Як вы думаеце, каму?.. Але пры гэтым магу сказаць, што артысты, якія там здымаліся, ігралі цудоўна.

«ПАСПРАЧАЎСЯ З АДНАКУРСНІКАМІ, ШТО ГОЛЫ ПЕРАЙДУ ПРАСПЕКТ»

— Вы, напэўна, ведаеце, што студэнт, які паступае на акцёрскі, на першым курсе лічыць сябе народным, на другім курсе ён ужо заслужаны, на трэцім — проста артыст, а на чацвёртым — г...но. Дык вось і мы, калі вучыліся на другім курсе, лічылі, што ўсё можам. Наогул усё. Вось я і паспрачаўся з аднакурснікамі, што голы перайду праспект побач з кінатэатрам «Кастрычнік». Той, хто быў у Маскве, ведае. Зразумела, што ўвесь курс быў у курсе. Усе чакалі відовішча. Ну я таксама не пальцам роблены: прызначыў гэты пераход роўна ў гадзіну ночы. Увесь дзень ніхто не сыходзіць з інстытута. Я сваё слова стрымаў. Праўда, гэта быў крышку іншы час. Тады і транспарту менш было, і святла. Таму бачылі гэта толькі мае аднакурснікі, бо раней у позні час у Маскве нікога не было на вуліцы.

«ЛЕПШАГА ФІЛЬМА, ЧЫМ «ТОЙ САМЫ МЮНХГАЎЗЕН», НЯМА»

— І не таму, што я там здымаўся. Там кожны кадр запамінальны. Любога з вас падымі — і вы памятаеце ўвесь фільм. Нямногія фільмы гэтым могуць пахваліцца. Я шчасліўчык, бо ў маладым узросце зняўся адразу ў двух фільмах— «Сышчык» і «Той самы Мюнхгаўзен». Адразу пашчасціла працаваць з Захаравым, Горыным, Янкоўскім, Абдулавым... Гэта было нешта неверагоднае. Тады было менш прапаноў і, зразумела, любую прапанову здымацца я заўсёды, яшчэ не чытаючы сцэнару, прымаў. Цяпер жа перабіраю *(усміхаецца)*. Бывае, што месяц не здымаюся, два не здымаюся. Жонка часам кажа: «Вунь іншыя артысты здымаюцца, нават калі кіно дрэннае. Няхай яго ніхто глядзець не будзе, але ж грошы ты атрымаеш». Але сам працэс здымак у дрэнным кіно мяне... Я ведаю, што страчу на гэта вельмі шмат здароўя і нерваў. Таму пастараюся настолькі, наколькі хопіць мазгоў і здаровага сэнсу, вас не засмучаць тым, што звязана з маім імем, і як акцёр, і як прадзюсар.

«ЗНЯЦЦА Ў ДРЭННЫМ КІНО — ТОЕ Ж САМАЕ, ШТО ПЛЮНУЦЬ У ВЕЧНАСЦЬ»

— Не раю здымацца ў дрэнных фільмах. Калі вам нецікава, не трэба жыць ілюзіяй, што гэта будзе цікава некаму іншаму. Нікога вы, акрамя сябе, не падманеце. Гэтым прынцыпам кіруюся я. Хоць гэта часам нялёгка. Вось Валера Тадароўскі, мой партнёр шматгадовы, спадзяюся, і далей будзем працаваць, адкрыў вялікую колькасць артыстаў, якія сёння супярэжркі. Машкоў, напрыклад, упершыню здымаўся ў фільме Тадароўскага. Чулпан Хаматава таксама. І Жэня Міронаў... Зараз мы з Валерам знялі фільм «Стылягі». Тадароўскі адкрыў такіх маладых талентаў, як Максім Матвееў, Антон Шагін, Ігар Вайнаркоўскі... Я вам гарантую, што яны ў найбліжэйшыя трычатыры гады будуць суперзоркамі. Я, як прадзюсар, іх падчас здымкаў фільма перасцерагаў ад удзелу ў іншых праектах. Не паспееце стаць добрымі артыстамі, як вас сапсуюць, казаў ім. Не паслухалі. Пакуль выходзілі «Стылягі», яны ўжо зняліся ў пяці-шасці фільмах. Адзін горшы за другі. Я згодны, што «зняцца ў дрэнным кіно — тое ж самае, што плюнуць у вечнасць». Дакладней, прабачце, «на... у вечнасць». Гэтак казала Фаіна Георгіеўна Ранеўская, ёй дазволена.

«Я ТРЫ МЕСЯЦЫ ЎГАВОРВАЎ ЯНКОЎСКАГА ЗДЫМАЦЦА Ў РЭКЛАМЕ»

— Алег Іванавіч Янкоўскі вельмі старанна выбіраў ролі для кіно. Месяцамі вырашаў здымацца ці не. Таму ў яго няма дрэнных роляў. І вось яму прапанавалі стаць тварам аўтамабіля «Вольва». Прапаноўвалі за гэта вельмі добры ганарар. Я тры месяцы ўгаворваў Алега здымацца ў рэкламе. Ён так і не згадзіўся. Зразумела, нельга акцёру, які сябе паважае, рэкламаваць пракладкі ці каўбасу. Мне балюча глядзець на Лену Якаўлеву, калі яна рэкламуе пральны парашок. Цудоўная ж актрыса. Але ёсць рэчы, рэкламаваць якія не сорамна. Ці згадзіўся б я здымацца ў рэкламе? Не прапаноўваюць цяпер, бо ведаюць, што адмоўлюся. Але *(задумаўся)*... я авантурыст па натуры, калі я доўга думаю, дзе мне ўзяць грошы на новае кіно, і тут мне прапаноўваюць зняцца ў рэкламе за 5 мільёнаў долараў, тут жа пагаджуся. Разумееце чаму? Бо ў мяне будзе маральнае апраўданне: я зняўся ў рэкламе і атрымаў за гэта такія вялікія грошы, на якія змагу зняць яшчэ адно кіно з Тадароўскім. Але пяць мільёнаў ніхто ніколі не прапануе. А за 50 тысяч — ніколі.

«У МЯНЕ ТАКОЕ АДЧУВАННЕ, ШТО ЯНЫ МЯНЕ КІНУЛІ»

— Сашкі Абдулава ўжо няма амаль два гады, прайшло паўгода, як сышоў Алег Янкоўскі. Я страціў сваіх самых блізкіх сяброў, меркаванне якіх для мяне было самым важным. Я ўзгадваю Абдулава, Янкоўскага, бо не ўзгадваць іх не магу. Дагэтуль не магу звыкнуцца з думкай, што іх няма. У мяне быў нават комплекс, такое адчуванне, што яны мяне кінулі. Што датычыцца Алега, то нам не трэба было пачынаць размову з пачатку, мы маглі пачынаць з канца. Сёння ў мяне няма чалавека, які б мяне да такой ступені разумеў і якога б я так разумеў. Мне ў жыцці больш за ўсё пашанцавала, што я быў сярод гэтых людзей.

«ГЛЯДЗЕЦЬ І БАЧЫЦЬ, СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ»

— Гадоў да 45 я наогул не звяртаў увагі на надвор'е. Мне было абсалютна абыякава — снег на дварэ ці дождж, сцюдзёна ці душна. Я ўвесь час працаваў. Раней я не чуў, як спяваюць птушкі, клянуся. Не звяртаў увагі на тое, якімі прыгожымі бываюць кветкі, дагледжанымі газоны. Гэта апошнія пяць-сем гадоў я стаў бачыць і чуць. І вельмі шкадую, што не раней. Пастарайцеся быць у гэтым сэнсе больш мудрымі за мяне, пастарайцеся ўсё прыкмячаць. Не проста глядзець, але і бачыць, не проста слухаць, але і чуць. Вакол вельмі шмат прыгажосці, і яна робіць ваша жыццё больш напоўненым.

Надзея ДРЫЛА. Фота аўтара.

Як нас дураць

ВЫЙШЛА ЗАМУЖ ЗА... КВАТЭРУ?

У Оршы пракуратура дапамагла мясцоваму жыхару вярнуць двухпакаёвую кватэру, якую ён страціў пасля жаніцьбы.

Як паведаміла «Звяздзе» **начальнік аддзела па наглядзе за адпаведнасцю закону судовых пастаноў па грамадзянскіх справах Ірына ЦІТКОВА**, работнік аднаго з прадпрыемстваў чыгункі, якому пад 50 гадоў, пасля смерці маці адзін пражываў у двухпакаёвай кватэры.

Зарэгістраваўшы шлюб з грамадзянкай, праз некалькі дзён прапісаў яе ў гэтую кватэру. І ўжо праз паўтара месяца гаспадар быў адтуль выпісаны ў сувязі з пераменай месца жыхарства. А насамрэч фактычна аказаўся на вуліцы. Новая «кватарантка», як і патрабуецца, заключыла дагавор найму з мясцовым камунальным прадпрыемствам. Потым у кватэру пасяліліся яе дачка і ўнук. Шлюб па ініцыятыве прадпрымальнай жанчыны быў скасаваны.

Няшчасны бяздомны паскардзіўся на цяжкае жыццё на працы. Адтуль звярнуліся па дапамогу ў пракуратуру. Правялі праверку. Высветлілася, што былы ўладальнік кватэры раней знаходзіўся на ўліку ў псіханеўралагічным дыспансэры. Але быў зняты з уліку, бо не праходзіў лячэнне, да ўрача не звяртаўся.

Было вызначана, што ён пакутуе ад псіхічнага захворвання з 1974 года, таму і не мог поўнасцю кантраляваць свае дзеянні.

Пракурор Оршы звярнуўся ў суд з патрабаваннем прызнаць раней зарэгістраваны шлюб незаконным і несапраўднымі ўсе «аперацыі» са спрэчнай кватэрай. Іскі былі задаволены. Рашэнні суда ўвайшлі ў законную сілу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩИХ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			**Строительное республиканское унитарное предприятие «Трест Белтрансстрой» (РУП «Трест Белтрансстрой»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь**	**Республиканское унитарное производственное сельскохозяйственное предприятие «Птицефабрика «Дружба» (РУПСП «Птицефабрика «Дружба»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь**
Адрес			220030, г. Минск, ул. Советская, 8, комн. № 1-22	225316, Брестская область, Барановичский район, пос. Жемчужный
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Строительство	Производство мяса цыплят-бройлеров
Положение на рынке			Не занимает доминирующее положение	Занимает доминирующее положение
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации			Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12	Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, 220005, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12
Численность работающих, чел.			2 625	2 343
Срок предъявлений претензий			Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования
Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.			37 291 597 200	196 306 147 826
Стоимость основных фондов – всего, руб.			43 098 537 141	108 641 590 674
Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га			51,187	8 180
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.			55 360 000	325 342 180
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.			нет	нет
Финансовое состояние объекта, руб.	**Балансовая прибыль**		4 971 000 000	24 545 675 288
	Задолженность	**кредиторская**	21 202 000 000	9 623 442 750
		дебиторская	33 407 000 000	8 126 894 518

УНП 100745627.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРИВАТИЗАЦИИ

Открытый конкурс по продаже объектов приватизации коммунальной собственности г. Минска состоится 22 декабря 2009 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. № 310.
Продавец и организатор конкурса: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, тел. (8017) 200 20 89, каб. 227.
На конкурс выставляются:

№ лота	**лот № 1**	**лот № 2**	**лот № 3**	**лот № 4**
Предмет конкурса	Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания)	Структурное подразделение ПТ КУП «Чайка» (прачечная самообслуживания)	Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания)	Структурное подразделение КУП «Бытэкс» (прачечная самообслуживания)
Место нахождения предмета конкурса	г. Минск, пер. Северный, 17	г. Минск, ул. Пожарского, 27	г. Минск, ул. Ташкентская, 7	г. Минск, ул. Московская, 20
Начальная цена предмета конкурса, руб.	1 101 438 194	1 096 619 254	19 714 654	73 853 871
Размер задатка (рублей), порядок и сроки его перечисления	110 143 819 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	109 661 925 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	1 972 000 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества	7 386 000 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в конкурсе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества
Сведения об объектах недвижимого имущества, входящих в состав объектов приватизации	Здание (прачечная) специализированное для бытового обслуживания населения (инвентарный номер 500/С – 28281); здание (котельная) специализированное энергетики (инвентарный номер 500/С-28143)	Здание (прачечная) специализированное для бытового обслуживания населения (инвентарный номер 500/С – 30793); здание (котельная) специализированное коммунального хозяйства (инвентарный номер 500/С – 30792)	—	—
Условия конкурса	1. организация физкультурно-оздоровительного комплекса; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи; 4. заключение новым собственником договора безвозмездного пользования имуществом, находящимся в коммунальной собственности г. Минска, на объект инженерной инфраструктуры общего пользования (зеленые насаждения) с Управлением бытового обслуживания населения Мингорисполкома	1. частичное сохранение профиля объекта по согласованию с Управлением бытового обслуживания населения Мингорисполкома и администрацией Заводского района г. Минска; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи	1. частичное сохранение профиля объекта по согласованию с Управлением бытового обслуживания населения Мингорисполкома и администрацией Заводского района г. Минска; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи	1. частичное сохранение профиля объекта по согласованию с Управлением бытового обслуживания населения Мингорисполкома и администрацией Московского района г. Минска; 2. сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками структурного подразделения); 3. погашение новым собственником кредиторской задолженности на момент подписания акта приема-передачи
Приоритетное условие для определения победителя конкурса	наивысшая цена предмета конкурса	наивысшая цена предмета конкурса	наивысшая цена предмета конкурса	наивысшая цена предмета конкурса
Условия оплаты предмета конкурса	оплата за объект приватизации производится в бюджет г. Минска в рассрочку	оплата за объект приватизации производится в бюджет г. Минска в рассрочку	оплата за объект приватизации производится единовременным платежом в течение 30 календарных дней от даты подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска	оплата за объект приватизации производится единовременным платежом в течение 30 календарных дней от даты подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска
Численность работающих, человек	14	8	4	4
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий	нет	нет	нет	нет
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов (патенты, торговые знаки и другие)	нет	нет	нет	нет
Финансовое состояние структурного подразделения на дату оценки – **Активы по балансу, рублей**	1 116 068 689	1 106 435 210	23 395 321	78 534 534
Финансовое состояние структурного подразделения на дату оценки – **Задолженность кредиторская, рублей**	14 261 575	9 815 956	3 680 667	4 680 663

Порядок проведения конкурса определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Минского городского Совета депутатов от 23 сентября 2009 г. № 250.

Продавец, организатор конкурса вправе отказаться от проведения конкурса в любое время, но не позднее чем за 30 дней до наступления даты его проведения. Предмет торгов может быть снят с торгов по решению Продавца, организатора конкурса, конкурсной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Заявления на участие в конкурсе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 21 декабря 2009 года.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения конкурса.

При поступлении заявления на участие в конкурсе от одного участника и соответствии его предложения условиям конкурса продажа предмета конкурса по решению комиссии производится этому лицу на предложенных им условиях.

Победитель конкурса в сроки, указанные в протоколе о результатах конкурса, обязан возместить организатору конкурса затраты, связанные с организацией и проведением конкурса, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом конкурса при заключительной регистрации под роспись.

Новым собственникам объектов приватизации (лоты №№ 3, 4) гарантируется право на заключение долгосрочного договора аренды занимаемых структурными подразделениями помещений, относящихся к коммунальной собственности г. Минска и не вошедших в состав приобретаемого имущества, сроком на 15 лет.

Осмотр предмета конкурса на местности участниками конкурса производится представителем Управления бытового обслуживания населения Мингорисполкома, конт. тел. (8017) 227 21 60, коммунального унитарного предприятия «Бытэкс», конт. тел. (8017) 203 25 65, коммунального унитарного предприятия «Чайка», конт. тел. (8017) 281 12 58.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРИВАТИЗАЦИИ

Открытый аукцион по продаже объекта приватизации коммунальной собственности г. Минска состоится 22 декабря 2009 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39 (зал аукционов).

Продавец и организатор аукциона – Минский городской территориальный фонд государственного имущества: 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8, конт. тел (8017) 200 20 89.

На аукцион выставляется:

Предмет аукциона		**предприятие как имущественный комплекс, находящееся в хозяйственном ведении торгово-закупочного коммунального унитарного предприятия «Золотая осень»**
Место нахождения предмета аукциона		г. Минск, ул. В. Хоружей, 15
Начальная цена предмета аукциона, руб.		28 386 409
Размер задатка (рублей), порядок и сроки его перечисления		2 839 000 рублей на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества до подачи заявления на участие в аукционе
Условия аукциона		сохранение назначения объекта приватизации;сохранение числа рабочих мест сроком на 2 года (с продлением трудовых отношений с работниками)
Условия оплаты предмета аукциона		оплата за объект приватизации производится единовременным платежом в течение 30 календарных дней от даты подписания договора купли-продажи в бюджет г. Минска
Численность работающих, человек		21
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий		нет
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов (патенты, торговые знаки и другие)		нет
Финансовое состояние на дату оценки	**Активы по балансу, рублей**	126 666 006
	Задолженность кредиторская, рублей	192 584 572

Срок предъявления претензий кредиторов к приватизируемому объекту – в течение 30 календарных дней с даты опубликования извещения.

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Минского городского Совета депутатов от 23 сентября 2009 г. № 250.

Продавец, организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения. Предмет аукциона может быть снят с торгов по решению Продавца, организатора аукциона, аукционной комиссии в любое время до объявления объекта проданным.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227 по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 21 декабря 2009 года.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона по решению комиссии продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона.

Победитель аукциона в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона, обязан возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

Новому собственнику объекта приватизации гарантируется право на заключение долгосрочного договора аренды занимаемого предприятием помещения, относящегося к коммунальной собственности г. Минска и не вошедшего в состав приобретаемого имущества, сроком на 15 лет.

Осмотр предмета аукциона на местности участниками аукциона производится представителем Главного управления потребительского рынка Минского горисполкома, конт. тел. (8017) 200 70 16 или представителем предприятия «Золотая осень», конт. тел 284 50 50.

ГУМАРАМ ПА КРЫЗІСЕ І ГРЫПЕ

Магіляўчанка Тамара Міхайлаўна Цыганкова мае рэдкае хобі. Яна — чытальніца беларускага гумару. Чытае байкі беларускіх паэтаў і складае свае. Тамара Міхайлаўна ўжо ўдарыла па крызісе жаночай байкай, а цяпер шукае рыфмы, каб падбадзёрыць спужаных грыпам людзей. Не панікаваць, а паставіцца да сітуацыі з гумарам — такі жыццёвы дэвіз гэтай жанчыны.

АКТУАЛЬНАЯ ЗАМОВА АД ПАДХАЛІМСТВА

«Маё пенсійнае жыццё пабегла», — кажа Цыганкова. У той час, калі нават далёкія ад сталага ўзросту людзі ўсё болей аддаюць перавагу канапе і тэлевізару, Тамара Міхайлаўна дома не сядзіць: «Альбо я перамагу старасць, альбо яна мяне!» Яе радасць жыцця — гэта стасункі з людзьмі.

Яна нарадзілася ў вёсцы на Віцебшчыне, у сям'і вясковых настаўнікаў. Бацькі спявалі, танцавалі, ладзілі цікавыя вечарыны. Дачка сама ўзяла ў рукі гармонік: у лазні пры свечцы да раніцы займалася — так дзяўчыне хацелася граць і спяваць.

Пасля заканчэння Магілёўскага педагагічнага інстытута Цыганкова паспяхова працавала ў дашкольнай установе, але яе другое жыццё, звязанае з мастацкай самадзейнасцю, захапляла не меней.

Усё пачалося з інтэрната рабочай моладзі, дзе Тамара Міхайлаўна працавала выхавальніцай.

— Да нас прыехалі артысты з Мінска, а канцэрт, дарэчы, вяла маладая Элеанора Язерская, — узгадвае магіляўчанка. — І там прачыталі «Замовы» Ніла Гілевіча! Я ў адзін момант ну проста закахалася ў гэтыя замовы! Падышла пасля канцэрта і прасіла напрамілы Божа сказаць, дзе іх можна знайсці. З тых часоў я ўсе замовы Гілевіча ведаю на памяць, чытаю на кожным выступленні, і народ іх сустракае на «ўра»!

Спачатку яна чытала для сяброў, а потым выйшла і на вялікую сцэну. Гэта было ў 1975 годзе. Але і да сёння малітва п'яніцы гучыць для грамадства актуальна: «Каб знаёмыя грошы пазычалі, каб прахожыя рук не тапталі, каб сабакі ногі не лізалі, каб дружыннікі не заўважалі...»

— А яшчэ болей актуальная замова ад падхалімства, — працягвае дэкламаваць любімыя творы Тамара Міхайлаўна. — За раба Божага, «каб не лізаў так часта ён роднаму начальству ні наскі, ні пяткі, ні ля пупа складкі, ні крыбтовай косці, ні сярэдняй часці, ні спераду забягаючы, ні збоку заглядаючы, ні ззаду даганяючы, ні знізу падпаўзаючы! Хай адчуе, што ён чалавек — ныне, і прысна, і навек!»

ЦЕШЧЫ НЯМЕЦКІЯ І ЎКРАІНСКІЯ

З выдатнымі «Замовамі» Цыганкову запрасілі ў вядомы на Магілёўшчыне народны ансамбль «Медуніца», з якім яна аб'ездзіла ўсю Беларусь ды пабывала ў замежжы.

Тамары Міхайлаўне давялося нават вывучыць нямецкі фальклор. Праўда, немцы разумелі сэнс далёка не ўсіх беларускіх баек: ім, напрыклад, няўцям, чаму зяць хоча непрыемнасцяў цешчы. Таму давялося ўзяцца за нямецкія зборнікі гумару.

Найбольшай папулярнасцю ў публікі на Магілёўшчыне карыстаюцца байкі ад беларускіх паэтаў: Ніла Гілевіча, Уладзіміра Ермалаева, Міколы Чарняўскага, Рыгора Барадуліна, Тамары Барадзёнак.

— Гады ідуць, а гумарэска «Канфуз» Ермалаева пра часіны талонаў і купонаў заўсёды зрывае апладысменты, — кажа Цыганкова. — Пра цікага мужычка Змітрака, які захацеў яечні, але ў краме яму заявілі: «У вас жа выразаны яйкі!»

Любіць беларускі народ і ўкраінскі гумар: патрапаны доўгім жыццём зборнік гумарыстычных вершаў Паўла Глазавога ёй калісьці даслала з Украіны цётка. З яго Тамара Міхайлаўна вучыць і чытае байкі па-ўкраінску.

— Ну, вядома ж, усе разумеюць! — пацвярджае чытальніца. — Ну як не зразумець дзядзьку Фёдара, у якога гадзюка цешчу пакусала, ёй нічога, а гадзюка здохла? Але ўсё ж найбольш я люблю беларускі гумар — трапны, жыццёвы, народны. І на нашай прыгожай мове.

КРЫЗІС НА САПРАЎДНЫХ МУЖЫКОЎ

Яна прызнаецца, што ў дзяцінстве мала размаўляла па-беларуску. З мовай пазнаёмілася ў інстытуце і зразумела, што беларуская — гэта сапраўды яе родная мова.

— Я калі чую правільную беларускую мову, то адчуваю сапраўдную асалоду, і беларускія выразы мне даюцца лягчэй за рускія, — прызнаецца Цыганкова. — Я люблю сваю мову, народныя традыцыі і выдатны беларускі гумар. Калі выступаю з байкамі ў сельскіх клубах, то бабулі звычайна кажуць: «Дзетачка, гэта ўсё з нашага жыцця!»

Свае байкі на актуальныя жыццёвыя тэмы Тамара Міхайлаўна таксама піша па-беларуску. «Ой жа, крызіс, ой жа, крызіс, усе крычаць з усіх бакоў. А ў нас, дзяўчаты, крызіс на харошых мужыкоў!» Паводле байкі, эканамічныя праблемы — гэта дробязь у параўнанні з тым, што звяліся сапраўдныя мужыкі: «Хто сям'ю сваю шануе, ды на жонку не крычыць, іх жа можна пагалоўна ўсіх па пальцах палічыць!»

Тэмы для баек падказвае само жыццё: як імкнулася схуднець, як у 1990-я ездзіла ў Польшчу з канцэртамі і адначасова гандлявала, як лячылася ў санаторыі.

— З таго санаторыя атрымалася забойная байка, — пацвярджае Цыганкова. — Усе хворыя ўдзень кульгаюць, скардзяцца на здароўе. «Але вечар наступае, санаторый ажывае: хто сагнуты, хто з кійком, усе на танцы ў клуб бягом!»

ГУМАР НЕ ДАСЦЬ РАСКІСНУЦЬ

Яна піша прыпеўкі, вершы і замовы для розных людзей і арганізацый: для камунальнікаў, для дзіцячага садка, для сельскай гаспадаркі. Тамара Міхайлаўна сябруе з прыгарадным СВК «Палыкавічы» і вельмі часта выступае на святах у сельскіх клубах ды на фермах.

— Мы як франтавыя артысты, падарожнічаем на аўтобусе: забаўляем, спяваем, байкі чытаем, — расказвае чытальніца. — Робім пасядзелкі з пенсіянерамі пад баян і пірагі з чаем. І скажу вам, што вясковая публіка — самая ўдзячная. Вяскоўцы яшчэ захоўваюць народныя традыцыі, ведаюць мову, стаяць ля вытокаў нашага жыцця.

Але трэба адзначыць, што і гарадская вытанчаная публіка, якая цягнецца да арыгінальных забаў, з задавальненнем слухае беларускі гумар: нядаўна на вяселлі ў рэстарацыі сябры папрасілі Тамару Міхайлаўну пачытаць, дык яе там выклікалі на «бис» нават афіцыянткі: маўляў, так смешна і па-беларуску, ніколі такога не чулі...

Цыганкова лічыць, што без гумару немагчыма жыць. Без яго жыццё было б вельмі беднае.

— У маім жыцці гумар прайшоў чырвонай ніткай, ён упрыгожыў маё жыццё, — кажа Тамара Міхайлаўна. — Мне толькі адно шкада: мала чытальнікаў беларускага гумару, асабліва на ўсходзе Беларусі. Нас на ўвесь Магілёў толькі два чалавекі. Але зборнікі беларускіх паэтаў — гэта кладоўка гумару.

Аптымістка і актывістка, яна ўсім жадае захоўваць вытрымку і пазітыўнае стаўленне да жыцця, нягледзячы на ўсе складанасці, крызісы і грыпы. «Нельга раскісаць, што я і раблю!» — сказала магілёўская чытальніца беларускага гумару.

Ілона ІВАНОВА.

Краіна здароўя

Выпуск № 48 (162)

ВАЙНА ІНТАРЭСАЎ: беларускі «Арпетол» будзе змагацца за гонар мундзіра

У нагнятанні панічных настрояў вакол пандэміі свінога грыпу многія абвінавачваюць апошнім часам фармацэўтычныя кампаніі, якія арганізуюць такім чынам сабе грандыёзныя піяр-кампаніі. А ў швейцарскага прэпарата «Таміфлю», калі давяраць афіцыйным рэкамендацыям Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САА3), і ўвогуле няма ў Беларусі канкурэнтаў. На адной з апошніх прэс-канферэнцый кіраўнік Бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь Ягор Зайцаў паведаміў, што беларускі прэпарат «Арпетол», як і яго расійскі аналаг «Арбідол», не ключаны ў пералік сродкаў, якія САА3 рэкамендуе для лячэння і профілактыкі пандэмічнага грыпу. Маўляў, у Сусветнай арганізацыі аховы здароўя няма доказаў іх эфектыўнасці ці неэфектыўнасці. І ўвогуле, «Арпетол» — гэта не супрацьвірусны, а імунастымулюючы прэпарат.

— Прызнаемся, нас вельмі непакоіць тая акалічнасць, што ў некаторых СМІ распаўсюджваецца інфармацыя аб тым, што «Лекфарм» выпускае «ці то нелегальны, ці то неэфектыўны прэпарат». ***Таму хацелася б данесці да беларусаў афіцыйную інфармацыю: прэпарат «Арпетол» быў зарэгістраваны ў Беларусі, Расіі, Малдове і Азербайджане пасля праходжання ўсіх вызначаных заканадаўствам працэдур як супрацьвірусны і імунамадулюючы сродак,*** — падкрэсліў у гутарцы з журналістам «Звязды» **намеснік начальніка аддзела маркетынгу фармацэўтычнага прадпрыемства «Лекфарм» Юрый ГРЫГОР'ЕЎ.** — Да таго ж «Арпетол» быў уключаны ў пратаколы лячэння ВРВІ і грыпу Міністэрствам аховы здароўя Беларусі, якое кантралюе правільнасць аказання медыцынскай дапамогі. Хачу паведаміць таксама, што ў жніўні—верасні гэтага года ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь былі праведзены медыцынскія даследаванні супрацьвіруснага дзеяння «Арпетолу» і даказана яго актыўнасць у дачыненні да 26 тыпаў вірусаў грыпу А і В, у тым ліку і эфектыўнасць яго ў дачыненні да пандэмічнага вірусу грыпу А/H1N1 як у плане лячэння, так і ў плане прафілактыкі.

Цяпер мы рыхтуемся да правядзення клінічных выпрабаванняў прэпарата «Арпетол» з удзелам статыстычна даставернай колькасці пацыентаў з вострымі рэспіраторнымі віруснымі інфекцыямі і грыпам, уключаючы інфіцыраваных грыпам A/H1N1. Клінічныя выпрабаванні будуць праводзіцца згодна з пратаколамі Міністэрства аховы здароўя на базе сталічных медустаноў пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў кафедраў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Шэраг аналагічных даследаванняў «Арбідолу» (расійскі аналаг «Арпетолу») быў праведзены ў Расіі і ва Украіне з удзелам больш як 14 тысяч пацыентаў.

Юрый Грыгор'еў запэўніў, што магутнасці прадпрыемства «Лекфарм» дазваляюць забяспечыць аптэчную сетку «Арпетолам» у неабходнай колькасці. Аднак ёсць адзін стрымліваючы фактар — кампаненты для вытворчасці гэтага прэпарата закупляюцца за мяжой, і іх немагчыма імгненна вырабіць і даставіць у Беларусь. Тым не менш у лістападзе ў аптэчныя сеткі краіны было адпушчана ўжо больш як 477 тысяч упаковак «Арпетолу». Цяпер на прадпрыемстве чакаюць чарговую партыю субстанцыі, дастатковую для выпуску яшчэ каля 280 тысяч упаковак да канца месяца. Такім чынам, замест запланаваных на лістапад 600 тысяч упаковак «Лекфарм» выпусціць 720 тысяч упаковак вострадэфіцытнага прэпарата. Да таго ж на «Лекфарме» рыхтуюцца і да верагоднай хвалі сезоннага грыпу ў другой палове зімы. Да сярэдзіны лютага 2010 года «Лекфарм» плануе вырабіць 2,5 мільёна ўпаковак «Арпетолу».

— Магчыма, вам цікава будзе даведацца, што ў бездэфіцытным 2009 годзе суадносіны паставак «Арпетолу» ў дзяржаўныя і прыватныя аптэкі былі 70 і 30 працэнтаў адпаведна. Такія ж суадносіны мы захоўваем і цяпер, — дадаў Юрый Грыгор'еў.

Надзея НІКАЛАЕВА.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Бяскроўная медыцынская рэвалюцыя

Нямецкія дактары вучаць калег у Магілёве рабіць аперацыі паводле найноўшых тэхналогій

Малаінвазіўныя аперацыі — значыць амаль што бяскроўныя. Новую аператыўную тэхніку ў гінекалогіі дэманструюць на канферэнцыі ў Магілёўскай бальніцы № 1.

Праект, паводле якога другі год запар у Магілёў прыязджаюць спецыялісты з Кёльна, рэалізуецца з ініцыятывы таварыства «Дапамога дзецям, якія пацярпелі ад Чарнобыля». У Магілёў прыязджае вялікая каманда ўрачоў і медыцынскіх сёстраў, каб правесці паказальныя аперацыі. Мэта — трансфер тэхналогій бяскроўных аперацый.

— Магілёўскія ўрачы атрымалі новыя веды і карыстаюцца імі ў сваёй практыцы, — лічыць **прафесар Томас РОМЕР, галоўны ўрач Евангельскай клінікі родадапамогі і гінекалогіі Кёльн Ваерталь.** — Гэта дасць магчымасць бальніцы вырвацца ўперад па ўкараненні бяскроўных аперацый і ратаваць вашых жанчын.

— Нашы ўрачы авалодваюць методыкамі, якімі цяпер карыстаюцца перадавыя клінікі Еўропы, — пагадзіўся **галоўны ўрач Магілёўскай бальніцы № 1 Уладзімір ПЯЧКОЎСКІ.** — Іх укараненне — гэта наша перспектыва.

Аднак сучасная медыцына залежыць не толькі ад ведаў урачоў. Вялікую ролю адыгрываюць інвестыцыі, набыццё новай тэхнікі. І ў гэтым беларускія медыкі пакуль значна прайграюць нямецкім калегам.

— Малаінвазіўныя ці бяскроўныя методыкі лячэння — гэта дарагое задавальненне, — прызнаў **галоўны ўрач Магілёўскай цэнтральнай паліклінікі Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ.** — Сёлета бюджэт горада выдаткаваў 140 мільёнаў рублёў на набыццё лапараскапічнай стойкі, якая прымяняецца для гінекалогіі і хірургічных аперацый. Але гэта мінімум, патрэбна значна болей сродкаў.

Што ж, даводзіцца пачынаць свой шлях у медыцыну будучага маленькімі крокамі, прызнаюць медыкі. Яны спадзяюцца, што новае абсталяванне дазволіць эканоміць грошы на ўтрыманні пацыентаў у стацыянарах: пасля бяскроўных аперацый яно значна скарачаецца. І далей за кошт зэканомленых сродкаў трэба набываць новыя апараты і ўкараняць перадавыя методыкі.

Каб беларускія медыкі ўмелі працаваць па-новаму, іх вучаць нямецкія калегі. Прычым ні крызіс, ні грып візіт немцаў у Магілёў не спынілі: канферэнцыя праходзіць у адпаведнасці з планам.

— Не, мы не баімся ні крызісных праблем, ні хваробаў, — сказаў **кіраўнік таварыства «Дапамога дзецям, якія пацярпелі ад Чарнобыля» Вілі ФРОН.** — Увогуле, страх — дрэнны дарадца.

Ілона ІВАНОВА.

Сам сабе псіхолаг

ПАЧНІЦЕ ДЗЕНЬ З ПРЫЕМНАГА

Ці ведаем мы, як пачынаць новы дзень? Ці можна знайсці спосаб уставаць з ложка з усмешкай, а не з панурым выглядам, які наганяе страх на хатніх?

Гэта не складана. У некаторых у камп'ютарах ёсць «цытата дня», якая штодзень вітае карыстальніка жартаўлівай або падбадзёрваючай фразай.

Ёсць і іншы сродак стварэння добрага настрою: перад адыходам да сну павесьце побач з ложкам аркуш паперы з нагадваннем аб прыемнай падзеі. Напрыклад, аб тым, што ваша малое сказала першае слова; аб хуткай зарплаце ці сустрэчы з сябрам... Ды аб чым заўгодна, толькі б гэта выклікала прыемныя эмоцыі ў той момант, калі вы расплюшчыце вочы! Пэўна, камусьці падобная задума падасца смешнай і нават недарэчнай. Аднак такая дробязь узніме настрой, дапаможа паглядзець на мінулыя і цяперашнія непрыемнасці па-іншаму і забыцца на праблемы.

ПЛАКАЦЬ КАРЫСНА

На думку псіхолагаў, плач нам жыццёва неабходны. Гэта своеасаблівы клапан, з дапамогай якога мы выпускаем выкліканыя стрэсам нервознасць, узбуджэнне і трывогу.

Як высветлілі спецыялісты ўніверсітэта Мінесоты (ЗША), людзі, якія ўмеюць плакаць і не баяцца праяўляць свае пачуцці, жывуць значна даўжэй, бо слёзы здольныя змяншаць уздзеянне стрэсу і заспакаяльна ўплываюць на ўзбуджанага чалавека. Наадварот, нявыплаканыя слёзы рана ці позна прыводзяць да язвы страўніка, сардэчнай недастатковасці і іншых захворванняў. Таму не трэба саромецца плакаць.

У сярэднім, на працягу жыцця па твары чалавека сцякае 70 л слёз — гэта 4,2 млн слязінак. Жанчыны, якія плачуць у 5 разоў часцей за мужчын, маюць схільнасць «абмываць слязьмі» нават радасныя падзеі — па гэтай прычыне праліваецца 21 % слёз. У 30 % выпадкаў людзі плачуць ад гневу, страху і няўдач у каханні.

Моцныя эмоцыі ўзбуджальна дзейнічаюць на вегетатыўныя нервы, якія, у сваю чаргу, раздражняюць слёзную залозу, размешчаную пад вочным яблыкам. З яе салёная вадкасць трапляе ў вочы. Яе дзеянне на арганізм падобнае на дзеянне морфію, таму што заглушае боль. Антыбактэрыяльныя бялковыя рэчывы і гармоны, якія ўтрымліваюцца ў слязах, зніжаюць верагоднасць заражэння інфекцыяй, узмацняючы супраціўляльнасць арганізма, і адначасова супакойваюць.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Здароўе на талерцы

ЛАЙМ — КАРЫСНАЯ КІСЛІНКА

На прылаўках з агароднінай і садавіной можна сустрэць маленькі зялёны плод, вельмі падобны на лімон. Называецца ён — лайм. Гэта фрукт з тонкай лупінай ярка-зялёнага колеру, гаркавата-кіслым смакам, сакавітай зялёнай мякаццю. Карысны ён не менш, чым яго брат лімон.

Навошта яго есці?

Для сэрца і сасудаў. У лайме шмат цытрыну — антыаксіданту, які здольны запавольваць працэсы дачаснага старэння. У саюзе з аскарбінавай кіслатой, ён нармалізуе абмен халестэрыну ў крыві, папярэджваючы развіццё атэрасклерозу, умацоўвае і робіць эластычнымі сценкі крывяносных сасудаў і такім чынам дазваляе знізіць рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Для нервовай і імуннай сістэм. Лайм — выдатны транквілізатар: ён заспакаяльна дзейнічае на нервовую сістэму, паляпшае агульнае самаадчуванне і настрой, а таксама павышае супраціўляльнасць арганізма інфекцыям і паскарае вылячэнне. Гэты цытрус здольны перамагчы восеньскую і зімовую стомленасць, прыгнечанасць, павышаную раздражняльнасць і нервознасць.

Для скуры. Вітамін С — крыніца маладосці: ён актывізуе дзейнасць клетак скуры, папярэджвае з'яўленне маршчын. Да таго ж гэта незаменны матэрыял для пабудовы калагену, які робіць скуру эластычнай.

Для кішэчніка і стрававання. У лайме прысутнічае пекцін, які выводзіць з арганізма таксічныя прадукты. А эфірны алей і арганічныя кіслоты павышаюць апетыт і паляпшаюць ператраўліванне ежы.

Сок лайма медыкі раяць піць тым, хто схільны да прастудных захворванняў, а таксама для нармалізацыі абмену рэчываў у арганізме. Як і лімон, лайм садзейнічае расшчапленню і правільнаму засваенню тлушчаў.

Зразумела, не так і проста прымусіць сябе выпіць шклянку свежавыціснутага соку лайма — ён яшчэ кіслейшы за лімонны. Але ёсць і больш ашчадныя варыянты ўжывання вітамінната прадукту: можна дадаваць скрылікі лайма ў гарачую гарбату, запраўляць сокам салаты са свежай агародніны або паліваць ім адварную рыбу.

Як яго есці?

- Лайм лепш ужываць у свежым выглядзе, бо пры цеплавой апрацоўцы страчваецца каля 60 % вітаміну С.
- Каб захаваць мяккі водар і карысныя ўласцівасці, наразайце плод перад самай падачай на стол.
- Прыгатаваўшы мяса, пакладзіце на кожную порцыю кружок лайма і злёгку расцісніце відэльцам: сок цытруса забяспечыць найлепшае засваенне жалеза.
- Лепш за ўсё лайм спалучаецца са слабакіслай садавіной — дыняй, яблыкамі, грушамі, персікамі, абрыкосамі.

Ліманад з лайма

Вам спатрэбіцца: лайм — 6 шт., цукар — 1/2 шк., кіпень — 700 мл, соль.

Разрэжце кожны лайм папалам і выцісніце сок. Змясціце выціснутыя палавінкі лайма ў збан, туды ж усыпце, памешваючы, цукар і ўліце, працягваючы памешваць, кіпень. Накрыйце і дайце пастаяць 15 хвілін. Дадайце соль на смак. Пераліце ў другі збан і дадайце сок лайма. Астудзіце, падавайце з лёдам і долькамі лайма.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

ГЕРБАВАЯ ПЯЧАТКА НА РЭЦЭПЦЕ ДЛЯ «ТАМІФЛЮ» НЕ ПАТРАБУЕЦЦА

У сувязі са шматлікімі запытамі наконт парадку рэалізацыі ў аптэках прэпарата «Таміфлю», Міністэрства аховы здароўя падрыхтавала тлумачальны ліст:

«Рэцэпт урача на лекавы сродак «Таміфлю», капсулы 75 мг ва ўпакоўцы №10, выпісаны на рэцэптурным бланку формы № 1 для выпіскі лекавых сродкаў за поўны кошт, павінен быць пацверджаны асабістым подпісам і пячаткай урача, подпісам загадчыка аддзялення і пячаткай дзяржаўнай амбулаторна-паліклінічнай арганізацыі аховы здароўя, урач якой выпісаў рэцэпт. **Наяўнасць гербавай пячаткі не патрабуецца».** У Міністэрстве аховы здароўя сцвярджаюць, што прэпарат «Таміфлю» ніколі не знаходзіўся ў безрэцэптурным спісе, паколькі самалячэнне з дапамогай «Таміфлю» можа пацягнуць сумныя наступствы. Спыніць масавае выкарыстанне «Таміфлю» ў якасці прафілактычнага сродку заклікаюць і многія эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

— Адсутнасць у свабодным продажы прэпарата «Таміфлю» — гэта нармальна. Перш чым выкарыстоўваць сур'ёзныя супрацьвірусныя сродкі, трэба абавязкова пракансультавацца з урачом, — лічыць і **кіраўнік Бюро Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь Ягор Зайцаў**. — Напэўна, сродкамі супраць грыпу A/H1N1 павінны быць забяспечаны ў першую чаргу стацыянары, дзе лечацца хворыя з пацверджаным дыягназам інфіцыравання вірусам свінога грыпу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Жаночае здароўе

ПРАДВЕСНІКІ РАКУ ЦЕЛА МАТКІ

Рак займае другое месца па колькасці смяротных выпадкаў, а рак цела маткі лідзіруе ў статыстыцы злаякасных новаўтварэнняў жаночых палавых органаў.

Рак цела маткі не ўзнікае ў здаровым эндаметрыі. Гэта як мінімум 15-гадовы шлях, падчас якога ў слізістай поласці маткі адбываюцца пэўныя змяненні. Спачатку яны прыводзяць да ўзнікнення фонавых захворванняў, потым перадракавых, і толькі затым уласна раку. Чым хутчэй жанчына абследуецца ў спецыяліста, тым менш шанцаў захварэць на запушчаную форму раку, кажа <u>загадчыца аддзела анкагінекалогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктар медыцынскіх навук Ірына КАСЭНКА</u>.

Міёма

Рак цела маткі можа развіцца пры такім захворванні, як міёма, або фібраміёма, — дабраякасная пухліна з мышачнай тканкі. Паводле статыстыкі, міёма ёсць у кожнай пятай жанчыны ва ўзросце да 45 гадоў. Асноўная большасць гэтых жанчын нават не падазраюць аб наяўнасці пухліны, паколькі да 70 працэнтаў міёмаў ніяк сябе не праяўляюць. Выяўляюцца ж апошнія падчас прафілактычнага агляду, а пацвярджаецца дыягназ з дапамогай ультрагукавога даследавання.

Жанчыну могуць непакоіць:

1. Моцныя, працяглыя — да 10 дзён, хваравітыя месячныя, паколькі вузлы перашкаджаюць мышачнай тканцы скарачацца. Паступова могуць з'явіцца пачуццё слабасці, павышаная стамляльнасць, санлівасць, галавакружэнне — прыкметы анеміі, зніжэння ўзроўню эрытрацытаў у крыві.

2. Боль унізе жывата. Пры скарачэнні мышачнай тканкі сціскаюцца сасуды міёмы, што і выклікае боль. Ён можа з'явіцца і ў выніку парушэння кровазвароту вузла.

3. Бясплоднасць.

4. Парушэнне мочаспускання і дэфекацыі, якія ўзнікаюць пры сцісканні вузлом міёмы суседніх органаў — мачавога пузыра і прамой кішкі.

5. Хаатычныя матачныя кровацячэнні, абумоўленыя спалучэннем міёмы маткі і гіперпластычных працэсаў эндаметрыя.

6. Пагроза перарывання цяжарнасці, невыношванне цяжарнасці.

Узнікненне міёмы маткі звязваюць з аслабленнем абарончых сілаў арганізма. Гэтаму спрыяюць любыя знешнія агрэсіўныя фактары — голад, холад, сонечная радыяцыя, кампаненты ежы, інфекцыі, стрэс, лекі, экалогія. З'яўленне міёмы даволі часта звязваецца менавіта са стрэсавай сітуацыяй. У 60-х гадах мінулага стагоддзя ў адным даследаванні былі атрыманы наступныя звесткі: больш як у 70 працэнтаў жанчын выяўленню або хуткаму росту міёмы маткі папярэднічала эмацыянальнае ўзрушэнне або чэрапна-мазгавая траўма. Дысбаланс у рабоце галаўнога мозга выклікаў парушэнні гарманальнай рэгуляцыі палавых органаў, з-за чаго ўзнікаў стан лішку эстрагену і нястачы прагестэрону. Па меркаванні многіх вучоных, менавіта гэта прыводзіць да патаўшчэння ўнутранай слізістай абалонкі маткі, частых матачных кровацячэнняў — гіперплазіі эндаметрыя і ўтварэнняў у малочнай залозе. Гінеколагам знаёмая частата спалучэння ў пацыентак міёмы маткі і мастапатыі, міёмы маткі і гіперплазіі эндаметрыя.

Аднак гарманальныя парушэнні — не адзіны фактар развіцця міёмы. Па меркаванні вучоных, генетычная схільнасць да яе развіцця закладзена ў арганізме жанчыны ад самага пачатку. Знешнія ж фактары толькі даюць штуршок.

Важнае значэнне мае зніжэнне імунітэту, абумоўленае, напрыклад, любым запаленчым працэсам, які ў сваю чаргу падаўляе адэкватную рэакцыю імунітэту. Клеткі-забойцы, якія павінны вынішчаць «дрэнныя», «злыя» клеткі, становяцца не здольнымі спыніць працэс развіцця пухліны.

Многія гады вывучэнне праблемы міёмы маткі ішло ў кантэксце бясплоднасці. Аднак і дагэтуль няма адзінага меркавання, што ёсць прычына, а што вынік. Вядома толькі, што каля паловы ўсіх жанчын з міёмай пакутуюць ад бясплоднасці.

Жанчын, у якіх выяўлена міёма маткі, але няма скаргаў, лячыць не трэба. З цягам часу ў жанчыны пачнецца клімакс, яечнікі перастануць працаваць, міёма зменшыцца, і на яе ўсе забудуцца. Іншая рэч, калі пацыентка пакутуе ад штомесячных кровацячэнняў. Класічным спосабам лячэння ў такім выпадку застаецца аператыўнае выдаленне маткі. Аднак калі жанчына яшчэ хоча раджаць, прымяняецца метад выдалення толькі саміх вузлоў з захаваннем органа. Праўда, у такім выпадку застаецца рызыка паўторнага ўтварэння вузлоў. Канчатковае слова застаецца за гінеколагам. Без аперацыі не абысціся, калі:

— памер маткі разам з вузламі перавышае яе памер пры 12-тыднёвай цяжарнасці;

— міёма спалучаецца з пухлінай яечнікаў;

— хутка расце міёма, што выклікае падазрэнне аб наяўнасці саркомы маткі — злаякаснай пухліны;

— моцныя кровацячэнні, якія зніжаюць гемаглабін крыві.

У апошнія гады сінтэзаваныя гарманальныя прэпараты, якія могуць выкарыстоўвацца як дадатак да хірургічнага лячэння, а ў некаторых выпадках — як самастойны від лячэння. Названыя прэпараты галоўным чынам падаўляюць функцыю яечнікаў, якія «засынаюць», нібыта пераходзяць у час постменапаўзы. Яечнікі пачынаюць выпрацоўваць меншую колькасць палавых гармонаў, значна зменшаецца кровазабеспячэнне маткі, у тым ліку міяматознага вузла. Паводле замежных звестак, аб'ём маткі зменшаецца пры гэтым на 35—50 працэнтаў, а міёма — на 30—35.

Сёння актыўна абмяркоўваецца і такое пытанне: ці варта прымаць прэпараты, калі аперацыі ўсё адно не пазбегнуць? Шэраг назіранняў паказвае, што лячэнне апраўданае. У першую чаргу сваёй здольнасцю зніжаць крованапаўненне матачных сасудаў, што зменшыць страты крыві пры хірургічным умяшанні.

З іншага боку, у апісаных лекаў ёсць і пабочны эфект, а менавіта эстрагенавы голад. Вядома, што многія органы маюць рэцэптары да эстрагенаў, — работа галаўнога мозга, сасудаў, сэрца, рост касцей у многім залежаць ад стымуляцыі гэтымі палавымі гармонамі. Прэпарат жа амаль цалкам пазбаўляе арганізм эстрагенаў. Таму ў некаторых пацыентак узнікаюць «прылівы», галаўны боль, падаўлены настрой, расстройства сну, дэпрэсія, зніжэнне палавога жадання, выпадзенне валасоў, разбурэнне коснай тканкі, з'яўляюцца болі ў пазваночніку і суставах. Пакутуе і сардэчна-сасудзістая сістэма. Таму рашэнне аб прыняцці падобных прэпаратаў павінна быць вельмі прадуманым.

Жалезістая гіперплазія

Гэта залішняе разрастанне эндаметрыя ў адным з участкаў маткі або ва ўсёй яе поласці. Рост працягласці жыцця жанчын, псіхалагічных нагрузак, частата ўрагенітальных парушэнняў спрыяюць павышэнню колькасці гіперпластычных працэсаў. Дзесьці ў 60—70 працэнтаў хворых з матачнымі кровацячэннямі перад спыненнем месячных выяўляецца гіперплазія эндаметрыя. У 80 працэнтаў пацыентак, хворых на рак цела маткі, выяўляліся гіперпластычныя працэсы. У 5—15 працэнтах выпадкаў жалезіста-кістозная гіперплазія эндаметрыя ператвараецца ў рак эндаметрыя на працягу ад 2 да 18 гадоў.

Па некаторых звестках, гіперпластычнаму працэсу спрыяе спадчыннасць (міёма маткі, рак палавых органаў і малочнай залозы, гіпертанічная і іншыя хваробы), а таксама пашкоджанні падчас унутрывантробнага жыцця, захворванні ў перыяд палавога выспявання і звязаныя з імі расстройствы менструальнай і рэпрадуктыўнай функцый. Гіперпластычныя працэсы ў эндаметрыі ўзнікаюць з-за функцыянальных расстройстваў і захворванняў, якія парушаюць гармональны, вугляводны і іншыя віды абмену рэчываў. Нярэдка сітуацыі спрыяе атлусценне, гіпертанія, цукровы дыябет, міёма маткі, мастапатыя, эндаметрыёз, расстройствы функцыі печані, адказнай за абмен гармонаў. Агульнапрызнаным фактарам з'яўляецца высокі ўзровень эстрагенаў і нізкі прагестэрону. Гіперплазія эндаметрыя нярэдка ўзнікае і пры полікістозных яечніках. Мноства фалікулаў у яечніках, або полікістоз, можа быць тым фактарам, на фоне якога надалей разаўецца рак эндаметрыя. У жанчын старэйшага ўзросту з'яўленню гіперпластычных працэсаў часта папярэднічаюць перанесеныя гінекалагічныя захворванні і аператыўныя ўмяшанні на палавых органах.

Характэрнай праявай гіперплазіі з'яўляюцца матачныя кровацячэнні (як правіла, пасля затрымкі менструацыі). Бываюць і крывяністыя выдзяленні паміж месячнымі. Аднак у некаторых хворых гіперплазія працякае бессімптомна. У кожным дзясятым выпадку гіперпластычны працэс пераходзіць у рак эндаметрыя.

Для дыягностыкі гіперплазіі шырока выкарыстоўваецца выскрабанне слізістай абалонкі цела маткі і наступнае гісталагічнае даследаванне атрыманага матэрыялу. Для кантролю лячэння, а таксама ў якасці прафілактычнага абследавання жанчын выкарыстоўваюць цыталагічны метад даследавання матачнага матэрыялу, атрыманага шляхам аспірацыі. Праўда, гэты метад выкарыстоўваецца галоўным чынам для вызначэння неабходнасці больш дэталёвага абследавання. Выяўляе гіперпластычныя працэсы і ультрагукавое даследаванне. У апошнія гады сваю каштоўнасць даказалі такія метады, як гістэраскапія і гістэраграфія. Ступень актыўнасці гіперпластычных працэсаў можна вызначыць і з дапамогай радыеізатопнага даследавання маткі.

Лячэнне ў гэтым выпадку праводзіцца з улікам многіх момантаў — узросту хворай, прычыны захворвання, клінічных праяў, супрацьпаказанняў і г.д. Асноўны метад — гармонатэрапія. Гэта можа быць мясцовае ўздзеянне, скіраванае на тармажэнне росту клетак эндаметрыя, і цэнтральнае — падаўленне выдзялення ганадатропных гармонаў гіпофізам.

Пры гіперплазіі, звязанай з полікістозам яечнікаў, першым этапам лячэння з'яўляецца клінавідная рэзекцыя. Хірургічнаму метаду перавага аддаецца пры жалезіста-кістознай гіперплазіі, якая рэцыдывуе і развіваецца на фоне захворванняў залоз унутранай сакрэцыі, атлусцення, гіпертаніі, хваробаў печані і венаў. У апошнія гады для лячэння і прафілактыкі гіперпластычных працэсаў прымяняюць метад крыадэструкцыі — лячэння холадам.

Атыповая гіперплазія

Лічыцца тым захворваннем, з якога амаль у ста працэнтах выпадкаў развіваецца рак эндаметрыя. Атыповая гіперплазія бывае структурнай і клетачнай. Клетачная азначае непасрэднае перараджэнне нармальнай клеткі ў ракавую. Вылучаюць лакальную і дыфузную атыповую гіперплазію.

Атыповая і жалезістая гіперплазіі маюць аднолькавае паходжанне і праяўленне. Як правіла, жанчыны не звяртаюць асаблівай увагі на рэдкія крывяністыя выдзяленні, іх большую інтэнсіўнасць і працягласць. А гэ

> Перш чым ступіць на «зебру», пешаход павінен ацаніць сітуацыю: а ці паспее гэты кіроўца, які знаходзіцца на адлегласці 20—30 метраў, спыніцца.

РАДАР

ВЫПУСК № 3 (3)

Спецпраект газеты «Звязда» і Дзяржаўнай аўтамабільнай інспекцыі МУС Рэспублікі Беларусь

КАНТРОЛЬ ДАІ ЗНІЖАЙ ХУТКАСЦЬ

> Аўтамабілістам, якія яшчэ не замянілі летнія шыны на зімовыя, ДАІ рэкамендуе «пераабуцца» ў найбліжэйшы час

«У ПДР НЯМА І НЕ МОЖА БЫЦЬ ДРОБЯЗЯЎ, БО ЯНЫ НАПІСАНЫ ЧАЛАВЕЧАЙ КРЫВЁЮ»

На пытанні «Звязды» і аўтааматараў адказвае чалавек, які за рулём ужо практычна 40 гадоў, намеснік начальніка УДАІ МУС Беларусі Васіль БУЛЬБЯНКОЎ

— Генеральная пракуратура Беларусі прапаноўвае больш сурова штрафаваць п'яных кіроўцаў. У прыватнасці, падняць максімальны памер штрафу з 45 базавых велічынь да 200, а калі п'яны кіроўца ў дадатак да таго сеў за руль без пасведчання, то і да 300 базавых велічынь. Як вы лічыце, ці зможа ўзмацненне штрафаў кардынальна змяніць карціну з ДТЗ у Беларусі?

— З пачатку года на дарогах рэспублікі супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі затрымалі больш як 40 тысяч нецвярозых кіроўцаў. Па віне апошніх здзейснена ажно 818 ДТЗ. Таму, несумненна, і ДАІ, і МУС у цэлым падтрымліваюць ініцыятыву Генпракуратуры. Шмат размоў, памятаеце, хадзіла наконт канфіскацыі транспартных сродкаў у асобаў, затрыманых паўторна на працягу года ў стане алкагольнага ап'янення. Я ж мяркую, што будзе нашмат эфектыўней спачатку накладаць дастаткова высокія штрафы, прапанаваныя Генпракуратурай. І толькі тады, калі парушальнік не зможа «пацягнуць» такую суму грошай, можна будзе накласці судом арышт на транспартны сродак і шляхам яго канфіскацыі пагасіць штраф.

— Хамства ў дачыненні да пешаходаў, пра што сведчаць звароты нашых чытачоў, стала нормай. Як часта штрафуюцца кіроўцы, якія не прапускаюць пешаходаў на нерэгуляваным пераходзе?

— Штодзень супрацоўнікі ДАІ прыцягваюць да адказнасці каля 200 такіх кіроўцаў. Але я не сказаў бы, што самі пешаходы не парушаюць ПДР. Пра гэта сведчыць і статыстыка: штодзень за грубыя парушэнні да адміністрацыйнай адказнасці прыцягваецца больш за 1000 пешаходаў. Проста многія лічаць, што калі пешаход ступіў на «зебру», то кіроўца павінен стаць як укапаны і прапусціць яго. Я катэгарычна з гэтым не згодны. І як кіроўца, і як супрацоўнік ДАІ, і як грамадзянін. Прычына ў тым, што не заўсёды гэта нават тэарэтычна рэальна зрабіць. Таму перш чым ступіць на «зебру», пешаход павінен ацаніць сітуацыю: а ці паспее гэты кіроўца, які знаходзіцца на адлегласці 20—30 метраў, спыніцца. І тут трэба ўлічваць шмат фактараў: і рэакцыю кіроўцы, і стаж ваджэння, і тармазны шлях. Апошні, у сваю чаргу, залежыць ад многіх фактараў: умоў надвор'я, тыпу гумы... Вось у Жэневе пешаходы, бачыў на свае вочы, падымаюць руку і, толькі пераканаўшыся, што кіроўца зніжае хуткасць, пачынаюць рух. Ды і перайсці стараюцца хуценька. У нас жа некаторыя «гаспадары дарогі» на «зебры» пачынаюць прыпальваць цыгарэту. Адным словам, хапае ў нас хамства на дарозе, як з боку кіроўцаў, так і з боку пешаходаў. Культуру трэба прывіваць з дзяцінства.

— Ці маюць права супрацоўнікі ДПС накладаць на кіроўцу штраф за тое, што той міргнуў фарамі сустрэчнаму руху, тым самым папярэдзіўшы іншых кіроўцаў аб тым, што стаіць пост ДАІ?

— Няма ў ПДР за гэта адказнасці. Ды і я часам, калі бачу, што ля праезнай часткі гуляюць дзеці, міргаю святлом машынам, якія рухаюцца насустрач. Яны думаюць, што напярэдзе стаіць супрацоўнік ДАІ — і зніжаюць хуткасць.

— Многія скардзяцца на «ляжачых паліцэйскіх», маўляў яны з'яўляюцца прычынай затораў і пашкоджанняў аўтамабіляў. Ці абгрунтаваныя гэтыя скаргі?

— У нас на сёння на дарогах рэспублікі ўсталявана амаль пяць тысяч «спячых паліцэйскіх». Вялікая іх частка з'явілася па просьбе дырэктараў школ, загадчыкаў дзіцячых садкоў, дырэктараў буйных крамаў. І што вы думаеце, са з'яўленнем кожнага такога «паліцэйскага» аварыйнасць на канкрэтным месцы прыкметна зніжаецца. За 2009 год няма ніводнага звароту, каб нехта пашкодзіў аўтамабіль пры праездзе штучнай няроўнасці. І не павінна быць, бо яны ж усталёўваюцца ў адпаведнасці з ДАСТамі, абазначаюцца разметкай і адпаведнымі знакамі, якія заклікаюць зменшыць хуткасць. Безумоўна, калі кіроўца будзе ляцець з хуткасцю 100 км/г, і, праігнараваўшы папераджальны знак, рэзка затормозіць перад самым «ляжачым паліцэйскім», то можа і пашкодзіць аўтамабіль. Такія кіроўцы да нас не звяртаюцца, бо ўсведамляюць сваю віну.

— Ці могуць супрацоўнікі ДАІ спыняць аўтамабіль толькі дзеля праверкі дакументаў, ад няма чаго рабіць?

— П'яны кіроўца, які бачыць супрацоўніка ДАІ, як правіла, не парушае ПДР. Наадварот, зніжае хуткасць, наколькі гэта магчыма. Калі ж спыняеш такіх «ціхіх» кіроўцаў, то некаторыя ў прамым сэнсе гэтага слова выпадаюць з-за руля. Ведаеце, калі б мы не спынялі аўтамабілі з мэтай праверкі дакументаў, то не затрымалі б больш за 40 тысяч нецвярозых кіроўцаў і не раскрылі 136 крадзяжоў транспартных сродкаў. Я перакананы, што калі спыняць толькі відавочных парушальнікаў, то эфекту не будзе. Разумею таксама незадаволенасць дысцыплінаваных кіроўцаў, кожнаму з нас дарагая кожная хвіліна. Але ж трэба зразумець і супрацоўнікаў ДАІ, якія, пакуль не праверацъ дакументы, не даведаюцца, хто за рулём.

— Ці маюць права супрацоўнікі ДПС несці службу на аўтамабілях без апазнавальных знакаў?

— У цёмны час сутак аўтамабіль ДАІ павінен быць спецыяльнай афарбоўкі. Днём жа схаваны нагляд на грамадзянскіх машынах практыкуецца і нікольі не супярэчыць закону. Калі супрацоўнік ДАІ ў спецыяльнай форме спыніў кіроўцу і законна прад'яўляе парушэнне ПДР, то ён павінен несці адказнасць. І не важна, на машыне інспектар нясе службу ці пешшу. Калі кіроўца не згодны з патрабаваннямі — ён мае права абскардзіць дзеянне супрацоўнікаў ДАІ ў вызначаным парадку.

— Якія антыкарупцыйныя меры прымаюцца ў ДАІ?

— Па-першае, мы штодзень на ўсіх інструктажах папярэджваем інспектараў ДПС аб магчымых наступствах хабарніцтва. Яны ведаюць, што дастаткова адзін раз аступіцца, і можна развітацца не толькі з працай, але і з воляй. І прыводзім канкрэтныя прыклады. Напрыклад, сёлета заведзены крымінальныя справы ў дачыненні да супрацоўнікаў ДАІ Гомельскай вобласці, якія паквапіліся на 200 тысяч беларускіх рублёў. Ёсць негатыўныя прыклады. Але мы не павінны іх замоўчваць. Па-другое, мы з нашымі супрацоўнікамі праводзім рэгулярныя праверкі. І ніхто не ведае, калі канкрэтна ён знаходзіцца пад наглядам. Калі трэба, прыязджаем і правяраем кішэні. Бо згодна з нашым дзейным нарматыўным дакументам, з сабой на службе ў інспектара ДАІ сума грошай можа быць не большай за 1 базавую велічыню.

— Што вы думаеце наконт напружанай сітуацыі адносна пункта ПДР аб таніраванні шкла аўтамабіляў?

— Нагадаю, што па правілах дарожнага руху святлопрапускная здольнасць пярэдняга бакавога шкла аўтамабіля павінна быць не менш за 70 працэнтаў, а задняга бакавога — не менш за 60 працэнтаў. Цяпер пытанне аб магчымым дазволе таніраваць некаторае шкло аўтамабіляў разглядаецца Саветам Міністраў. Я думаю, што кропка ў справе таніроўкі будзе пастаўлена недзе ў пачатку года.

— Кіроўца пачаў абгон на перарывістай паласе. Так атрымалася, што не разлічыў даўжыню калоны, і скончыў яго толькі на суцэльнай. Якое пакаранне за гэта прадугледжана?

— Нашы супрацоўнікі да гэтага ставяцца і абавязаны ставіцца з разуменнем і не прыцягваць да адказнасці. Іншая рэч, калі кіроўца, не звяртаючы ўвагі на суцэльную лінію, працягвае здзяйсняць абгон за абгонам. Вось тут парушальніка ПДР чакае адміністрацыйная адказнасць.

— Цяпер вялікі выбар аўташкол, як дзяржаўных, так і прыватных. Як вызначыцца ў гэтым «моры»?

— Выбірайце тую, да якой і з якой хутчэй дабірацца. Навошта страчваць шмат часу на пераезды? Лепш прыехаць дадому і лішнія паўгадзіны папрацаваць з падручнікам, з каментарамі да ПДР. Працэнт жа здачы ў кожнай школе, паверце, раз на раз не прыходзіцца. Усё, у большасці, залежыць ад самога курсанта, яго жадання і імкнення пастаянна працаваць над сабой. Бо самі разумееце, каб быць сапраўдным кіроўцам, а не проста наезнікам, які пастаянна мае непрыемнасці з ДАІ, недастаткова бяздумна вывучыць білеты. Трэба дасканала разабрацца ў канкрэтных пунктах ПДР. І не для ДАІ, а для сябе ў першую чаргу. Бо ў ПДР няма і не можа быць дробязяў, бо яны напісаны чалавечай крывёю.

— Як вы змагаецеся з «ліпавымі» пасведчаннямі кіроўцы?

— «Ліпавыя» правы маюць яўныя прыкметы падробкі, якія супрацоўнік ДАІ бачыць няўзброеным вокам. Таму падчас праверкі дакументаў іх выявіць вельмі проста. Людзей, якія зарабляюць грошы на нашай бяспецы, хапае. Толькі ў Мінску такія факты выяўляюцца не менш за адзін раз у месяц. У дачыненні да злачынцаў заводзім крымінальныя справы. Хачу звярнуць увагу ўсіх кіроўцаў: «ліпавыя» правы, як правіла, прадаюцца пад выглядам сапраўдных, выдадзеных ДАІ. Не верце, гэта вас уводзяць у зман, я больш як 30 гадоў працую ў ДАІ і ні разу ДАІ завочна пасведчанне кіроўцы нікому не выдавала. З 1 ліпеня 2010 года мы плануем пачаць выдаваць новыя электронныя пасведчанні кіроўцы. Гэта, перакананы, ускладніць жыццё аматарам незаконнай нажывы.

— Мяне, напрыклад, пазбавілі права на кіраванне за выезд на сустрэчную паласу. За год усвядоміла сваю памылку. Ці магу я ў сувязі з тым, што ўладкоўваюся на працу, напісаць заяву аб скарачэнні тэрміну?

— Да 2007 года аб скарачэнні тэрміну можна было хадайнічаць. Гэта было прадугледжана старым Адміністрацыйным кодэксам. З першага сакавіка 2007 года такога прывілею, як скарачэнне тэрміну пазбаўлення права кіравання транспартным сродкам, не прадугледжана. Я лічу, што гэта правільна. Парушальнік павінен спаўна адказаць за здзейсненае, як кажуць, ад званка да званка.

— Дзякуй, Васіль Васільевіч, за адначасова лаканічныя і змястоўныя адказы.

Надзея ДРЫЛА, фота аўтара.

Кампетэнтна

КІРАВАННЕ АЎТАМАБІЛЕМ ПРЫ НЕСПРЫЯЛЬНЫХ УМОВАХ НАДВОР'Я

Асабліва небяспечнай з'яўляецца нераўнамернасць дзеяння тармазоў аўтамабіля. Нават пры лёгкім тармажэнні на слізкім пакрыцці гэта няспраўнасць можа мець небяспечныя наступствы. Таму пры падрыхтоўцы да зімовай эксплуатацыі неабходна праверыць і адрэгуляваць зазоры паміж барабанамі і калодкамі тармазоў. Нераўнамерны знос пратэктара або рознасць ціску ў шынах пры тармажэнні таксама з'яўляюцца прычынай заносу аўтамабіля.

Найбольш небяспечны галалёд. Каэфіцыент счаплення шыны з дарогай зніжаецца ў некалькі разоў. Натуральна, што ў столькі ж разоў змяншаюцца сілы, якія ўтрымліваюць аўтамабіль на зададзенай траекторыі. Пры руху аўтамабіля па сухім пакрыцці запас сілаў счаплення колаў з дарогай застаецца дастаткова вялікім для ўтрымання аўтамабіля ад заносу нават пры прыкладанні максімальных тармазных або цягавых сілаў.

На слізкай дарозе дзейнічаць рулявым колам, націскаць на педаль счаплення, кіраваць дросельнай заслонкай трэба плаўна, прымяняць камбінаванае тармажэнне, г.зн. рабочым тормазам і рухавіком, што павышае эфектыўнасць тармажэння аўтамабіля.

Камбінаванае тармажэнне можа выконвацца на пастаяннай перадачы або з паслядоўным уключэннем паніжаных перадач.

Калі аўтамабіль працягвае рухацца прамалінейна, варта плаўна знізіць абароты рухавіка і зменшыць хуткасць да бяспечных межаў. Больш складана выконваць пры галалёдзе павароты. Перш за ўсё трэба дачасна знізіць хуткасць руху, прымяняючы для гэтага камбінаванае тармажэнне, затым уключыць патрэбную перадачу і на невялікай хуткасці выканаць паварот. Пускаць аўтамабіль накатам, уключыўшы счапленне, нельга, бо гэта можа прывесці да заносу.

Падчас руху на абледзянелай дарозе не заўсёды варта спадзявацца на матэрыялы супраць слізгацення, якімі пасыпаюць дарогу. Таксама небяспечны пры галалёдзе толькі выпаўшы снег, які маскіруе абледзянелае пакрыццё.

Асаблівую асцярожнасць падчас галалёду трэба праяўляць падчас руху на пад'ёмах і спусках. Перш за ўсё важна правільна выбраць тую перадачу, на якой можна пераадолець пад'ём без пераключэння. Перайсці на гэту перадачу варта загадзя, да пачатку пад'ёму. На спуску варта прымяняць перарывістае тармажэнне ў сувязі з тым, што часовае спыненне дзеяння тармазных механізмаў дазваляе захаваць аптымальны тэмпературны рэжым рабочага тормазу аўтамабіля, а значыць, і яго эфектыўнасць.

Аляксандр БРУЙ, інспектар ААіП УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, старшы лейтэнант міліцыі.

Капітан Аляксандр САМСОН добра вядомы не толькі сярод сваіх саслужыўцаў — супрацоўнікаў ДАІ Баранавіцкага раёна. На прафесійных спаборніцтвах работнікаў Дзяржаўтаінспекцыі ён неаднаразова выступаў у складзе зборнай каманды Брэсцкай вобласці. Фізічная і медыцынская падрыхтоўка, фігурнае ваджэнне аўтамабіля, самаабарона — усе гэтыя прафесійныя навыкі праходзяць на такіх спаборніцтвах праз самы строгі кантроль. Таму высокая адзнака, атрыманая ад кампетэнтнага журы, прыемна не толькі самому пераможцу, але і ўсяму калектыву. Пра Аляксандра Самсона ў яго калектыве заўжды гавораць толькі самае лепшае: выдатны спецыяліст, надзейны таварыш.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

А ў нас...

● *«...у праблемныя раёны на спецыяльных расфарбаваных аўтобусах (іх у вобласці 4) выязджаюць рэйдавыя групы, у склад якіх акрамя супрацоўнікаў ДАІ медыцынскія работнікі, прадаўцы флікераў з касавым апаратам, дружыннікі, — кажа* **Анжэліка ВЫДЖАК-ТАРГОНЯ, інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Мінаблвыканкама.** *— Пешаходаў-парушальнікаў паказваем прафілактычны фільм і прапаноўваем набыць флікер».*

● «...праходзіць акцыя «Не прапусціў пешахода — развітайся з правамі», — паведаміў **Аляксандр БРУЙ, інспектар аддзела агітацыі і прапаганды УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.** — На небяспечныя ўчасткі дарог выязджаюць супрацоўнікі УДАІ і на месцы штрафуюць кіроўцаў, якія стварылі аварыйную сітуацыю на нерэгулюемых пешаходных пераходах».

● *«...на пешаходных пераходах паблізу школ у Круглянскім і Кіраўскім раёнах усталяваны яркія манекены дзяцей, — распавядае* ***Вікторыя ЖЭЎНЕР, начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама.*** *—Такім нестандартным чынам заклікаем кіроўцаў быць пільнымі і зніжаць хуткасць. У найбліжэйшы час падобныя манекены плануем усталяваць у кожны раён».*

● «...з 10 лістапада па 10 снежня сярод рэгіёнаў вобласці праходзіць агляд-конкурс узроўню культуры ўдзельнікаў дарожнага руху, а таксама развіцця і функцыянавання дарожнай інфраструктуры, — кажа **Алеся СЯРОГІНА, начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама.** — Па выніках конкурсу будуць вызначаны тры прызавыя месцы».

● *«...інспектары ДПС аднаго раёна часова нясуць службу ў суседнім раёне, — паведаміў* ***Алег ДУК, начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.*** *— Калі эксперымент дасць эфект, то будзем практыкаваць такі метад работы і надалей».*

● «...сумесна з Гомельскім дзяржаўным ПТВ № 79 хімікаў прайшла акцыя «Разам за бяспечны пераход», — расказвае **Марыя КРЫВАНОГАВА, начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама.** — Навучэнцы і выкладчыкі ў камізэльках павышанай бачнасці пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў ДАІ раніцай у гадзіну пік дзяжурылі каля пешаходных пераходаў на праспекце Кастрычніка і дапамагалі пераходзіць дарогу дзецям і пажылым. На фота- і відэакамеру фіксаваліся парушэнні кіроўцамі правілаў праезду пешаходных пераходаў. Здымкі і запісы перадалі ў ДАІ для прыцягнення парушальнікаў да адміністрацыйнай адказнасці».

● *«...у 11 буйных крамах горада Брэста транслююцца сацыяльныя ролікі па тэматыцы бяспекі дарожнага руху, — адзначае* ***Наталля САХАРЧУК, начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама.*** *— Ужо дасягнулі дамоўленасць, што навучальныя мультфільмы для дзяцей будуць круціць і на 8 святлодыёдных экранах, якія ў найбліжэйшы час з'явяцца на вуліцах горада».*

УВАГА! Паважаныя бацькі, падавайце асабістымі дысцыплінаванымі паводзінамі на дарогах станоўчы прыклад дзецям. Дзяцей да 12 гадоў перавозьце ў спецыяльным утрымліваючым крэсле. Не дазваляйце ім гуляць паблізу дарог і прымацоўвайце да іх адзення флікеры.

КАЛІ СВЯТЛАФОРЫ СТАНУЦЬ СОНЕЧНЫМІ?

Пытальнік

Для асвятлення пешаходных пераходаў у Беларусі плануюць выкарыстоўваць энергію сонца.

Пра гэта паведаміў старшы інспектар УДАІ МУС Беларусі Міхаіл БАНАДЫК.

— Ёсць участкі загарадных дарог агульнага карыстання, дзе падключэнне электраэнергіі ўскладнена, — адзначыў Міхаіл Банадык. — **Сонечныя ж батарэі, вельмі на гэта разлічваем, дадуць магчымасць асвятляць размешчаныя там пешаходныя пераходы.**

Вытворцы пераконваюць, што сонечная батарэя, размешчаная на пераходзе, зараджаецца нават за кароткі зімовы светлавы дзень. За кошт накопленай энергіі працуе і лямпа, накіраваная на «зебру», і падсветка дарожнага знака таксама.

— Вось мы і вырашылі гэта праверыць, — кажа супрацоўнік ДАІ. — Абсталявалі сонечнымі батарэямі два пешаходныя пераходы: на вуліцы Данілы Сердзіча ў Мінску ды на 56-м кіламетры дарогі Мінск—Гомель. Калі эксперымент апраўдае сябе, і рэсурсу батарэі будзе хапаць нават узімку, то навінка тэхнікі з'явіцца і на іншых пераходах рэспублікі.

Жаночы погляд

Вольга ВЯРШУБСКАЯ — інспектар аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама

ПАРУШЭННЕ ПРАВІЛАЎ НЕ АБЫСЦІ КАМПЛІМЕНТАМІ

Яна нарадзілася ў сям'і ўрачоў, але выбрала прафесію настаўніка. Пасля заканчэння Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Вольга працавала ў школе. Там маладому педагогу выпала сутыкнуцца з праблемнай сям'ёй і дзецьмі, якім вельмі хацелася дапамагчы. Таму Вольга вырашыла пайсці працаваць у міліцыю. Сёння гэта маладая прыгожая жанчына мае званне капітана, і ў ДАІ займаецца разам з калегамі прафілактыкай.

— У вашым кабінеце дзіцячыя малюнкі на дарожныя тэмы. Відаць, настаўніцкія навыкі дапамагаюць і на гэтай службе?

— Мы сапраўды шмат працуем з дзецьмі, таму што трэба прывіваць правілы бяспечных паводзінаў з самага ранняга ўзросту. Дарослых цяжка пераканаць: вы і самі, напэўна, неаднойчы бачылі, як людзі перабягаюць дарогу наўдалую і, самае крыўднае, яшчэ і дзяцей за сабой цягнуць. Ніхто не думае пра бяду, пакуль яна не здарыцца. Таму надзеі на дысцыпліну на дарогах мы звязваем з дзецьмі і для іх праводзім самыя розныя акцыі.

— Узгадайце, калі ласка, самую цікавую.

— Напрыклад, у адной з магілёўскіх школ мы зрабілі для вучняў 1-га і 2-га класаў урачысты прыём у пешаходы, падмацаваны падарункавымі флікерамі і марожаным.

Але не толькі малодшыя школьнікі, але і падлеткі ўважліва слухаюць, калі ім цікава распавядаць пра бяспеку на дарогах. Не пустымі справаздачнымі лічбамі і сухімі цытатамі з правілаў, а яркімі прыкладамі ды красамоўнымі сітуацыямі. Калі б гэты чалавек не скочыў праз вуліцу, а дайшоў да перахода, то страціў бы толькі некалькі хвілін, а не здароўе ці жыццё.

— Карацей, пужаеце маладых людзей, ціснеце на страх.

— Я гэта не страхам назвала б, а пачуццём небяспекі. Трэба нават самым малым ведаць пра тое, што ў жыцці не ўсё бывае добра ды гладка. Каб не здарылася чаго нядобрага, трэба быць асцярожнымі.

— Ці атрымліваецца так жа паспяхова працаваць з дарослымі?

— На жаль, людзі часта вучацца толькі на сваіх памылках. Пакуль нешта не здарыцца з імі, альбо са сваякамі і сябрамі, не задумваюцца. Пра гэта мы расказваем у СМІ: штодня на дарогах здараюцца аварыі, у якіх людзі атрымліваюць траўмы ці паміраюць. У нашых людзей у падсвядомасці закладзена — наўдалую. Маўляў, няхай выпіў, але праскачу, пакуль інспектараў ДАІ няма...

— Але ДАІ ў такой сітуацыі — яшчэ не самае страшнае.

— Гэта лепшы варыянт, калі чалавека спынілі і ён не нарабіў бяды. Асабіста я падтрымліваю ўвядзенне жорсткіх мераў супраць п'яных вадзіцеляў: няхай іх і правоў на ўсё жыццё пазбаўляюць, і аўтамабілі адбіраюць. Але не ўсіх спужаюць такія крутыя меры. Таму, адначасова, трэба выхоўваць у людзей разумненне, што нельга парушаць правілы. А ў нас вечныя адгаворкі: рэмень бяспекі не патрэбен — гэта, маўляў, мая асабістая справа, ліхачы вечна кудысьці спяшаюцца...

— Калі вы спыняеце на дарозе такіх парушальнікаў, як яны на вас рэагуюць? Інспектар ДАІ на высокіх абцасах — гэта ўсё ж незвычайна...

— Спачатку звычайна ўсміхаюцца, але на стадыі складання пратакола ўсмешкі знікаюць. Часам потым і грубяць.

— А вам гэта не прыкра?

— Я на працы. Я павінна паводзіць сябе вытрымана і ветліва. Не трэба злавацца — тады і сураз моўца супакоіцца. А ў большасці мы з вадзіцелямі развіваемся на прыемнай ноце. Некаторыя кажуць: «Прыемна бачыць вас на дарозе».

— Можа, камплімент могуць растапіць ледзяное сэрца інспектара ДАІ?

— Так, і камплімент кажуць. Але закон ёсць закон. Мне, вядома ж, прыемна і я дзякую за добрыя словы. Але закон немагчыма абысці камплімент амі.

— Як вам працуецца ў мужчынскім калектыве?

— Жанчыны ў Магілёўскай ДАІ працуюць у аддзяленні агітацыі і прапаганды, але бяруць іх і ў дарожную службу. Мы з мужчынамі на роўных, як калегі. Паблажак нам няма. Толькі ў рэйдзе, калі вельмі холадна, пускаюць пагрэцца на колькі хвілін у аўтамабіль. А так у нас з мужчынамі аднолькавыя пасады і пагоны.

— Аднак нароўні з мужчынамі вам даводзіцца сутыкацца і з жорсткімі наступствамі здарэнняў, бачыць кроў і трупы, ці не так?

— Мы звычайна выязджаем з камерай на ДТЗ і робім здымкі для прэсы. Гэта вельмі цяжка. Я не магу забыцца, як у сёлетнім лютым дзеці пасля школы гулялі, хлопчык выбег на дарогу і трапіў пад аўтобус. Вучань 3-га класа загінуў на месцы. Відовішча жахлівае. Шкада дзіця. А калі бачыш бацькоў і сваякоў, то горш становіцца ўтрая. Толькі што яны бачылі чалавека жывога і здаровага, а тут у выніку недарэчнага выпадку жыццё абарвалася. Гэта страшна. Але пасля такога хочацца працаваць яшчэ болей, каб людзі ўбачылі гэта і задумаліся. Трэба клапаціцца пра сваё жыццё і сваіх блізкіх.

— Вы водзіце аўтамабіль?

— Правы ёсць, але цяпер не ваджу. Так што я — уважлівы пасажыр і пешаход. Гэта, вядома ж, прафесійнае: я бачу ўсе парушэнні, нават калі ў выхадны дзень іду з кампаніяй сяброў па вуліцы. Няўжо цяжка прышпіліцца рэменем бяспекі? Ну куды ён пабег пад колы? А гэты чаго нясецца?

Мае сябры дысцыплінаваныя — сярод іх я вяду прафілактычную працу. Нават калі пешаходны пераход далёка, усе ідуць да яго. Я ж магу і аштрафаваць!

— Значыць, вы цяпер на баку пешаходаў?

— Не, я ўстрымалася. Але сапраўды ў двух бакоў, вадзіцеляў і пешаходаў, пункты гледжання заўсёды розныя. Гэта як два розныя светы. Нягледзячы на тое, што вадзіцель выходзіць з аўтамабіля і становіцца, хоць бы на нейкі час, пешаходам. І наадварот. Вадзіцелі вінавацяць пешаходаў за прабежкі праз дарогу ці за павольнае хаджэнне на пераходах як па подыуму. А пешаходы скардзяцца на нахабных вадзіцеляў, якія ляцяць і не прапускаюць. Няма культуры паводзінаў на дарозе. Таму жадаю ўсім удзельнікам дарожнага руху ўзаемапаразумення і разумення, што кожны павінен клапаціцца пра сваё жыццё. Беражыце сябе!

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.

Кожны чацвёрты аўтамабіль не праходзіць тэхагляд з першага разу

Пра гэта паведаміла прэс-сакратар УП «Белдзяржтэхагляду» Алена ПРАКАПЕНЯ.

За 10 месяцаў гэтага года па ўсёй рэспубліцы было праверана 1 714 669 аўтамабіляў, з іх 1 288 537 атрымалі дазвол на допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху.

Дзяржаўтаінспектар УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй ЛУЦКІ і вядучы спецыяліст аддзела арганізацыі дзяржтэхагляду ў горадзе Мінску і Мінскай вобласці Аляксандр ЦІМАФЕЕВІЧ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Гэты паказчык на 6,1 працэнта большы, чым за аналагічны перыяд мінулага года, — расказвае Алена Пракапеня. — Каля 25 працэнтаў вадзіцеляў не змаглі прайсці тэхагляд з першага разу.

Асноўныя прычыны, з-за якіх аўтамабіль не праходзіць дзяржтэхагляд — гэта праблемы з тармазной сістэмай, асвятленнем і светлавой сігналізацыяй, рулявым управленнем, коламі і шынамі. Часта ў вадзіцеляў няправільна ўкамплектавана ці адсутнічае аптэчка, няма вогнетушыцеля і знака аварыйнага спынення.

Не заўжды і самі вадзіцелі ставяцца сур'ёзна да праходжання дзяржтэхагляду.

Падчас дэкады «Дзяржтэхагляд», якая праходзіла з 20 па 30 кастрычніка, у адным толькі Мінску было выяўлена 1964 аўтамабілі з пратэрмінаванымі дазваляльнымі налепкамі, а 14 затрыманых аўтамабіляў увогуле мелі непрапарадныя дакументы аб праходжанні тэхагляду. Цяпер па гэтых справах вядзецца следства.

— Мы не імкнуліся пакараць як мага большую колькасць тых аўтаўладальнікаў, якія не прайшлі своечасова дзяржтэхагляд. Хутчэй, хацелася нагадаць ім пра тое, што тэхнічна спраўны аўтамабіль здольны прадухіліць шматлікія непрыемныя сітуацыі на дарозе і забяспечыць бяспеку ўдзельнікаў дарожнага руху», — растлумачыла прэс-сакратар УП «Белдзяржтэхагляд».

Прайсці тэхагляд можна на спецыяльных дыягнастычных станцыях, тэлефоны якіх можна знайсці на сайце УП «Белдзяржтэхагляд». На ўсіх дыягнастычных станцыях існуе папярэдні запіс. Кошты на паслугі вар'іруюцца ад 22 да 40 тысяч, у залежнасці ад аўтамабіля.

Настасся ЗАНЬКО.

ЗА РУЛЁМ — БЕЗ АЛКАГОЛЮ

● забаронена кіраваць транспартным сродкам у тым выпадку, калі ўзровень алкаголю роўны або перавышае 0,5 г на літр крыві;

● любы вадзіцель, які знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення, нясе адказнасць за нясшчасны выпадак на дарозе незалежна ад цяжкасці атрыманых ім раненняў і ступені пашкоджання транспартнага сродку;

● у сярэднім кожны з выпітых бакалаў пакажа ўзровень алкаголю ў крыві ад 0,2 да 0,25 г/л. Гэтыя паказчыкі могуць быць значна вышэйшымі ў жанчын, падлеткаў і ў людзей хударлявага целаскладу;

● самае простае і бяспечнае з усіх рашэнняў — гэта не кіраваць транспартным сродкам пасля ўжывання любога спіртнога напою;

● адзін з трох смяротных выпадкаў на дарозе звязаны з ужываннем алкаголю. Больш за палову няшчасных выпадкаў прыпадае на цёмны час сутак, выхадныя дні, і часцей за ўсё з удзелам аднаго або некалькіх транспартных сродкаў.

ВЫХАД — З ЛЮБОЙ СІТУАЦЫІ

Каштоўныя парады

ЦІ ЛЁГКА АРГАНІЗАВАЦЬ ВЕЧАР З СЯБРАМІ, У СЯМ'І АБО ДЗЕЛАВУЮ ВЯЧЭРУ НА ПРАЦЫ ТАК, КАБ ЯНА НЕ ЗАКОНЧЫЛАСЯ ТРАГІЧНА

1. Самае простае рашэнне заключаецца ў тым, каб ужываць безалкагольныя напоі: ваду, сок з садавіны і г.д.

2. Загадзя выберыце сярод вас вадзіцеля, які не будзе ўжываць алкагольныя напоі, каб паспяхова даставіць усіх дадому.

3. Калі ўсё ж вы выпілі, то перш чым сесці за руль, вымерайце самі ўтрыманне алкаголю ў паветры, які выдыхаеце, або сліне. Існуе два тыпы тэстаў, якія маюцца ў продажы:

— хімічныя тэсты, якія могуць быць выкарыстаны толькі адзін раз;

— электронныя тэсты шматразовага выкарыстання.

4. Калі вы выпілі і ў той момант, калі садзіцеся за руль, не ведаеце вашага ўзроўню алкаголю ў крыві, у апошнюю хвіліну можна паступіць наступным чынам:

— пачакаць пакуль алкаголь выведзецца з крыві, правёўшы ноч на месцы;

— зняць нумар у бліжэйшай да вас гасцініцы;

— скарыстацца грамадскім транспартам, які пачынае хадзіць ужо раніцай або выклікаць таксі;

— выратацца пешшу;

— выклікаць службу дастаўкі нецвярозых вадзіцеляў.

5. Нават калі вы з'яўляецеся толькі пасажырам і прымаеце рашэнне, ці сесці ў аўтамабіль да п'янага вадзіцеля, узровень алкаголю якога на момант ад'езду невядомы або перавышае 0,5 г/л, спыніце яго з-за магчымай рызыкі ўчынення ДТЗ.

З 1 ліпеня 2010 года Дзяржаўтаінспекцыя плануе пачаць выдаваць новыя электронныя пасведчанні кіроўцы

Адказныя за спецвыпуск Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Надзея ДРЫЛА.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (18 лістапада). Па гарызанталі: Кенгуру. Абух. Рута. Лорак. Жак. Гном. Акорд. Пава. Лямур. Акула. Сера. Аляхно. Палуба. Парад. Лік. Кола. Купала. Ані. Аксу. Век. Танк. Праца. Абай. Ном. Арол. Шпала. Акардэон. **Па вертыкалі:** Падольская. Штэпсель. Ралля. Акаба. Харон. Комін. Аліва. Орда. Жар. Канапа. Бурак. Бора. Ушу. Укол. Крамола. Хіт. Лак. Агдам. Кук. Рагу. Опус. Пат. Малекула. Вар. Білан. Ёта. Асака. Калдун.

Сканворд (19 лістапада). Па гарызанталі: Бейсбол. Боўлінг. Трап. Гром. Сак. Асот. Алібі. Трэк. Флот. Гіт. Латук. Клімава. Мак. Тур. Твар. Капліца. Плата. Дзяга. Саюз. Цыбуля. Іван. Шафа. Грант. Краб. Бартар. Сума. Сталь. Кабрыялет. **Па вертыкалі:** Тартак. Сапа. Тэніс. Плюш. Лаза. Гамбіт. Футбол. Сліва. Цаца. Літр. Такса. Курс. Рост. Бар. Тук. Брама. Арама. Кол. Клуб. Раб. Атлант. Візір. Істота. Ява. Ураган. Рэгбі. Кір. Антрацыт.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Ільвоў наведаюць новыя ідэі, а Цяльцам самы час змяніць імідж

ВАЕН. Акалічнасці могуць запатрабаваць засяроджанасці ва ўчынках і свежасці ў думках. Паспрабуйце не пераацэньваць свае магчымасці, бо пазіцыі партнёраў па справе могуць апынуцца мацнейшымі. Чацвер, магчыма, стане адным з самых спрыяльных дзён тыдня. Так што ганіце прэч ад сябе ляноту, калі не хочаце выпусціць птушку поспеху.

ЦЯЛЕЦ. Варта заняцца сваёй знешнасцю, бо наступіў добры час для абнаўлення іміджу. Можа з'явіцца маса ахвотных стаць вам сябрам — будзьце з імі добразычлівымі, але не дапускайце да сябе вельмі блізка. У панядзелак напор і энергія могуць прынесці добры вынік. У аўторак можаце прыняць не вельмі прадуманае рашэнне. Некаторая падазронасць і недаверлівасць у сераду будуць цалкам дарэчныя, бо вашы таемныя нядобразычліўцы могуць будаваць падкопы супраць вас.

БЛІЗНЯТЫ. Неабходна з панядзелка вызначыць планы на ўвесь тыдзень — ён будзе досыць напружаным і насычаным падзеямі. Пажадана не прыспешваць падзеі, інакш не зможаце аб'ектыўна разлічыць сілы. Знайдзіце час для вырашэння старых праблем. Можаце разлічваць на дапамогу сяброў і блізкіх. У сераду давядзецца прыкласці максімум намаганняў, каб захаваць душэўную раўнавагу, так што не плануйце на гэты дзень нічога важнага.

РАК. Вас чакае шмат сустрэч, тэлефонных званкоў, перамоў. Поспех абяцае суправаджаць у дзелавых паездках і ў бюракратычных клопатах. Калі ў панядзелак паспрабуеце дабіцца чагосьці ад калегаў, будзьце больш акуратнымі і не пераходзьце разумных межаў. У чацвер можаце разлічваць на дапамогу надзейных партнёраў.

ЛЕЎ. Узрасце нагрузка інтэлектуальнага характару, акрамя таго, ад вас запатрабуецца больш адказнасці. Панядзелак можа расчароваць у дзелавой сферы, але сяброўскія сустрэчы прынясуць маральную падтрымку. У сярэдзіне тыдня верагодна паляпшэнне адносінаў са сваякамі. Чацвер можа прынесці творчае натхненне і незвычайныя новыя ідэі. У гэты дзень спрыяльная дзейнасць, накіраваная на пашырэнне межаў, — ва ўсіх сэнсах гэтага выразу.

ДЗЕВА. З'явіцца магчымасць арганізаваць любое мерапрыемства, скласці выгадную дамову. Спрыяльнымі стануць грамадскія кантакты ў другой палове тыдня. Пачынаючы з чацвярга ў вас будуць усе падставы для задаволенасці ходам падзей. У рэалізацыю вызначаных планаў можна, не асцерагаючыся, прыцягнуць сваякоў і добрых знаёмых. Не выключаныя пэўныя праблемы ў юрыдычнай сферы.

ШАЛІ. Неабходна стратэгічна правільна пабудаваць свае адносіны з партнёрамі па працы — тады шматлікія праблемы вырашацца самі сабой. Успрымайце без крыўдзі крытычныя заўвагі ў свой адрас, уважліва прыслухайцеся да іх: у іх цалкам рэальна знайсці канструктыўныя думкі, а яны вам могуць спатрэбіцца.

СКАРПІЁН. Паспрабуйце ўціхамірыць ганарыстасць і не адмаўляйцеся ад прапанаванай дапамогі, бо шанцы справіцца з пастаўленымі задачамі ў адзіночку роўныя нулю. У панядзелак галоўныя навіны могуць чакаць дома. У аўторак паспрабуйце вызваліць для сябе больш часу і звесці да разумнага мінімуму стасункі з калегамі, сябрамі і асабліва са сваякамі. У сярэдзіне тыдня не выключаныя канфлікты з суседзямі або знаёмымі з-за падману, які раскрыецца цалкам выпадкова.

СТРАЛЕЦ. Адбудуцца прыкметныя змены ў адносінах з дзелавымі партнёрамі. Гэта сур'ёзнае выпрабаванне на трываласць, бо ад вас запатрабуецца здольнасць да супрацоўніцтва і юрыдычная граматнасць. Дробнае паскудства з боку аднаго з калегаў можа вас засмуціць, але пры гэтым паслужыць добрым урокам. У чацвер будзьце асцярожнымі з прывабнай прапановай новай працы. У пятніцу не варта нічога планаваць, бо ўсё можа змяніцца ў адно імгненне.

КАЗЯРОГ. Можаце падрыхтаваць сабе выдатную базу для будучых поспехаў — трэба толькі добра працаваць, тады зусім хутка ўсе старанні акупяцца спаўна. У панядзелак у распарадак дня могуць раптам уварвацца клопаты аб выкананні абяцанняў, якія вы далі калісьці навакольным. У аўторак імкніцеся нічога не адкладаць на потым. У сераду нагадае аб сваім існаванні чалавек, з якім вы доўгі час не мелі стасункаў.

ВАДАЛЕЙ. Тыдзень можа быць поўным нечаканасцяў, якія не заўсёды радуюць. Неабходна праявіць зайздроснае цярпенне, інакш дзелавыя партнёры могуць скарыстацца вашай эмацыянальнасцю і справакаваць выгадную для іх канфліктную сітуацыю. У той жа час могуць аднаўляцца важныя згубленыя кантакты і сувязі. Выпадковыя сустрэчы адкрыюць для вас новыя далягляды.

РЫБЫ. Ад таго, як сплануеце тыдзень, залежыць заўтрашні дзень. У панядзелак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. Неабходна разумна падысці да рашэння праблем у аўторак. Паспрабуйце прыцішыць эмоцыі — цяпер яны будуць толькі перашкаджаць. Накіруйце сваю энергію на вырашэнне самай актуальнай цяпер справы. Серада можа стаць незвычайна прыемным днём: магчыма, адбудзецца нейкая падзея, якой вы доўга чакалі.



МІЛАЯ СЦЕЖКА

Мілая тая сцежка, якой ідзём да мамы.

А на дварэ — Міхайла, дзень усіх анёлаў. Мамін дзень нараджэння. Шчаслівая маміна доля! Вырасла дзяўчынка Ніна і аднойчы сустрэла свайго Міхайлу. Герой-ваяка, з залатымі валасамі. Сышліся ў палескай вёсцы, маладыя настаўнікі. Зусім як у дзядзькі Коласа. На танцы па вечарах Міхайла хадзіў са стрэльбаю. Ніну ахоўваў. Не ад хлопцаў, а ад бандытаў — шмат іх блукала пасля вайны па цьмяных кутках Палесся.

З той стрэльбы пачалося маё дзяцінства. Калыска і стрэльба. І песні матулі.

«Ой, зацвіла сіня ягада ў бару. Ой, заблукала красна дзевачка ў лясу». З Міхайлы зіма марозы куе, зямля мерзне. Суровы час, а на сэрцы цёпла. Птушкі адляцелі, лісце асыпалася, а матчына сэрца — нікуды ад дзяцей не ляціць. Птушачка дзівосная — заўжды побач. Дзюбкай у шыбку — дзінь-дзінь! Матуля-птушачка!

Мама маленькая, хуткая, жвавая, вясёлая. Хай мама смяецца, бо калі плача маці — рэкі цякуць. Без матулі і сонца не грэе, а з матухнай — і ў цёмны лістападаўскі кароткі дзень — сапраўднае свята. Маміна крыло і ў мароз цёплае. Маміны рукі заўсёды мяккія. Твае гады — тваё багацце. І багацце ўсіх нас. 80 гадоў! Дзякуй табе, Ніна Аляксандраўна, са святам Міхайлы цябе, хай добрыя анёлы дапамагаюць табе, бацьку і ўсім настаўнікам зямлі беларускай. Шчаслівы той народ, дзе жывуць мудрыя маці. О, Беларусь, краіна мілых сцежак, якімі ідзем да нашых матуль.

Валодаем калыскай.
А птушачкай душы
Валодае вятрыска
нябеснае шашы,
Айчына-Гаспадыня
смалістага крыжа,
І той бялюткай трызны,
дзе адпачне душа.
Ды светлая матуля са мной,
як з сэрцам Бог,
Матуля-Гаспадыня і зорак,
і дарог.

Міхась ШЭЛЕХАЎ.

«Еўрабачанне-2009»

«ЧАРОЎНЫ ТРУСІК» спяе ў гіпсе?

А мы скрыжуем пальцы на ўдачу

Фота БЕЛТА.

Сёння ў Кіеве адбудзецца фінал дзіцячага «Еўрабачання-2009». Беларусы будуць глядзець яго са змяшанымі пачуццямі — з аднаго боку, атрымліваючы асалоду ад яскравага шоу, з іншага — перажываючы за нашага ўдзельніка. Якраз у свой 13-ы дзень нараджэння пасля чарговага прагону конкурснага нумара Юра Дземідовіч з-за няроўнасцяў пакрыцця зваліўся са сцэны і зламаў палец на руцэ. Дарэчы, гэта ўжо другая ахвяра ўкраінскай сцэны — некалькі дзён таму аператар з Мальты, звалiўшыся з яе, атрымаў адразу некалькі сур'ёзных пераломаў...

— З Юрам усё нармальна, проста выцяў палец, — супакоіў нас кіраўнік беларускай дэлегацыі Аляксандр Мартыненка. — Вы што, ніколі палец не ламалі?

— Ведаеце, Бог мілаваў...

— А я займаўся актыўна спортам, таму добра ведаю, што гэта такое. Нічога страшнага, больш палохаешся, чым баліць. Так што не хвалюйцеся, настрой ва ўсіх нашых хлопцаў захаваўся баявы. Дзень нараджэння Юру гэты інцыдэнт таксама не сапсаваў — дзеці павіншавалі і выказалі яшчэ большую падтрымку, чым раней, расіяне прыйшлі да нас адзначаць, весяліліся на поўную — мы потым ледзьве ўсіх паклалі спаць...

Сёння беларусам, зрэшты, як і прадстаўнікам яшчэ 12 краін — удзельніц конкурсу, давядзецца класціся спаць яшчэ пазней — імя пераможцы дзіцячага «Еўрабачання-2009» стане вядома толькі на пачатку дванаццатай ночы. Каму дастанецца галоўны прыз конкурсу — статуэтка ў выглядзе «трохгаловага» сланечніка з пазалочанага металу, — застаецца толькі здагадвацца. Але дакладна вядома, што без узнагародаў і падарункаў, у адрозненне ад дарослага конкурсу, не застанецца ніхто з артыстаў. Беларуская дэлегацыя, акрамя таго, павязе дадому падгледжаны і падказаны арганізацыйны вопыт, а таксама мноства ўласных ідэй — нагадаем, незалежна ад вынікаў гэтага года «Еўрабачанне-2010» адбудзецца ў Мінску!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

З-за накладзенай лангеткі на фінале Юра Дземідовіч будзе трымаць мікрафон у левай руцэ. Але, можа, гэта на ўдачу?

Сёння, дарагія мае кулінары, мы з вамі будзем гатаваць з півам. Піва — вельмі супярэчлівы прадукт: вучоныя да гэтага часу спрачаюцца, чаго ў ім больш — карысці або шкоды.

Спачатку пагаворым пра станоўчы бок ужывання гэтага напою. З той пары, як людзі пачалі варыць піва, яны знаходзілі ў ім усё новыя і новыя лекавыя ўласцівасці. Пачынаючы са старажытных шумераў, урачы прапісвалі паласканне рота і ўжыванне ўнутр цёплага піва для лячэння зубнога болю. У XVI стагоддзі знакаміты Парацэльс лячыў хваробы печані папаратнікавым півам, а захворванні дыхальных шляхоў — півам з шалфею. У якасці масак і нацiранняў піва выкарыстоўвалася яшчэ ў сярэднявечнай касметалогіі для амаладжэння скуры. Даказана, што піва выводзіць з арганізма канцэрагенныя рэчывы і зніжае рызыку захворвання на рак. Існуюць народныя рэцэпты для лячэння прастудных захворванняў. Напрыклад, лыжка мёду на кубак падагрэтага піва — і прастуду як рукой зніме.

Цяпер пра шкоду піва. Валодаючы магутным мачагонным эфектам, піва бязлітасна вымывае з арганізма «будматэрыялы» — бялкі, а таксама тлушчы, вугляводы і мікраэлементы, асабліва калій, магній і вітамін С. Пры дэфіцыце калію адбываюцца зрывы сардэчнага рытму, узнікае сухасць скуры, болі ў лытках, слабасць у нагах. Дэфіцыт магнію небяспечны тым, што мяняецца фон настрою, чалавек становіцца раздражняльным, плаксівым, дрэнна спіць. З вымываннем вітаміну С знiжаецца імунітэт, развіваецца гіпаксія мозга, пакутуе інтэлект, часцей узнікаюць прастудныя захворванні. Дарэчы, піўны алкагалізм фарміруецца значна хутчэй за гарэлачны.

Выснова напрошваецца сама сабой — усё трэба рабіць у меру. Таму мы з вамі піць піва не будзем, а выкарыстаем гэты прадукт выключна ў выглядзе інгрэдыенту ў кулінарных рэцэптах.

ГРЫБЫ Ў ПІВЕ

Нам спатрэбіцца: 1 яйка, піва, алей, дзёрты сыр, мука, шампіньёны.

Прыгатуйце сумесь з яйка, піва, алею, дзёртага сыру і мукі. Колькасць прадуктаў рэгулюйце на сваё меркаванне — павінна атрымацца не вельмі густое, як на аладкі, цеста. Абмакніце ў яго шапачкі шампіньёнаў і абсмажце ў алеі.

БУЛЬБА Ў ПІВЕ

Вазьміце: 1 кг бульбы, 1 шклянку піва, 1 шклянку халоднай гатаванай вады, 50 г поснай карэйкі, 20 г мукі, 1 ч. лыжку солі, молаты чорны і чырвоны перац — на смак, кмен, карыцу таксама на смак.

Абабраную сырую бульбу нарэзаць кубікамі памерам 1 см. Змяшаць роўныя часткі піва і вады, пасаліць, давесці да кіпення і ў гэтай вадкасці каля 10 хвілін варыць бульбу. Затым адкінуць бульбу на друшляк. Адвар зліць у міску. Карэйку нарэзаць дробнымі кавалачкамі і прыпусціць. Дадаць памешваючы, спасераваць, затым паступова ўліваць, памешваючы, бульбяны адвар, пакуль не ўтворыцца аднародны вязкі, але не вельмі густы соус. Прыправіць соус соллю, перцам, кменам і карыцай. Бульбу пакласці ў каструлю з соусам і даць пастаяць 5 хвілін. Падаць да халоднага варанага мяса.

КУРЫЦА Ў ПІВЕ

Нам спатрэбіцца: курыца, 1 шклянка піва, 1 ст. лыжка таматнай пасты, соль, перац — на смак.

Курыцу разабраць на дробныя часткі, паперчыць і пасаліць на смак. Развесці поўную лыжку таматнай пасты ў шклянцы піва, заліць гэтым растворам курыцу, перамяшаць, выкласці ў адпаведную ёмістасць і закрыць фальгай. Паставіць у максімальна гарачую духоўку і тушыць хвілін 30.

СВІНІНА З ЦЁМНЫМ ПІВАМ

Вазьміце: 1,5 кг нятлустай свініны, часнок, перац, соль — на смак, 2 л цёмнага піва, крыху імбіру.

Мяса вымыць, нацерці соллю і перцам. Нажом зрабіць глыбокія надрэзы і ўкласці ў іх парэзаныя папалам долькі часнаку. 1,5 л піва выліць у каструлю, пакласці туды мяса і націснуць накрыўкай. Пакінуць марынавацца прыкладна на 1—2 гадзіны. Затым дастаць мяса і перакласці яго ў глыбокую патэльню, куды ўліць на 1—2 см піва. Усё гэта ставім у вельмі гарачую духоўку на 15 хвілін. Потым агонь змяншаем да сярэдняга і трымаем яшчэ гадзіны 1,5 (гатоўнасць мяса вызначаем звычайным спосабам). Дастаткова часта мяса трэба паліваць астатнім півам, а калі мяса будзе практычна гатовае, апошні «паліў» будзе такі: 1 жаўток узбіць разам з астатнім півам і імбірам (рэкамендую дадаць крыху гранатавага соку), заліць страву гэтай сумессю і ўключыць моцны агонь на 2—3 хвіліны.

САСІСКІ Ў ПІВЕ

Нам спатрэбіцца: 300 г сасісак, 1 шклянка піва, 200 г кіслай капусты.

Выкласці ў посуд сасіскі і заліць іх півам. У закрытай пасудзіне давесці да кіпення на моцным агні. Затым агонь зменшыць да сярэдняга і гатаваць яшчэ каля 5—7 хвілін, пакуль сасіскі добра не праварацца. Пасля гэтага дадаць адціснутую кіслую капусту, накрыць накрыўкай і даць пастаяць каля 5 хвілін. Гарачыя сасіскі з капустай добра падаваць разам з гарачымі булачкамі.

КАРП У ПІВЕ

Нам спатрэбіцца: 1 карп (каля 1 кг), 50 г сметанковага масла, 2 цыбуліны, 1—2 карані пятрушкі, 2 морквіны, 1 ч. лыжка мёду, соль, спецыі — на смак, 1—2 шклянкі светлага піва.

Падрыхтаванага карпа нарэзаць сярэднімі кавалкамі, выдаліўшы з яго як мага больш касцей. У неглыбокую каструлю, дно і сценкі якой змазаныя маслам, выкласці кавалкі рыбы, адвольна нарэзаную агародніну, дадаць спецыі і разведзены ў вадзе мёд. Усё гэта заліць півам. Давесці сумесь да кіпення і варыць 6—8 хвілін. Затым, зменшыўшы агонь, варыць да гатоўнасці рыбы. Гатовую рыбу выкласці на вялікую талерку, гарніраваць варанай агароднінай, упрыгожыць зяленівам.

Ядомы анекдот:

Старой жанчыне ўпершыню ў жыцці прапанавалі пакаштаваць піва.

Адпіўшы глыток, яна здзівілася:

— Дзіўна! На смак яно так нагадвае лякарства, якое мой муж прымаў апошнія дваццаць гадоў!

☺

Наведвальнік бара кліча афіцыянта:

— Скажыце, — пытаецца ён, — што вы раней налілі ў кубак: піва або пену?

— Зразумела, піва!

— Выдатна, тады я не страчваю надзеі да яго дабрацца.

Любага сына **Уладзіміра Уладзіміравіча СІТНІКА** з г. Мінска ад усяго сэрца віншуем **з днём нараджэння**.

Жадаем у шчасці ісці па жыцці
І сына-сынульку яшчэ знайсці.

Бацькі, в. Палажэвічы.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Аляксей ХЛЯСТОЎ:

«АД РЫБЫ МОЖНА ПАДРАСЦІ!»

Упершыню ўсе прыхільнікі рыбы і піва, а таксама майстры ў мастацтве і навуцы прыгатавання рыбных страў змаглі паўдзельнічаць у Фестывалі рыбы, які праходзіў у сталічным клубе «Белатра». Гэта свята — адно з самых вясёлых у свеце, і стартавала яно ў Балгарыі, ініцыятыву перахапілі Іспанія, Паўднёвая Карэя і Беларусь. На працягу тыдня гасцям фестывалю прапаноўвалі дэгустацыі разнастайных страў, правялі Свята піва і нават выбралі «Рыбны Оскар-2009». Салата «Філадэльфія», «Рыба па-царску», «Сёмга-грыль пад соусам» — гэтыя і іншыя стравы ацэньвалі гледачы і журы. Спявак Аляксей Хлястоў, які ўваходзіў у склад судзейскай калегіі, пажартаваў: «Недзе чуў, што ад рыбы можна падрасці. Магчыма, мне і пашчасціць?».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.48	16.02	8.14
Віцебск —	7.43	15.46	8.03
Магілёў —	7.38	15.52	8.14
Гомель —	7.28	15.56	8.28
Гродна —	8.02	16.19	8.17
Брэст —	7.56	16.26	8.30

Месяц

Першая квадра 24 лістапада. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Гаўрылы, Міхаіла, Рафаіла.*

К. *Марыі, Рэгіны, Альберта, Кандрата.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.





Дзве даты

21 лістапада

1969 год — у маёнтку Крупляны пад Карэлічамі нарадзіўся Казімір Стаброўскі, беларускі жывапісец, педагог. Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Пасля жыў і працаваў на Гродзеншчыне. Удзельнічаў у мастацкіх выставах у Пецярбургу, Парыжы, Мюнхене, Венецыі. Заснавальнік і кіраўнік Школы прыгожых мастацтваў у Варшаве. Стварыў кампазіцыі фантастычна-сімвалічнага характару, пейзажы, партрэты ў стылі мадэрн. Сярод работ: «Цішыня ў вёсцы», «Магамет у пустыні», «Белыя ночы» і іншыя.

1783 год — у Парыжы зроблены першы палёт чалавека на паветраным шары. Першымі людзьмі, якія ўзняліся ў паветра, былі малады дырэктар Парыжскага музея навукі Пілатр дэ Разье і армейскі афіцэр маркіз д'Арланд, які меў шырокія сувязі пры двары Людовіка XVI. На напоўненым гарачым паветрам шары, пабудаваным братамі Жазэфам і Эцьенам Мангальф'е, яны правялі ў паветры каля 25 мінут, праляцеўшы за гэты час амаль 10 кіламетраў, і ўдачна прызямліліся ў адкрытай мясцовасці.

Цытата дня

«Усмешка заўсёды добрая, бо яна прыадчыняе просты ўнутраны свет чалавека».

Мікалай Новікаў (1744—1818), рускі пісьменнік.

РАДЗІНА

Самымі старажытнымі і разам з тым самымі жыццяздольнымі адносінамі аказаліся адносіны паміж мужчынам і жанчынай, якія з цягам часу разрасліся ў магутнае дрэва Сям'і — Роду — Суполкі — Племені — На-роду.

● Сям'я аб'ядноўвае ў сабе прадстаўнікоў двух Родаў — па матчынай і бацькавай лініі. Паспрабуем выбудаваць сістэму ўзаемаадносінаў у сям'і і паміж двума родамі.

● **Зяць** — муж дачкі. У народзе пра гэта «набытае» сваяку гаварылі так: «Адно дзіця народжанае (дачка), а другое накананае (зяць)»; «Адно дзіця раджона, а другое суджона»; Калі зяць прыходзіў жыць у хату да цешчы, то ў вёсцы яго называлі прымаком: «Прымачы хлеб — сабачы»; «Хто ў прымах не бывае, той і гора не знае»; «Прымак пятнаццаць гадоў цешчынага ката на «вы» называе»; «Прымак адным вядром восем гадоў ваду носіць».

● **Нявестка (ятроўка)** — жонка сына. Неадназначнае стаўленне было і да нявесткі ў чужой сям'і: «Сяннік не падушка, нявестка не дачушка»; «Кукушка — не птушка, нявестка — не дачушка».

● **Свёкар** — бацька мужа. **Свякроў** («свекруха», «свякрова») — маці мужа. *«У хвацкім свёкру праўды няма». «У маго татка даўно спяць, а ў свякратка сядзяць». «Як добра свякроў, то добра і нявестка», «Блудлівая свякроў і нявестцы не верыць».*

● **Дзевер** — брат мужа.

● **Залвіца** (залоўка) — сястра мужа. У народзе шырока існуе паданне, што нявестка лягчэй наладжвае адносіны з мужчынскай паловай сваякоў мужа, і горш складаюцца адносіны з жаночай паловай, асабліва з яго сёстрамі. Народная прыказка безапеляцыйна канстатуе: «Лепей дзевяроў чатыры, чым заловачка адна», «Залоўка злая, як свякроўка ліхая»; «Залоўка — змяіная галоўка».

● **Цесць** — бацька жонкі. **Цешча** — маці жонкі. *«Цесць любіць чэсць, а зяць любіць узяць»; «Зяць любіць жонку здаровую, а цешчу багатую»; «Жонка люба для савету, а цешча — для заезду», «Быў у цешчы, рады ўцекшы».*

● **Швагер** — а) брат жонкі; б) муж сястры в) муж сястры жонкі. **Швагерка** (сваячніца) — сястра жонкі.

● **Браціха** (братовая) — жонка брата.

● **Цётка** — сястра маці (бацькі). **Дзядзька** — брат маці (бацькі).

● **Сваты** — бацькі мужа і жонкі ў дачыненні адно да аднаго. У традыцыйнай народнай культуры існавала нямала пажаданняў, якіх неабходна было прытрымлівацца ў адносінах паміж сватамі. Так, каб новыя сваякі не пасварыліся паміж сабою і не сапсавалі добрасуседскія адносіны, існаваў звычай, які загадваў сватам па чарзе наведваць адно аднаго ў вялікія гадавыя святы — такія, як Масленіца, Вялікдзень і інш.

● **Хросныя бацькі** — з прыняццем хрысціянства і ўводзінамі абавязковага хрышчэння немаўляці з'явілася яшчэ адно кола роднасных узаемаадносінаў: **хросны бацька** — малады чалавек або мужчына, які пахрысціў дзіця; хросная маці — маладзіца або замужняя жанчына, якая разам з хросным бацькам хрысціла нованароджанага; **хрэснік** (хрэсніца), хросны сын (дачка) — хлопчык або дзяўчынка, якіх хрысціла гэтая пара хросных бацькоў. **Кум і кума** — хросныя бацька і маці ў дачыненні да родных бацькі і маці хрэсніка ў народных традыцыях: «Кумачка-кума, схрэсці маё дзіцё, ды і не ведай майго двара»; «Добрая кума дадасць розуму»; «Кума ды кум наставяць на розум». «Кум да кумы з мылам, а кума да кума з пернікам».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 6404. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Ляскавічы пасля восеньскага дажджу.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАРК «ПРЫПЯЦКІ»: РАЙ У РУКАХ ГАСПАДАРОЎ

Аднойчы мая знаёмая вырашылася на эксперымент — адпачыць не ў абрыдлай сярэдняму класу Турцыі ці перанасычаным Крыме, а ў межах Беларусі, на роднай Гомельшчыне. З Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» прывезла рыбалоўны вопыт, «беларускі загар», стос фотаздымкаў і мех уражанняў, і ўсё экзальтавана захаплялася: «Гэта проста рай! Супер, часцей трэба туды прыязджаць!». Падпішуся пад кожным словам. Але ў турыстычным захапленні маляўнічымі краявідамі мы часта забываемся, што пры бясконцым спажыванні ўсякае райскае месца пры належным імпэце можна хуценька ператварыць у пустэчу... Калі толькі браць ад шчодрасці зямлі, нічога не аддаючы ўзамен. Вось чаму ў кожным сапраўдным раі ёсць свае творцы. Або, калі хочаце, захавальнікі, якія ўмеюць руплівa і адказна весці гаспадарку, улічваючы яе эканоміку і экалогію, фактар чалавечы (куды ж без яго) і прыродны, клапоцячыся і пра сучаснікаў, і пра нашчадкаў.

Таму наша чарговая экскурсія па Дзяржаўнай прыродаахоўнай установе «Нацыянальны парк «Прыпяцкі», якая адзначыла сёлета 40-годдзе, пачнецца з маршрутаў не турыстычных, а... сельскагаспадарчых.

— Усім вядома, якую ўвагу кіраўнік дзяржавы надае Палессю, — адзначае генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» Сцяпан Мікалаевіч Бамбіза. — Ужо ў стадыі абмеркавання знаходзіцца комплексная Праграма развіцця Палескага рэгіёна, і Нацыянальны парк — адно з асноўных звёнаў гэтай праграмы, якая прадугледжвае падтрымку не толькі прыродаахоўнай дзейнасці і разнастайных турыстычных кірункаў, але таксама пашырэнне сельскагаспадарчай вытворчасці з мэтай павышэння эканамічных паказчыкаў, стварэння новых працоўных месцаў і ўвогуле паляпшэння ўзроўню жыцця вяскоўцаў.

«І на Марсе будуць яблыні цвісці»

Наконт Марса, нягледзячы на аптымістычныя радкі з папулярнай у мінулым песні, усё яшчэ туманна і невядома, а вось у вёсцы Ляскавічы — адміністрацыйным цэнтры Нацпарку — яблыневы цвет чакаецца неўзабаве. Напрыканцы кастрычніка тут быў закладзены вялізны сад у 30 гектараў. Саджанцы адбіралі з дапамогай спрактыкаванага фермера Бандарчука з Калінкавіцкага раёна — з улікам, каб дрэвы найлепей прыжыліся менавіта ў мясцовых кліматычных умовах.

Але адной з асноўных спецыялізацый тутэйшага сельскагаспадарчага комплексу застаецца вырошчванне збожжавых і зернебабовых культур для забеспячэння галіны жывёлагадоўлі паўнавартаснымі кармамі. «На дзяржаўным узроўні нам пастаўлена задача мець 10 тысяч тон зерня — улічваючы збожжавыя, рапс, кукурузу», — расказвае намеснік генеральнага дырэктара Вольга Рыгораўна Прыходзька. Для параўнання: летась у гаспадарцы намалацілі 1253 тоны кукурузы, сёлета ўжо — больш як 3100 тон, нягледзячы на тое, што частку палёў у нізінах з-за дрэннага надвор'я ўбраць не ўдалося, тэхніка не магла прайсці. Убрана таксама больш як 4264 тон збожжа, 827 тон рапсу, нарыхтавана больш як 7,5 тысячы тон сенажу, 3 тысячы тон сена. На ўмоўную галаву жывёлы прыпадае 44 цэнтнеры кармавых адзінак, а ўвогуле на складах — амаль 2-гадавы запас кармоў, і самім хопіць, і на продаж пры неабходнасці застанецца.

Генеральны дырэктар Сцяпан БАМБІЗА.

Намеснік генеральнага дырэктара Вольга ПРЫХОДЗЬКА.

Увогуле, сельскагаспадарчы комплекс «Ляскавічы», які дзейнічае ў складзе аднайменнай эксперыментальнай лесапаляўнічай гаспадаркі, даволі малады — ён створаны ў 2005 годзе шляхам аб'яднання некалькіх саўгасаў і калгасаў, атрыманых «у спадчыну» Нацыянальным паркам. Але ніякіх зніжак на ўзрост СВК не патрабуе — выпрабаваная эксперыментальная мадэль комплекснага вядзення аховы прыроды, лясной, паляўнічай і сельскай гаспадаркі цалкам сябе апраўдала, даўшы зразумець, што ўсякую праблему пры жаданні можна пераадолець сваімі сіламі.

«Не трэба доўга перабіраць праекты, чакаючы аднекуль зверху падказкі і ўхвалення. Паглядзіце, як у нас зроблена: узялі пасляваенны будынак, яго адрамантавалі — і дасягаем там самых высокіх паказчыкаў», — раскрывае «ваенны сакрэт» генеральны дырэктар. У Брынёве — адным з трох падраздзяленняў СВК «Ляскавічы» — такім чынам аднавілі кароўнік. І што б вы думалі — нізавошта не ўгадаеш у цяперашнім дагледжаным будане колішнюю хібару, якая на ладан дыхала. Нездарма ж кажуць, усё геніяльнае — проста! Трэба толькі захацець і зрабіць.

Тады атрымаецца і надояў дасягнуць, як у мясцовай гаспадарцы — да 5,5 тысячы тон, і пачаць вырошчваць кароў пароды «шэўрале» з далікатэсным «мармуровым» мясам. А яшчэ — пашырыць цэх па перапрацоўцы малака. Пакуль што цэх выпускае толькі ўласна пастэрызаванае малако рознай тлустасці — 2,5—3 тоны ў суткі (прычым разыходзіцца гэты прадукт па ўсёй Гомельскай вобласці, а ў перспектыве дабярэцца і да Мінска). Але таксама мясцовыя спецыялісты — апаратчыкі, тэхнолагі, мікрабіёлаг — рыхтуюцца пакрысе да мадэрнізацыі цэху і пашырэння вытворчасці — вытворчасці кефірнага напітку і смятаны, прадумваюць рэцэптуру і ўпакоўку, упрыгожаную фірменным лагатыпам, наладжваюць абсталяванне. «Пакуль працуем у адну змену, калі засвоім новыя віды прадукцыі — гатовыя тым жа складам работнікаў выходзіць у дзве. Ды хоць заўтра гатовыя!» — усміхаецца начальнік малочнага цэха Наталля Іванаўна Атаман. І частуе нас на развітанне ўласнай прадукцыяй — па сакрэце скажам, надзіва смачная, як тое «не пакупное», вясковае малако, памятнае ці не кожнаму з нас з дзяцінства...

Акрамя пашырэння малочнага цэха, таксама ў планах СВК «Ляскавічы» — будаўніцтва да 2011 года пры падтрымцы Гомельскага аблвыканкама новай, цалкам робатазаваной, малочнатварнай фермы на 400 галоў, узвядзенне ў 2010 годзе міні-завода па мясаперапрацоўцы (прычым на ўвазе маецца «дзікая» свежына — мяса вепрукоў, аленяў, ласёў, казуль, атрыманае ў паляўнічай гаспадарцы), — усе гэтыя пункты, дарэчы, уключаныя і ў праграму адраджэння Палескага рэгіёна, якая цяпер прымаецца.

Ферма ў Брынёве. Нетыповыя збудаванні адноўлены з мінімальнымі затратамі.

Мармуровыя цялушкі.

«Звяздоўкам» нават з мадэльным ростам не дацягнуцца да верхавін палескай кукурузы.

Пра «царыцу палёў» і яе прыдворных

Галоўны аграном Павел Паўлавіч Еўлаш з гонарам паказваў нам палеткі кукурузы — высокай, у два чалавечыя росты. Уборка яе на момант нашага візіту ўжо завяршалася, і «прасекаў» у кукурузных «джунглях» было куды больш, чым зараснікаў. Але сабраць ураджай — гэта толькі палова справы, трэба яго яшчэ захаваць. І тут гаспадарцы ёсць чым пахваліцца — новая тэхналогія плюшчэння зерня дазваляе абмінуць працэс сушкі і істотна эканоміць плошчы для захоўвання. «Кукуруза — гэта культура, якую даволі складана высушыць, тым больш, што ўбіраецца яна позняй восенню, пры павышанай вільготнасці паветра і нізкіх тэмпературах. Каб не зніжаць тэмпы ўборкі кукурузы, мы вырашылі выкарыстоўваць тэхналогію плюшчэння зярнят, — тлумачыць аграном. — Нарвежская плюшчылка, хоць і абышлася ў свой час у 170 мільёнаў, дала істотныя перавагі. Напрыклад, у дзень мы ўбіраем у сярэднім 200 тон кукурузы. Высушыць можам усяго 60 тон, а сплюшчыць за гэты ж час — практычна 150 тон зерня. Такім чынам эканомім на паліве — дровах і электраэнергіі, і на працоўных рэсурсах у 4—5 разоў! Да таго ж далей гэта зерне не трэба перапрацоўваць — у яго ўжо дабаўлены кансервант на аснове мурашынай і пратэінавай кіслот, і яно гатовае для ўжывання ў якасці корму для жывёлы». Дарэчы, захоўваецца плюшчаная кукуруза не ў свірнах, а пад адкрытым небам у спецыяльных баулах, што дазваляе эканоміць яшчэ і складскія плошчы — трэба толькі замаскіраваць гэтыя веліканскія белыя «кукурузныя палачкі» ад птушыных нападаў з дапамогай сасновых галінак.

Што яшчэ немалаважна — сёння ў гаспадарцы зернесушылка ЗСК-15Т працуе на экалагічным паліве — дровах (хоць пры неабходнасці можна перавесці і на газ), прычым на мясцовай сыравіне, што абыходзіцца ў 3,5 раза танней, чым усякі іншы варыянт. За два сезоны новая тэхналогія сябе цалкам апраўдала, прадукцыйнасць перапрацоўкі зерня істотна вырасла, таму налета плануецца запусціць дадатковы зернесушыльны комплекс ЗСК-40, каб нарыхтоўваць больш кукурузы на продаж. «Перспектыва нашага паўднёвага боку — у кукурузе, — разважае Павел Еўлаш, — бо калі мы пасеем збожжа, то дасць ураджай 30—35 цэнтнераў з гектара, і тое пры ўмове дадатковых выдаткаў на апрацоўку, а кукуруза, пры аднолькавай бальнасці зямлі — 70 цэнтнераў, з меншымі выдаткамі пры вырошчванні, прычым засяваць ёй поле можна некалькі гадоў запар».

Але ёсць у «царыцы палёў» і канкурэнт па перспектыўнасці вырошчвання — рапс, якім у Ляскавічах шчыльна займаюцца ўжо трэці год. Па-першае, гэта культура выдатна ўключаецца ў севазварот і добра «чысціць» глебу ад пустазелля. Па-другое, рапсавы алей — прадукт унікальны, які можна, у залежнасці ад якасці сыравіны, выкарыстоўваць у самых розных сферах — з аднаго боку, як раўназначную замену традыцыйнаму сланечнікаваму і аліўкаваму алею, з іншага — як экалагічнае біяпаліва, больш таннае, але не менш якаснае, чым прадукты нафтаперапрацоўкі; дый рапсавая салома з поспехам ідзе на корм скаціне... У СВК «Ляскавічы» плануюць ужо напрыканцы бягучага — на пачатку наступнага года ўвесці ў эксплуатацыю цэх па перапрацоўцы рапсу і пачаць самім выціскаць алей. «Цяпер нават у Еўропе ў сувязі з энергетычным крызісам створана спецыяльная праграма па рапсе, — расказваюць спецыялісты. — Гаспадаркам выгадна займацца рапсам, бо ў яго і ўраджайнасць вышэйшая, чым у зерня, нават на дрэннай глебе, і прадаць яго можна з большым прыбыткам — як беларускім прадпрыемствам, так і на імпарт».

Аператар зернесушыльнага комплексу Веніямін ТАМАШЭЎСКІ.

Цэх па перапрацоўцы малака: начальнік Наталля АТАМАН і аператар Алена ЖУРЫНА.

Чалавечы фактар

— Планы ў гаспадаркі грандыёзныя, але адкрыццё новых цэхаў і пашырэнне існуючых запатрабуе вялікай колькасці спецыялістаў. Адкуль возьмеце кадры? — цікавімся мы ў намесніка генеральнага дырэктара Вольгі Рыгораўны Прыходзькі.

— Насамрэч патрэбна не так многа людзей, як вам здаецца. Міні-заводзік па перапрацоўцы мяса, напрыклад, запатрабуе 3-4 чалавекі ад сілы — яны будуць перапрацоўваць дзічыну і адразу яе рэалізоўваць. Наконт іншых цэхаў — будзем шукаць па меры неабходнасці. Штат нядаўна адкрытай гасцініцы «Над Прыпяццю» — 44 чалавекі, улічваючы пакаёвак, адміністратараў, афіцыянтаў і г.д. — ужо набраны.

У сувязі са з'яўленнем новых працоўных месцаў трэба павялічваць і колькасць жылля ў вёсцы, так што тэмпы будаўніцтва тут не зніжаюцца, і Ляскавічы імкліва разрастаюцца — толькі сёлета будуюцца 25 новых жылых дамоў, большая частка якіх выдзяляецца маладым спецыялістам. Але што жыллё, нават самае сучаснае і камфортнае, без адпаведнай інфраструктуры? У «Прыпяцкім» гэта добра ведаюць, таму трымаюць на кантролі ўвесь комплекс — дзіцячы садок, школа, стадыён, Дом культуры, банк, крамы, пошта... Налета да гэтага пераліку дабавіцца таксама Музей прыроды — аб'ект адначасова асветніцкі і турыстычны. Таму, думаецца, 830 чалавек — цяперашняя колькасць жыхароў Ляскавічаў — гэта лічба таксама вырасце, мо і ў разы. Ужо цяпер жыхары намякаюць кіраўніцтву — маўляў, дзіцячы садок малаваты, трэба новыя групы адкрываць, ці нават новы будаваць. «Гэта вельмі радуе, бо гэта адна з прыкмет адраджэння вёскі», — заўважае генеральны дырэктар «Прыпяцкага». Як радуе і той факт, што мясцовая моладзь, атрымаўшы адукацыю ў іншых гарадах, вяртаецца працаваць зноў сюды. Глядзіш, і ўдасца, з дапамогай маладога пакалення і касцяка спрактыкаваных, надзейных працаўнікоў, стварыць праз нейкі час у Ляскавічах «маленькую Швейцарыю»? Каб толькі сфарміраваць і ўтрымаць гэты касцяк, непадуладны вечнай сельскай бядзе — п'янству, і гатовы працаваць нават ва ўмовах крызісу...

Экскурсію можна пачынаць ужо з адміністрацыйнага будынка.

Таіці, Таіці... У нас лепш!

Нягледзячы на існуючыя праблемы, Ляскавічы ўпэўнена растуць і з кожным годам выглядаюць усё больш па-еўрапейску. Асабліва пасля таго, як тут адчынілася новенькая шыкоўная чатырохзоркавая гасцініца «Над Прыпяццю» на 50 месцаў. Летась мы бачылі яшчэ разгар будаўнічых работ, а сёлета — ужо шырока расхінутыя дзверы: калі ласка, госці дарагія, чаго ваша душа (і цела) жадае? Адпачыць у люксавых ды паўлюксавых нумарах? Правесці дзелавую сустрэчу ў прыгожай камінnай зале або разняволіцца за гульнёй у більярд ці боўлінг? Наведаць інтэрнэт-кавярню? Пазаймацца на трэнажорах? Прагрэцца да руловых костак у саўне, а мо паплаваць у вялізным круглым басейне (ён месціцца ў асобным будынку, злучаным з гасцініцай падземным пераходам)? Пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні ў рэстаране? Ці закаціць банкет у асобнай, упрыгожанай акварыумам «рыбнай зале», адкуль можна выйсці проста да ракі?

Тэатральны закон: калі на сцяне вісіць стрэльба, яна павінна стрэліць. Турыстычнае правіла: калі ў назве гатэля ёсць канкрэтны геаграфічны аб'ект, яго трэба задзейнічаць на поўную. У выпадку з новай гасцініцай «Над Прыпяццю» гэта правіла выконваецца на ўсе сто: мала таго, што з вокнаў нумароў адкрываецца цудоўны від на раку і штучны фантан пасярод возера, — пры жаданні госці змогуць трапіць з балю на карабель і назад. У літаральным сэнсе. Бо да гасцініцы прымыкае штучны канал, на якім ахвотных чакае адзін з цеплаходаў — напрыклад, «Кірыл Тураўскі», — гатовы адвезці ў захапляльную экскурсію па «беларускай Амазонцы». Калі хтосьці не рашаецца даверыць сваю асобу пераменлівай вадзе — калі ласка, уздоўж канала пракладзеная дарога, якая вядзе да затону і шырокага насыпнога пляжа з чыстым пяском. У недалёкай будучыні каля гэтага пляжа размесцяцца альтанкі для адпачынку, а таксама пункт пракату лодак, катамаранаў ды водных скутараў.

Вы не толькі турыст, але і рыбак? Грэх будзе не выпрабаваць шчасця ў гэтых мясцінах. Тым больш што ў адным з затонаў мяркуецца стварыць якраз комплекс рыбалавецкі — запусціць туды рыбу, абгарадзіць сеткай, стварыць пад адкрытым небам кавярню з пастаянным «рыбным днём» як для тутэйшага насельніцтва, так і для прыезджых турыстаў, адкрыць пункт пракату касцюмаў і прынадаў, сярод якіх не толькі звыклыя вудачкі, але і, напрыклад, жакі (драўляныя кругі з прымацаванай да іх сеткай). У якасці трафеяў удачліваыя рыбаловы найчасцей выцягваюць судака, ляшча, язя, шчупака, ментуза, сазана, акуня, плотку, жэраха, а ў некаторых месцах — нават белага амура і таўсталобіка.

Паралельна з воднымі маршрутамі пачнуцца ў Нацыянальным парку выпрабавальныя заезды ў сафары-парк — нагадаем, падобная ідэя ў Беларусі здзяйсняецца ўпершыню. Ён возьме пачатак там, дзе месціцца былы піянерскі лагер. Спарахнелыя будынкі плануецца знесці, а на іх месцы, праклаўшы новыя дарогі, узвесці «выходны пункт», дзе турысты змогуць перайсці з аўтобусаў у спецыяльны транспарт для сафары — вагончыкі або аўтобусы з адкрытым верхам і без шкла, а таксама перакусіць і набыць мясныя ласункі — прадукты перапрацоўкі паляўнічай гаспадаркі. «Узброіўшыся» біноклямі і фотаапаратамі, турысты ў суправаджэнні гіда накіруюцца ў захапляльнае падарожжа працягласцю ў некалькі гадзін — знаёміцца бліжэй з жывёльным светам. Бліжэй — у прамым сэнсе: падкормачныя пляцоўкі для зуброю, аленяў, казуляў, ланей і дзікою, саланцы для ласёў абсталяваныя зусім недалёка ад пракладзеных для сафары маршрутаў. Для натуралістычных назіранняў за капытнымі і птушкамі таксама абсталяваныя спецыяльныя вышкі і альтанкі, з якіх фотапаляўнічыя, пры належным цярпенні і шанцаванні, змогуць зрабіць унікальныя здымкі... А потым абменьвацца ўражаннямі і адпачываць у камфартабельных нумарах аднаго з турыстычных комплексаў парку — у цэнтральнай гасцініцы «Над Прыпяццю» ці змешчаным на беразе ляснога возера «Доме паляўнічага і рыбака», у катэджах «Хлупінскай буды» ці карпусах «Дарашэвічаў»...

* * *

Нешта шмат чаго яшчэ ў планах і праектах, заўважыць уедлівы чытач. А я запярэчу — многае з таго, што пранануецца сёння ў Нацыянальным парку «Прыпяцкі» гасцям, таксама яшчэ ўчора было толькі планамі. І планамі магло б застацца, калі б не людзі — энергічныя і адказныя, гатовыя працаваць і дабівацца пастаўленай мэты, вучыцца ў іншых і рабіць сваё — яшчэ лепшым, адкрытыя як да захавання старажытных традыцый — напрыклад, архаічнага спосабу бортніцтва, так і да нечаканых смелых эксперыментаў — кшталту першага беларускага сафары-парку... Гаспадары на зямлі. Стваральнікі. Або, калі хочаце, Творцы, дзякуючы якім мы з вамі, прыязджаючы на Прыпяцкае Палессе, узгадваем пра беларускую Амазонію і ўсклікаем: «Што за райскія мясціны!».

Алена ДАЎЖАНОК, Вікторыя ЦЕЛЯШУК, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.

УНП 400050258.

Навуковы супрацоўнік інстытута пладаводства раіць, як лепш закласці сад.

Новая гасцініца «Над Прыпяццю» чакае першых гасцей.

Галоўны аграном Павел ЕЎЛАШ ганарыцца цудоўнымі пасевамі рапсу.